Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 САКАВІКА 2014 г. СУБОТА № 48 (27658) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## ЗАКОН НАРОДАЎЛАДДЗЯ

**ДАРАГІЯ СУАЙЧЫННІКІ!**
**Сардэчна віншую вас з Днём Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.**

Прыняты два дзесяцігоддзі таму Асноўны Закон замацаваў найважнейшыя прынцыпы пабудовы ў нашай краіне дэмакратычнай дзяржавы, заклаў трывалы прававы фундамент незалежнасці, рэалізаваў імкненне беларускага народа быць паўнапраўным гаспадаром на роднай зямлі.

Адзначаючы 20-гадовы юбілей Канстытуцыі і ацэньваючы маштабныя перамены, якія адбыліся ў жыцці беларусаў за такі кароткі па гістарычных мерках перыяд, мы з гонарам і поўнай упэўненасцю гаворым: «Рэспубліка Беларусь адбылася як суверэнная дзяржава, найвышэйшай каштоўнасцю і безумоўным прыярытэтам якой з'яўляецца чалавек і яго законныя інтарэсы».

Мы дынамічна рухаемся наперад, развіваем эканамічную і сацыяльную сферы, павышаем свой міжнародны аўтарытэт, рэалізуем абвешчаныя ў Асноўным Законе прынцыпы народаўладдзя, вяршэнства права, падзелу ўлады і сацыяльнай справядлівасці.

Упэўнены, што, абапіраючыся на палажэнні Канстытуцыі, мы і ў далейшым зробім усё для ўмацавання міру і згоды ў роднай Беларусі, росту дабрабыту і працвітання беларускага народа.

У гэты ўрачысты дзень прыміце шчырыя пажаданні моцнага здароўя, поспехаў у працы і дабрабыту.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь**
**Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**

## ЧАЛАВЕКУ ВЕЛЬМІ ВАЖНА ДАВЯРАЦЬ СВАЁЙ ДЗЯРЖАВЕ

**Беларусь працягвае рэалізоўваць патэнцыял Канстытуцыі, абапіраючыся на замацаваныя ў ёй асноўныя каштоўнасці, і стаіць на абароне скарбаў народа. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з суддзямі Канстытуцыйнага Суда, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**



Аляксандр Лукашэнка ўручыў Наталлі Карповіч пасведчанне суддзі Канстытуцыйнага Суда, а таксама падарункавы экзэмпляр Канстытуцыі.

Фота БЕЛТА.

«Чалавеку вельмі важна давяраць сваёй дзяржаве. Таму хачу запэўніць вас, беларускі народ, што мы заўсёды падтрымлівалі і будзем падтрымліваць усіх, хто ўносіць дастойны ўклад у справу пабудовы моцнай, стабільнай і квітнеючай Беларусі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Нам не патрэбны ўзрушэнні і рэвалюцыі, і мы не дапусцім у краіне якога-небудзь экстрэмізму. Нашы людзі могуць спакойна жыць, вучыцца і працаваць. Дзяржава і ў далейшым працягне ствараць умовы для свабоднага і дастойнага развіцця асобы, забяспечваць законнасць і правапарадак», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што стабільнасць краіны забяспечваецца ў першую чаргу моцнай уладай і яе вялікай падтрымкай абсалютнай большасцю людзей.

Прэзідэнт звярнуў увагу на тое, што дата сустрэчы з суддзямі выбрана невыпадкова, паколькі сёлета мы адзначаем 20-годдзе Канстытуцыі Беларусі. «Для нашай зусім яшчэ юнай дзяржавы Асноўны Закон стаў зыходным дакументам фарміравання нацыянальнай прававой сістэмы, гарантыяй захавання правоў і законных інтарэсаў грамадзян», — сказаў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, вынікі рэспубліканскага рэферэндуму ў 1996 годзе забяспечылі ўмацаванне сістэмы дзяржаўнай улады, стварэнне эфектыўных грамадскіх і палітычных інструментаў.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што прыняцце Канстытуцыі з наступнымі змяненнямі мела першараднае значэнне для станаўлення Беларусі на шлях суверэннага развіцця. «За гэты перыяд зроблена нямала. Тыя, хто памятае 1990-я, можа аб'ектыўна параўнаць ажыццёўленыя ў краіне перамены і адзначыць развіццё нашай дзяржавы», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што гэты год з'яўляецца юбілейным і для Канстытуцыйнага Суда. 20-гадовы перыяд яго станаўлення і развіцця паказаў, што ён па праве заняў дастойнае месца ў сістэме дзяржаўных органаў краіны, адзначыў Прэзідэнт. Ён нагадаў, што ў 2008 годзе роля Канстытуцыйнага Суда была ўзмоцнена шляхам пашырэння яго паўнамоцтваў, надзялення функцыямі па папярэднім кантролі канстытуцыйнасці законаў. У гэтым годзе заканадавец уручыў яму найважнейшы юрыдычны інструмент — закон «Аб канстытуцыйным судаводстве». Аляксандр Лукашэнка, звяртаючыся да суддзяў, адзначыў, што хацеў бы пачуць аб'ектыўную ацэнку дзейнасці Канстытуцыйнага Суда: «Знутры ж прасцей убачыць канкрэтныя праблемы і прычыны, якія, магчыма, перашкаджаюць паўнацэннаму функцыянаванню». Прэзідэнт дадаў, што чакае ад суддзяў прапаноў па дадатковых прававых рашэннях для ўстаранення праблемных момантаў, калі гэта неабходна.

### Важна меркаванне кожнага

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што просіць выбаршчыкаў прыйсці на ўчасткі па выбарах у мясцовыя Саветы дэпутатаў.

Прэзідэнт адзначыў, што дзейным скліканнем дасягнуты добрыя вынікі. «Але жыццё не стаіць на месцы, яшчэ вельмі многае трэба зрабіць. Таму вельмі важна, хто заўтра стане дэпутатам і далей працягне стваральную працу на карысць нашай краіны», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«У дні галасавання ў нашых грамадзян ёсць магчымасць самастойна адказаць на гэта пытанне. І таму я звяртаюся да нашых людзей і прашу прыйсці на выбарчыя ўчасткі і зрабіць свой усвядомлены выбар. Для нас важнае меркаванне кожнага чалавека», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што выбары павінны прайсці ў спакойнай абстаноўцы. «І я запэўніваю вас, што мы забяспечым бяспеку ўсіх арганізатараў і ўдзельнікаў выбарчай кампаніі. Сіл і сродкаў для гэтага ў нас дастаткова», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## МАЛАДЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ МАЛАДОЙ КРАІНЫ





**Сто 16-гадовых грамадзян Рэспублікі Беларусь напярэдадні Дня Канстытуцыі вышэйшы заканадаўчы і прадстаўнічы орган краіны — Палату прадстаўнікоў. Тут хлопцы і дзяўчаты атрымалі з рук парламентарыяў свае першыя дарослыя пашпарты і Канстытуцыю Беларусі.**



Сярод іншых пашпарты ў парламенце краіны атрымалі дзесяцікласніцы Баранавіцкай сярэдняй школы №19 сёстры Таццяна і Марыя Малашанкавы.

— Вельмі важна, каб адчуванне грамадзянінам сваёй краіны было звязана з прыемным, хвалюючым успамінам, — лічыць **дэпутат ад Баранавіцкай Заходняй выбарчай акругі № 5 Вольга ПАЛІТЫКА.** — Атрыманне галоўнага дакумента грамадзяніна ва ўрачыстых абставінах у цэнтры заканадаўчай улады нашай краіны — у парламенце, запомніцца на ўсё жыццё, выклікае пачуццё гонару. Хацелася б, каб моманты яднання, уздыму нацыянальнага духу перажываліся беларусамі як мага часцей.

Усяго тры дэлегацыі падлеткаў былі сёлета ўдастоены гонару пасядзець у дэпутацкіх крэслах Авальнай залы ніжняй палаты парламента: школьнікі з Баранавічаў, Уздзеншчыны і Мінска.

СТАР. 2



Фотаздымкі Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## ЛІЧБА ДНЯ

**$1 млрд 44,4 млн**

*склаў зарэгістраваны заробак беларусаў за мяжой разам з грашовымі і іншымі пераводамі прыватных асоб з-за мяжы ў Беларусь за 2013 год. Для параўнання: сума асабістых пераводаў, атрыманых беларусамі з-за мяжы за 2012 год, склала $950,8 млн. Нацыянальны банк прыводзіць звесткі і па асабістых пераводах, якія былі выплачаны з Беларусі ў іншыя краіны. Летась яны склалі $138,6 млн. У апошнія гады назіраўся імклівы рост асабістых пераводаў, атрыманых беларусамі з-за мяжы. Для параўнання: у 2011 годзе атрыманыя беларусамі асабістыя пераводы склалі — $ 792,3 млн, 2010-м — $500,2 млн, у 2009 годзе — $411,8 млн.*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.03.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9820,00 | ▲ |
| Еўра | 13610,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 268,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 972,28 | ▼ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | +6° |
| Віцебск | +5° |
| Гомель | +11° |
| Гродна | +6° |
| Магілёў | +6° |
| Мінск | +5° |

## КАНСТЫТУЦЫЯ ЯК НАВУКОВАЯ ДЫСЦЫПЛІНА

**Веданне палажэнняў Канстытуцыі дапамагае ў працы і юрыстам-міжнароднікам, і адвакатам.**

Працэс нарматворчасці вельмі складаны і скрупулёзны. Вялікую ролю ў ім адыгрывае навуковы складнік. І гэта нездарма: перш чым стварыць якуюсьці прававую норму, а тым больш новую сферу адносін, трэба вывучыць шмат дакументаў, існуючую практыку, думкі ў грамадстве, замежнае заканадаўства...

— Мы ж у гэтай справе часта не першапраходнікі, таму навошта вынаходзіць веласіпед? — лічыць **начальнік галоўнага ўпраўлення нарматворчай дзейнасці ў сферы дзяржаўнага будаўніцтва Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь Ганна ШПАК.** — Таму імкнёмся запазычваць лепшыя напрацоўкі і адаптаваць іх пад нашы рэаліі. Паколькі дзяржава наша маладая, то нарматыўна-прававая база будавалася вельмі інтэнсіўна. Тысячы дакументаў, зацверджаных за гэты час, і сфарміравалі цяперашняе прававое поле. Але галоўнай базай законнасці па-ранейшаму застаецца Канстытуцыя.

Так, артыкул 8 Асноўнага Закона краіны прысвечаны міжнароднаму праву. Згодна з ім, Беларусь можа дабравольна ўваходзіць у міждзяржаўныя ўтварэнні і выходзіць з іх. Таксама не дапускаецца заключэнне міжнародных дагавораў, якія супярэчаць Канстытуцыі. Але як Мінюст удзельнічае ў рэалізацыі гэтых палажэнняў?

— У Законе «Аб міжнародных дагаворах» замацаваны нормы аб падрыхтоўцы міністэрствам адпаведнага заключэння, дзе нормы дакумента аналізуюцца ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, — паведаміў начальнік упраўлення міжнароднага супрацоўніцтва Міністэрства юстыцыі Аляксей Алёшын. — Без гэтага дагавор заключыць немагчыма. Таму мы выступаем у ролі аднаго з гарантаў рэалізацыі міжнароднага права на тэрыторыі Беларусі.

Між іншым, летась былі падрыхтаваны да падпісання праекты міжнародных дагавораў аб прававой дапамозе з Сербіяй, Аб'яднанымі Арабскімі Эміратамі, Паўднёвай Карэяй і Паўднёва-Афрыканскай Рэспублікай. Праекты адпаведных дагавораў цяпер узгадняюцца з многімі краінамі. У іх ліку — Эстонія, Латвія, Славенія, Інданезія, Кувейт...

Нормы Канстытуцыі фактычна кіруюць жыццём кожнага, дапамагаюць вырашаць спрэчныя пытанні, абараняць свае правы.

— У прыватнасці, артыкул 62 Канстытуцыі стаў для адвакатаў адным з базавых, — запэўнівае **старшыня Рэспубліканскай калегіі адвакатаў Віктар ЧАЙЧЫЦ.** — Напрыклад, у Крымінальна-працэсуальным кодэксе не прапісана, што адвакат мае права прысутнічаць пры допыце сведкі. І таму яму кажуць: «Выбачайце, але мы вас туды не дапусцім». На што адвакат бярэ Канстытуцыю і кажа: «Выбачайце, вось у артыкуле 62 напісана: «Кожны мае права на атрыманне юрыдычнай дапамогі ў любы момант». І менавіта дзякуючы гэтаму нам удаецца абараняць нашых кліентаў больш якасна...

Сёння можна з упэўненасцю сказаць, што Асноўным Законам краіны ўрэгулявана дзейнасць усіх сфер грамадскіх адносін. Але спецыялісты прыходзяць да высновы: існуючыя заканадаўчыя нормы неабходна ўдасканальваць адначасова з развіццём грамадства і дзяржавы. Таму, як будуць яны змяняцца — пакажа час.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

■ Крэдытаванне жылля

## ВЯСНА АКТЫВІЗУЕ КАМЕРЦЫЙНЫЯ БАНКІ

Каб атрымаць крэдыт на нерухомасць, можна прадставіць у разлік нават бабуліну пенсію

**Гэтымі днямі яшчэ адна камерцыйная фінустанова — БПС-Ашчадбанк — пасля доўгага перапынку аднавіў свае праграмы фінансавання нерухомасці. На афіцыйным сайце банка паведамляецца, што цяпер пазычыць грошай на куплю або будаўніцтва жылля тут можна на 20 гадоў пад стаўку да 45,5% гадавых.**

Такі крэдыт, «Класічны», будуць даваць і на набыццё зямельных участкаў на аўкцыёне ці на другасным рынку зямлі. Мінімальная сума крэдыту складае 10 млн рублёў, а максімальная — залежыць ад спосабу забеспячэння па крэдыце. Калі кліент адшукае сур'ёзных паручыцеляў (фізічныя або юрыдычныя асобы), то можна разлічваць на памер да 80% ад кошту жылля, але не больш за 150 тысяч долараў у эквіваленце.

СТАР. 2





### МЗС абвяргае паведамленні аб затрыманні ў Польшчы беларускага дыпламата

**Аб гэтым, адказваючы на пытанні прадстаўнікоў СМІ, паведаміў начальнік упраўлення інфармацыі — прэс-сакратар МЗС Дзмітрый Міронччык, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Апошнім часам беларускія дыпламаты на тэрыторыі Польшчы не затрымліваліся і тым больш не браліся пад варту», — адзначыў Дзмітрый Міронччык.

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### БОІНГ НАКІРОЎВАЎСЯ ДА АНДАМАНСКІХ АСТРАВОЎ, АДКЛЮЧЫЎШЫ СІСТЭМЫ СУВЯЗІ

Абедзве сістэмы сувязі з дыспетчарамі на зніклым малайзійскім Боінгу 777-200, які выконваў рэйс з Куала-Лумпура ў Пекін, былі паслядоўна адключаны перад тым, як самалёт, магчыма, змяніў курс, перадае тэлеканал CBS. «Той факт, што сучасны самалёт, магчыма, змяніў курс у той самы час, калі транспондар быў выключаны, мяркуе, што хтосьці несанкцыянавана ўзяў на сябе кіраванне самалётам. Гэтым чалавекам мог быць як зламыснік, так і адзін з пілотаў», — распавёў амерыканскі эксперт газеце The Washington Post пры ўмове ананімнасці. У той жа час іншы амерыканскі эксперт у галіне авіяцыйнай бяспекі Чэслі Саленбергер выказаў меркаванне, што сістэмы маглі выключыцца паслядоўна толькі ў тым выпадку, калі на борце цалкам перасталі дзейнічаць усе сістэмы электразабеспячэння. Пасля таго, як самалёт знік з радараў, ён мог праляцець яшчэ больш за чатыры гадзіны, паведамляе газета The Wall Street Journal. У такім выпадку існуе вялікая верагоднасць таго, што сістэмы для сувязі былі адключаны наўмысна.

### З-ЗА СУТЫКНЕННЯЎ У ДАНЕЦКУ АБВЯСЦІЛІ ЖАЛОБУ



У Данецкай вобласці пятніцу 14 сакавіка аб'явілі днём жалобы. Адпаведнае распараджэнне, як паведамляецца на сайце абласной адміністрацыі, падпісаў губернатар Сяргей Тарута. Такое рашэнне прынята ў сувязі з нядаўнімі сутыкненнямі ў Данецку, падчас якіх загінуў як мінімум адзін чалавек. На тэрыторыі рэгіёна ўчора былі прыспушчаны дзяржаўныя сцягі. Арганізацыям і ўстановам было рэкамендавана ўстрымацца ад забаўляльных мерапрыемстваў. Напярэдадні вечарам у Данецку адбыліся сутыкненні паміж прарасійскімі актывістамі і ўдзельнікамі мітынгу за адзінства Украіны. У бойках узялі ўдзел сотні людзей. Паводле афіцыйных даных, у выніку загінуў адзін чалавек, які атрымаў нажавое раненне. Па медыцынскую дапамогу звярнуліся 26 пацярпелых. У лячэбных установах сёння знаходзяцца чацвёра, прычым адзін з іх — у цяжкім стане. Абласное аддзяленне нацыяналістычнай партыі «Воля» заявіла, што сярод загінулых — яе былы прэс-сакратар Зміцер Чарняўскі. У самой партыі пры гэтым сцвярджаюць, што, апроч яго, загінулі яшчэ два чалавекі. На падзеі ў Данецку, між тым, адрэагаваў і расійскі МЗС, які заявіў, што кіеўскія ўлады не кантралююць становішча ў краіне і што Расія гатова ўзяць пад абарону грамадзян, якія знаходзяцца ва Украіне. У міністэрстве пры гэтым, каментуючы сутыкненні, заявілі, што ў Данецку на мірных дэманстрантаў, якія выйшлі на вуліцы ў знак пратэсту супраць «людзей, якія называюць сябе ўкраінскай уладай», напалі прадстаўнікі праварадыкальных груповак, узброеныя бітамі і траўматычнай зброяй.

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### «АПЕРАЦЫЯ «І»?



Эпатажны расійскі палітык Уладзімір Жарыноўскі заяўляе, што літара «ы» ганьбіць рускую мову. «Трэба прыбраць гэтую літару агідную — гэта азіятчына. Гэта ад манголаў да нас прыйшло. Ні ў адной еўрапейскай мове літары «ы» няма, — цытуюць палітыка інфармагенцтвы. Уладзімір Жырыноўскі лічыць, што гартанны гук «ы» псуе прыгажосць рускай мовы: маўляў, гэта звяры так «кажуць», і літары «і» цалкам хапіла б. Да таго ж, адзначыў дэпутат Дзярждумы РФ, гэтая літара цяжка ўспрымаецца маленькімі дзецьмі. Яго ўласны сын гук «ы» не вымаўляў.

## КОРАТКА

Міністэрства інфармацыі Беларусі дзясяты раз праводзіць Нацыянальны конкурс друкаваных сродкаў масавай інфармацыі «Залатая Літара». Апошні дзень прыёму заявак — 1 красавіка гэтага года.

У законе Беларусі «Аб рэкламе» неабходна прапісаць інструмент, які прадугледжвае працэдуру адмовы абанентаў ад рэкламнай рассылкі аператараў сотавай сувязі, заявіла намеснік міністра гандлю Ірына Наркевіч.

Шырокая грашовая маса ў Беларусі на 1 сакавіка 2014 года склала Br195 трлн 680,2 млрд і з пачатку года ўзрасла на 1,2%, у тым ліку за студзень скарацілася на 1,3%, за люты павялічылася на 2,6%.

Беларускія музеі ў час ЧС па хакеі ўпершыню правядуць рэспубліканскую акцыю «Ноч у музеі» па аналогіі з мерапрыемствам «Ноч музеяў», якое ўжо стала традыцыйным.

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ШАНОЎНЫЯ СЯБРЫ!

Працягваецца падпіска на «Звязду» на II квартал 2014 года!

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам да свята для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

| Індэкс/перыяд | 1 месяц | 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (для індывідуальных падпісчыкаў) | 47 500 | 142 500 |
| 63145 (для ветэранаў ВАВ і пенсіянераў) | 42 750 | 128 250 |
| 63858 (для ведамасных падпісчыкаў) | 95 300 | 285 900 |
| 63239 (ведамасная падпіска для ўстаноў міністэрстваў адукацыі, культуры і аховы здароўя) | 85 800 | 257 400 |

## МЗС: «БЯСПЕКА ПАВЕТРАНАЙ ПРАСТОРЫ — НАША СУВЕРЭННАЕ ПРАВА»

**Знешнепалітычнае ведамства Беларусі прызывае ўкраінскіх калег устрымацца ад сур'ёзных заяў, якія не пацвярджаюцца праверанай інфармацыяй. Так гаворыцца ў каментарыі прэс-сакратара Міністэрства замежных спраў Дзмітрыя МІРОНЧЫКА адносна паведамлення прэс-службы ўкраінскага МЗС пра тое, што расійскія ваенныя часці праводзяць вучэнні на беларускай тэрыторыі.**

«Мяркуем, што для такіх сур'ёзных і паважаных ведамстваў, як міністэрствы замежных спраў, не вельмі добра выкарыстоўваць неправеранаю інфармацыю, а прасцей кажучы, здагадкі», — падкрэсліў Дзмітрый Міронычык.

Прэс-сакратар акцэнтаваў увагу на тым, што, напрыклад, беларускае дыпламатычнае ведамства пазбягае спекуляцый, пабудаваных на звестках неназваных «аператыўных крыніц». «Хаця мы таксама маглі б паразважаць на тэму, дзе знаходзіцца агністрэльная зброя і боепрыпасы, аб знікненні якіх са складоў на ўкраінскай тэрыторыі паведамляюць ананімы ў шэрагу СМІ», — дадаў прадстаўнік беларускага МЗС.

«Што да сітуацыі, якая дала ўкраінскім калегам падставу да занепакоенасці, то беларускі бок заўсёды выразна і максімальна празрыста тлумачыць прычыны і логіку сваіх дзеянняў, якія могуць закранаць інтарэсы нашых замежных партнёраў і, тым больш, бліжэйшых суседзяў», — заўважыў у каментарыі дыпламат. Ён адзначыў, што адпрацоўка пытанняў па нарошчванні дзяжурных сіл супрацьпаветранай абароны Адзінай рэгіянальнай сістэмы СПА Беларусі і Расіі праводзіцца ў адказ на рашэнне НАТА павялічваць каля нашых межаў групоўку ваенна-паветраных сіл. «Пытанне пра тое, якімі матывамі пры гэтым кіруюцца краіны блока, украінскаму боку лепш адрасаваць ім, — падкрэсліў Дзмітрый Міронычык. — Мы ж лічым, што меры па забеспячэнні бяспекі нашай паветранай прасторы і межаў павінны быць прыняты і яны прымаюцца — адказна і галосна. Гэта наша ўнутраная справа і суверэннае права».

Прэс-сакратар выказаў спадзяванні, што ўкраінскія калегі ў будучым устрымаюцца ад падобных заяў, каб не ўносіць раскол у традыцыйна сяброўскія стасункі паміж нашымі дзяржавамі. «Тым больш, што для ўзаемадзеяння знешнепалітычных ведамстваў дзвюх суседніх краін ёсць шэраг сродкаў і каналаў, і для гэтага не патрэбна карыстацца «аператыўнымі крыніцамі», — рэзюмаваў дыпламат.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

## МАЛАДЫЯ ГРАМАДЗЯНЕ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Народныя абраннікі расказалі ім пра гісторыю беларускага парламентарызму, структуру Палаты прадстаўнікоў і яе рэгламент, пазнаёмілі з экспазіцыяй, якая прысвечана дзейнасці ніжняй палаты, адказалі на актуальныя для заўтрашніх абітурыентаў пытанні, а потым яшчэ і звазілі дзяцей на экскурсію ў некалькі цікавых для іх і знакавых для сучаснай сталіцы Беларусі мясцін Мінска. Такіх, напрыклад, як плошча Дзяржаўнага сцяга, «Чыжоўка-Арэна» і Беларускі дзяржаўны аграрны тэхнічны ўніверсітэт.

— Сімвалічна, што напярэдадні 20-годдзя Канстытуцыі Беларусі, асноўнага закона, па якім наша дзяржава жыве і працуе, у парламенце адбываецца ўручэнне пашпартоў маладым грамадзянам, якія будуць фарміраваць новае грамадства, — сказаў дэпутат ад Дзяржынскай выбарчай акругі № 71 Уладзіслаў Цыдзік. — Невыпадкова і тое, што яны пасля наведаюць аграрны тэхнічны ўніверсітэт, бо мы разлічваем, што нехта з іх складзе будучы кадравы патэнцыял аграпрамысловага комплексу краіны і будзе вырашаць пытанні інтэнсіўнага вядзення сельскагаспадарчай вытворчасці.

Самі дзеці аднесліся з энтузіязмам і гонарам да такой магчымасці. Яны з задавальненнем давалі інтэрв'ю перад тэлекамерамі, фатаграфаваліся на памяць і размаўлялі з заканатворцамі.

— Мы зацікаўлены ў тым, каб вы былі паспяховымі, — звярнуўся да моладзі **старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па адукацыі, культуры і навуцы Генадзь ПАЛЬЧЫК.** — Бо ад гэтага залежыць будучыня Беларусі. Я заўсёды казаў, што поспех маладога пакалення — залог дабрабыту старэйшага. Ваша актыўная асабістая пазіцыя — гарантыя развіцця ўсёй краіны.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Блізкая ўлада

## РАЗМОВА ПА СУТНАСЦІ

**Марыяна Шчоткіна, міністр працы і сацыяльнай абароны, сустрэлася з калектывам Дубровенскага льнозавода.**

Цяперашняе адкрытае акцыянернае таварыства «Дубровенскі льнозавод» функцыянуе з пачатку 1930-х гадоў. У асноўным тут займаюцца перапрацоўкай ільнотрасты, вырабляюць доўгае і кароткае ільняное валакно, упаковачны і паліраваны шпагат, паклю і гэтак далей. Прыкладна пятая частка ўсяго льновалакна з Віцебскай вобласці, — прадукцыя менавіта гэтага льнозавода. Каля 40% прадукцыі экспартуецца ў Кітай, Чэхію, Расію...

Працаўнікі прадпрыемства задалі міністру шмат розных пытанняў, якія, можна смела меркаваць, хвалююць не толькі іх. У прыватнасці, няўжо справядліва калі адзін чалавек адпрацаваў сумленна дзясяткі гадоў, а іншы — у разы менш, але пры гэтым памер пенсіі ў іх не вельмі адрозніваецца? У міністра таксама запыталі, чаму часам выплачваецца розная зарплата, калі людзі заняты аднолькавай працай. Звярталіся і з іншымі пытаннямі і прапановамі...

— З пачатку года працягласць мінімальнага працоўнага стажу, неабходнага для прызначэння працоўнай пенсіі па ўзросце і за выслугу гадоў, павялічана да 10 гадоў, — адзначыла падчас сустрэчы міністр. — Я лічу, што гэтага недастаткова. Таму будзем прапрацоўваць пытанні ў бок павелічэння страхавога стажу.

Марыяна Шчоткіна яшчэ раз канстатавала, што ў нашай краіне не плануюць павысіць пенсійны ўзрост. Яна падкрэсліла, што дасягненне жанчынамі 55-гадовага, а мужчынамі 60-гадовага ўзросту — не прычына, каб супрацоўніка адправіць на пенсію, калі ён працуе старанна і не парушае вытворчую дысцыпліну.

Падчас азнаямлення з вытворчасцю Марыяна Шчоткіна гаварыла аб тым, што льновалакно, вядома, выпрацоўваецца ў шкодных для здароўя чалавека ўмовах: шум, запыленасць. Яна адзначыла, што кіраўніцтва прадпрыемства, улічваючы вышэйзгаданы факт, стараецца значна знізіць шкоду да мінімуму. Толькі летась на прадпрыемстве каля 122,5 мільёна рублёў вылучылі на паляпшэнне ўмоў працы. Але спыняцца ў гэтым кірунку не трэба. І надалей неабходна паляпшаць умовы працы, мадэрнізаваць прадпрыемства.

Адказваючы на пытанні прадстаўнікоў СМІ, Марыяна Шчоткіна падкрэсліла, што падчас сустрэч з працоўнымі калектывамі на месцах людзі агучваюць нямала разумных прапаноў. Апошнія потым можна выкарыстоўваць пры распрацоўцы нарматыўна-прававых актаў.

— Сёлета распрацоўваюцца канцэпцыі пяцігадовых праграм. Што тычыцца нашага міністэрства, гэта, у прыватнасці, праграмы дэмаграфічнай бяспекі, аховы працы, развіцця сацыяльнага абслугоўвання. Заўсёды вельмі важна ведаць, якія пытанні хвалююць людзей, — сказала Марыяна Шчоткіна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### ПАВОДКА НЕ ЧАКАЕЦЦА, АЛЕ ДА ЯЕ ТРЭБА БЫЦЬ ГАТОВЫМІ

**Камісія па надзвычайных сітуацыях пры Брэсцкім аблвыканкаме правяла пасяджэнне па пытаннях магчымай паводкі яшчэ 7 сакавіка. Адзначалася, што для правядзення аварыйна-выратавальных работ пры ўзнікненні надзвычайных сітуацый гатовы каля 9 тысяч чалавек і дзве тысячы адзінак тэхнікі.**

Напомню, што летась паводкавымі і талымі водамі ў рэгіёне было падтоплена 20 домаўладанняў, 207 гаспадарчых пабудоў і 418 падворкаў у 26 населеных пунктах Брэсцкага, Лунінецкага, Пінскага, Столінскага раёнаў. Часова адсяляліся да сваякоў 12 чалавек.

Сёлета складваецца спрыяльная паводкавая сітуацыя, — адзначылі ў Брэсцкім абласным упраўленні МНС. — На рэках вобласці істотных змен узроўню вады не адзначана. На праблемнай палескай Гарыні ўзровень вады пакуль ніжэйшы за небяспечны. Рэкі вобласці поўнасцю вызваліліся ад лёду.

Тым не менш усе структуры, якія могуць быць задзейнічаны на ліквідацыі наступстваў паводкі, рыхтуюцца да любых варыянтаў развіцця падзей. Удакладняецца склад эвакуацыйных камісій і парадак апавяшчэння насельніцтва. Падрыхтаваны 321 перасоўная электрагенерыруючая ўстаноўка, а таксама дзве мабільныя кацельныя. Створаны запасы будматэрыялаў, абсталявання і маёмасці. Лепш, каб усё гэта не спатрэбілася, але няхай будзе напагатове, заўважылі ў абласным МНС.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

### ДЗЯЦІНСТВА БЕЗ НАРКОТЫКАЎ

**У Мінскай вобласці стартавала акцыя «Шчаслівае дзяцінства», якая прадоўжыцца да 10 красавіка. Яе мэта — прафілактыка ўжывання і распаўсюджвання дзецьмі і падлеткамі наркатычных і псіхатропных сродкаў, рэчываў, што ўваходзяць у састаў курыльных сумесяў.**

Арганізавалі мерапрыемствы камісія па справах непаўналетніх і ўпраўленне адукацыі аблвыканкама. І праводзіцца яно ў цесным узаемадзеянні з педагогамі, медыкамі, прадстаўнікамі органаў унутраных спраў, аховы здароўя, адукацыі, спорту і турызму, грамадскіх арганізацый.

У кожным раёне цэнтральнага рэгіёна будуць арганізаваны тэматычныя дыспут-клубы для непаўналетніх, флэшмобы, разнастайныя конкурсы, паказ фільмаў. Плануецца таксама работа «гарачай» тэлефоннай лініі, дзе дарослыя і дзеці атрымаюць кампетэнтную і поўную інфармацыю пра наркотыкі і наступствы іх ужывання. Маюць намер абмеркаваць праблему на абласным бацькоўскім сходзе і знайсці шляхі яе вырашэння.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

### НА РЫНКАХ ВЫЯЎЛЕНЫ ШМАТЛІКІЯ ПАРУШЭННІ

**Міністэрства гандлю, праверыўшы шэраг гандлёвых сетак, правяло кантрольныя мерапрыемствы і ў дачыненні рынкаў. Усяго па краіне іх было праверана 22.**

Вынікі засведчылі шматлікія парушэнні і ўпушчэнні з боку ўласнікаў рынкаў: адсутнасць інфармацыі для наведвальнікаў, дастатковай колькасці месцаў для паркоўкі аўтамабіляў, пунктаў абмену валюты, інфакіёскаў, банкаматаў. Апроч іншых парушэнняў, былі таксама непрыбраная тэрыторыя, закрытыя гандлёвыя аб'екты падчас працы рынкаў. У парушэнне ўстаноўленых правілаў траціна абследаваных рынкаў не была абсталявана пунктамі пракату вазкоў для дастаўкі тавару да гандлёвых месцаў. На рэчавых рынках, як правіла, адсутнічалі неабходныя ўмовы для прымеркі пакупнікамі адзення і абутку.

Акрамя таго, устаноўлены факты гандлю таварамі, забароненымі да рэалізацыі на гандлёвых месцах на рынках, а таксама неарганізаванага гандлю фізічнымі асобамі. Толькі за адзін дзень падчас праведзенага маніторынгу на тэрыторыі гандлёвага цэнтра «Верхні пасаж» (ЗАТ «Панмаркет») і на адкрытай выставачнай пляцоўцы Выставачнага цэнтра «Аквабел» выдадзены рэкамендацыі аб выпраўленні выяўленых парушэнняў 43 суб'ектам гаспадарання. Гэтыя ўпушчэнні і недахопы, канстатуюць у міністэрстве, сведчаць аб адсутнасці належнай увагі і кантролю за работай прадаўцоў з боку органаў упраўлення рынкаў.

### РТУЦЬ НА ПАЖАРЫШЧЫ

**У Пухавіцкім раёне пры разборы будаўнічых канструкцый дома, які выгараў, выратавальнікі знайшлі ртуць.**

Выклік на пажар у вёску Станіслававa паступіў каля пятай гадзіны раніцы. На месцы выратавальнікі ўбачылі драўляны дом, які ўжо быў ахоплены адкрытым полымем. У выніку быў знішчаны дах, жыллё, што выкарыстоўвалася як дача, выгарала знутры. Гаспадар на момант здарэння адсутнічаў.

Як паведамілі ў Мінскім абласным упраўленні МНС, пры разборы будаўнічых канструкцый выратавальнік, хімік-дазіметрыст, у прыбудове да дома знайшоў у пяцілітровым вядры вадкасць металічнага колеру. Вядро было запоўнена на 4 сантыметры, вага змесціва склала каля 9 кілаграмаў. Работнікі МНС пераліл ртуць у герметычную ёмістасць і канфіскавалі яе для далейшай утылізацыі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## З ПРАГНОЗАМ НА ПРАГМАТЫЗМ

**У Кіеве прагматычна прадумаюць свае крокі і зробяць той выбар, які ацэніць і бізнес, і простыя людзі. Так заявіў журналістам Аляксандр МІХНЕВІЧ, першы намеснік міністра замежных спраў Беларусі, каментуючы магчымы выхад Украіны з Садружнасці Незалежных Дзяржаў.**

Дыпламат падкрэсліў, што выхад з гэтага аб'яднання — суверэннае права кожнай дзяржавы-ўдзельніцы. «Ніхто яго не аспрэчвае і не збіраецца аспрэчваць, — патлумачыў ён. — Аднак, разам з тым, нават павярхоўны цвярозы аналіз удзелу Украіны ў Садружнасці паказвае відавочнасць цэлага шэрагу плюсоў: тут і пытанні гандлю, у цэлым знешнеэканамічных сувязяў, і шматлікія фарматы супрацоўніцтва ў сферы транспарту, энергетыкі, сувязі, барацьбы са злачыннасцю...»

Нагадаем, у сродках масавай інфармацыі паведамленні пра такі намер суседняй дзяржавы з'явіліся пасля заявы выканаўцы абавязкаў міністра замежных спраў Украіны Андрэя Дзяшчыцы. Ён падкрэсліў, што арганізацыя і яе ўдзельнікі не рэагуюць на патрабаванні Кіева правесці экстраннае пасяджэнне Савета міністраў замежных спраў краін СНД па «крымскай праблематыцы».

Аляксандр Міхневіч заўважыў, што Беларусь, у прынцыпе, не выступала супраць неабходнасці абмеркавання сітуацыі ў рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў. «Мы прапанавалі абмеркаваць зварот Украіны на першым этапе на ўзроўні пастаянных паўнамоцных прадстаўнікоў, — расказаў намеснік міністра замежных спраў. — Пастаянныя прадстаўнікі гэтае пытанне разгледзелі і калектыўна выпрацавалі прапанову аб правядзенні сустрэчы намеснікаў міністраў замежных спраў краін Садружнасці 14 сакавіка гэтага года ў Мінску».

Таксама Аляксандр Міхневіч акцэнтаваў увагу на тым, што, улічваючы глыбіню крызісу, прапанова Украіны сабрацца ў Кіеве была не самай удалай. Па яго словах, першапачаткова можна было меркаваць, што з гэтым наўрад ці будуць згодны ўсе краіны-ўдзельніцы. «Выбар Мінска ўяўляецца найбольш аптымальным, — заўважыў прадстаўнік беларускага дыпламатычнага ведамства. — Мінск з'яўляецца нейтральнай пляцоўкай, якая дазваляе правесці абмеркаванне ў аб'ектыўным і непрадузятым рэчышчы. Тут размешчана штаб-кватэра Садружнасці. Акрамя таго, Беларусь з'яўляецца сустаршынствуючай дзяржавай у СНД».

Прадстаўнік МЗС адзначыў, што рашэнне Украіны аб непрымальнасці для яе ўзроўню ўдзельнікаў сустрэчы было ўспрынята ў беларускім дыпламатычным ведамстве са шкадаваннем. «Як і другія калегі па СНД, мы разглядалі размову на ўзроўні намеснікаў міністраў у якасці аднаго з магчымых фарматаў для абмеркавання сітуацыі, якая складваецца», — падкрэсліў Аляксандр Міхневіч. Па яго словах, МЗС Беларусі па-ранейшаму выступае за сустрэчу ў беларускай сталіцы.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ Курсавая розніца

## Фінансавая ліхаманка

**Колькі разоў бываў у дзяцінстве ў Крыме не мог падумаць, што ён стане прычынай такіх жорсткіх спрэчак палітыкаў. Аднак самае цікавае ва ўсёй гэтай сітуацыі тое, што кепска сябе адчуваюць абсалютна ўсе.**

У самім Крыме людзі пачалі запасацца прадуктамі харчавання, што адразу паўплывала на цэны. Вырас кошт і на паліва. У той жа час на «мацерыковай» Украіне шмат сваіх праблем, дзеля вырашэння якіх новыя ўлады ідуць на меры вельмі жорсткай эканоміі, прычым у першую чаргу ў дзяржаўных арганізацыях. Вырашана абмежаваць зарплаты чыноўнікам, скараціць колькасць службовых аўтамабіляў, «зрэзаць» выдаткі на камандзіроўкі і іншае. Ці дапаможа гэта, пакажа час. Акрамя таго, Украіна не хоча аддаваць Крыму, напрыклад, радовішчы нафты ў Чорным моры, страта якіх таксама не станоўча адаб'ецца на эканоміцы нашай суседкі. У найбліжэйшы час казаць аб «сіле» грыўні наўрад ці прыйдзецца.

На гэтым фоне паміж Расіяй і Еўрасаюзам са Злучанымі Штатамі назіраецца ўзаеманявыгадны абмен уколамі «эканамічных рапір». На гэтым фоне расійскі рубель апускаецца яшчэ ніжэй. Але чэргаў у абменніках не назіраецца. З псіхалагічнага пункту гледжання, гэта тлумачыцца тым, што ўвага расіян адцягнута падзеямі ва Украіне. Вось толькі менавіта яны і з'яўляюцца галоўным фактарам слабасці рубля — усе чакаюць вынікаў рэферэндуму аб статусе Крыма, што адбудзецца ў нядзелю. Можа прыйсці яшчэ адзін «чорны панядзелак», як 3 сакавіка, калі рубель вельмі патаннеў.

Можа падацца, што ў выдатным стане знаходзяцца хаця б долар і еўра. Аднак не. Асабліва «еўрапеец», які пасля нядаўніх заяў кіраўніка Еўрапейскага Цэнтрабанка Марыа Драгі можа пайсці ўніз. Справа ў тым, што ЕЦБ нарэшце звярнуў увагу на ненармальна высокі курс еўра, які пачаў гуляць не на карысць Еўропы.

У Беларусі на валютнай біржы таксама было неспакойна. Еўра то анамальна паднімаўся, то такім жа чынам падаў. У выніку ён падаражэў за тыдзень на 40 рублёў (плюс 0,3%) да 13610. Долар жа падняўся на 30 рублёў (плюс 0,3%) да 9820. Расійскі рубель зноў патаннеў — яшчэ на 2 грашовыя адзінкі (мінус 0,7%) да 268.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

## ВЯСНА АКТЫВІЗУЕ КАМЕРЦЫЙНЫЯ БАНКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пры закладзе маёмасці ці маёмасных правоў банк прафінансуе да 70% кошту такога аб'екта нерухомасці.

Галоўны плюс такога крэдыту — для разліку максімальнай сумы пазыкі бярэцца не толькі заробак аднаго заяўніка, а сукупны даход усёй сям'і, у тым ліку сваякоў першай лініі (муж ці жонка, дзеці, бацькі і дзядулі з бабулямі). Мінусам тут з'яўляецца зменлівая стаўка па крэдыце, якая «плавае» разам са змяненнем стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка Беларусі.

Атрымліваецца, што калі вы вырашылі купіць кватэру за 50 тысяч долараў, то максімум, што можна папрасіць у банка, — гэта 40 тысяч долараў, або 395 млн рублёў у эквіваленце. Астатнюю суму прыйдзецца шукаць самастойна. Спецыялісты банка падказалі нам, што для атрымання крэдыту на такую суму сукупны даход сям'і павінен быць не менш за 32 мільёны рублёў у месяц.

Нагадаю, што крыху раней аднавіў крэдытаванне на куплю або будаўніцтва нерухомасці Белгазпрамбанк. Там крэдыт выдаецца на 15 гадоў, калі такімі сродкамі можна пакрыць да 70% кошту жылля. З моманту атрымання грошай і да прадастаўлення ў банк дагавора аб іпатэцы працэнтная стаўка складзе 46,5% гадавых (СР+23 п.п.). Пасля рэгістрацыі ўсіх дакументаў карыстанне грашыма стане танней на адзін працэнтны пункт — 45,5%.

А вось дзяржбанкі крэдытуюць толькі будаўніцтва жылля, прычым самыя танныя пазыкі выдае Беларусбанк. Іх крэдытная лінія можа прафінансаваць да 75% кошту будучай кватэры пад 38,5% гадавых на тэрмін 15 гадоў. У Белаграпрамбанку можна разлічваць на суму ў 90% ад цаны будаўніцтва пад 45% гадавых. Тут максімальны тэрмін крэдытавання — 20 гадоў. Нагадаю, што пры гэтым для разліку максімальнай сумы крэдыту дзяржбанкі бяруць у разлік толькі чысты даход аднаго заяўніка. У Белгазпрамбанку прынцып прыкладна такі ж. Але для павелічэння сумы крэдыту можна прыцягнуць паручыцеляў. Праўда, у разлік возьмуць толькі чвэрць іх даходу.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Пра духоўнае

## ВЯРТАННЕ ПОЛАЦКАГА ЕВАНГЕЛЛЯ

**Унікальны фаліянт папоўніў скарбонку нашай гісторыка-культурнай спадчыны. Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт Павел перадаў у дар Нацыянальнай бібліятэцы факсімільнае выданне Полацкага Евангелля XII стагоддзя.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Помнік славянскай пісьменнасці вярнуўся ў культурную прастору нашай краіны падчас святкавання Дня праваслаўнай кнігі, прымеркаванага да знакавай даты. 450 гадоў таму — 14 сакавіка 1564 года — на Русі з'явілася першая датаваная друкаваная кніга Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца «Апостал». Цікава, што маскоўскія першадрукары — выхадцы з беларускіх зямель.

Полацкае Евангелле сёння называюць першакнігай беларускай нацыі. Справа ў тым, што падобных старажытных кніг, створаных у XII ст. на землях сучаснай Беларусі, практычна не захавалася. За выключэннем 11 аркушаў, якія засталіся ад вядомага Тураўскага Евангелля XI ст.

— Чаму Евангелле мае такое вялікае значэнне? — задаў пытанне **Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Мітрапаліт Павел** і тут жа патлумачыў: — Мы ў нашым жыцці чытаем мастацкую літаратуру, навуковыя кнігі. Апошнія даюць нам веды аб жыцці, аб свеце. Мастацкая літаратура развівае ў нашай падсвядомасці вобразы, думкі. Калі мы бяром у рукі малітваслоў, то ў сваёй малітве звяртаемся да Бога. Просім, каб Гасподзь дапамагаў нам на нашым жыццёвым шляху, каб умацоўваў нас у ім. А вось калі мы адгортваем Евангелле і пачынаем яго чытаць, то павінны разумець, што сам Гасподзь звяртаецца да нас са словам настаўлення, адкрывае нам сваю Боскую ісціну. Евангелле — не што іншае, як адкрытасць Бога чалавеку. Таму вельмі важна чытаць Евангелле, бо слова Божае адкрывае нам Боскі свет. І няхай тым, хто будзе датыкацца да гэтай кнігі жыцця, яна адкрывае Боскі промысел аб нас, нашым выратаванні і веры.

Тэкст рукапісу Полацкага Евангелля напісаны на царкоўнаславянскай мове статутам — найстаражытнейшай формай кірыліцы, якая выкарыстоўвалася ў ранніх рукапісах як від найбольш урачыстага пісьма. Нататкі і ўкладныя запісы жыхароў старажытнага Полацка, якія захаваліся на палях Евангелля, зберагілі для нас асаблівасці жывога маўлення таго часу, калі адбывалася фарміраванне беларускай мовы.

У першай палове XIX стагоддзя помнік пісьменнасці быў вывезены з тэрыторыі Беларусі ў Расію. Сёння асноўная частка Полацкага Евангелля захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. Два аркушы з яго знаходзяцца ў фондах Расійскай дзяржаўнай бібліятэкі ў Маскве. Сумеснымі намаганнямі беларускіх і расійскіх спецыялістаў удалося адрэстаўраваць арыгінал і стварыць яго высакаякасную факсімільную копію. Сёння мы можам не толькі ганарыцца гэтым нацыянальным здабыткам, але і ўбачыць яго на свае вочы.

— Гэта не толькі вяртанне ў Беларусь помніка кніжнай культуры, але і вяртанне тых святынь, тых мудрых ісцін, якім пакланяліся нашы продкі, якія вучылі шанаваць іх сваіх дзяцей, — перакананы **дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Раман МАТУЛЬСКІ.** — Хочацца верыць, што мы не толькі будзем любавацца цудоўнай вокладкай кнігі і шрыфтам, якім яна напісана, але і тыя ісціны і каштоўнасці, якія прапаведуюцца ў Евангеллі, пранікнуць у нашы душы.

**Вераніка КАНЮТА.**

## ПАПА, ЯКІ ПРЫНЁС У КАСЦЁЛ ВЯСНУ

**Гадавіну абрання Папы Рымскага Францішка беларускія каталікі адзначылі набажэнствамі ў розных гарадах краіны. У мінскім архікатэдральным касцёле ў гонар Найсвяцейшай Панны Марыі адмысловую імшу ўзначаліў апостальскі нунцый, архіепіскап Клаўдыа Гуджэроці.**

Я добра памятаю тыя снежныя сакавіцкія дні, калі падчас канклава ў катэдры панавала хвалюючая атмасфера. Разам з Мітрапалітам Мінска-Магілёўскім архіепіскапам Тадэвушам Кандрусевічам пасля імшы вернікі ўважліва сачылі па вялікім экране за тым, як у Ватыкане вось-вось распачнецца галасаванне. У выніку канклава новым папам стаў аргенцінскі кардынал, езуіт Хорхе Марыа Берголья, аматар футболу, прозы Дастаеўскага і Борхеса, які выбраў сабе імя Францішак. Яго рыторыка адразу захапіла тысячы вернікаў па ўсім свеце. Ён адмовіўся жыць у папскіх апартаментах, зарэгістраваўся ў «Фэйсбуку», памяняў браніраваны аўтамабіль на адкрыты, без ваганняў прыняў у абдымкі хворага на нейрафібраматоз, а на сняданак у свой дзень народзінаў запрасіў чатырох жабракоў. Ён актыўна адгукаецца і на палітычныя «выбухі» часу і заклікаў саміт G-20 знайсці мірнае вырашэнне для крызісу ў Сірыі. Цікавіцца Папа і нашай краінай. Між іншым, гэта менавіта ён упершыню за 14 гадоў прызначыў у Беларусі трох новых епіскапаў і даслаў ліст аддана й верніцы Ядвізе Пастэрнак з Вілейшчыны... Новы пантыфік — вельмі сціплы чалавек. Падчас набажэнства апостальскі нунцый распавёў адметную гісторыю. У сталовай Дома святой Марты, дзе жыве Папа, Клаўдыа Гуджэроці не ўбачыў стала, за якім раней сядзеў пантыфік. Ён заўважыў Папу за сталом, схаваным за калонай. На здзіўленне нунцыя Францішак адказаў, што «больш не мог там есці, бо ўсе прыходзілі сфатаграфавацца з ім».

— Папа Францішак — чалавек, які хоча служыць Хрысту, — заўважыў **ахіепіскап Клаўдыа Гуджэроці.** — Бог заўсёды знаходзіць людзей, якія вядуць Касцёл да нябеснага валадарства. Нават тады, калі мы гэтага не разумеем. Гэтым разам Бог запрасіў чалавека з далёкай краіны. На гэтую зямлю ў свой час прыехалі еўрапейцы, якія амаль усе былі бедныя. Сям'я будучага папы таксама была ў пошуках заробку. Ён прыйшоў, каб сказаць перадусім жыхарам Заходняй Еўропы, што «вы выраслі ў матэрыяльнай забяспечанасці, шукаеце рацыянальнага тлумачэння Боскай таямніцы. Вы забыліся на голад. І калі чалавек галодны, ён мае патрэбу адчуваць сябе асобай, а не чарвяком. І што іншае, як не позірк Айца, яго вочы, якія глядзяць з любоўю, даюць чалавеку адчуваць сябе асобай?». У Беларусь ужо прыйшла вясна, а гэты Папа прынёс вясну ў Касцёл, радасць убачыць сонца.

— Ён толькі год на прастоле, але ўжо прызнаны часопісам «Time» чалавекам года, з'яўляецца кандыдатам Нобелеўскай прэміі міру. На яго плячах клопат аб паўсюдным Касцёле, — адзначыў падчас імшы **Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі архіепіскап Тадэвуш КАНДРУСЕВІЧ.** — Таксама і аб Касцёле Беларусі. У свой час Ісус сказаў святому Францішку: «Адбудуй мой Касцёл». І Папа Францішак гэтыя словы Хрыста адрасуе сабе. Заданні, якія сёння стаяць перад Касцёлам, вельмі важныя, і Папа хоча іх вырашыць. З дапамогай нашай малітвы таксама.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Тарас ШЧЫРЫ**

■

■ Сувязь

## ЧЫМ НАША СЛОВА АДГУКНЕЦЦА,

### альбо Тэлефонныя размовы падаражэюць

**«Белтэлекам» павышае тарыфы на асобныя паслугі электрасувязі. Так, з 20 сакавіка, у адпаведнасці з пастановай Міністэрства эканомікі № 21 ад 11 сакавіка, у сярэднім на 18 працэнтаў павялічваюцца рэгуляваныя тарыфы; з 26 сакавіка павялічваюцца тарыфы на шэраг дадатковых паслуг, якія аказваюцца РУП «Белтэлекам» (паслугі хостынга, даведачна-інфармацыйныя паслугі, CLIP і іншыя); а з 1 красавіка — на міжнародныя тэлефонныя злучэнні ў напрамку Расіі і Украіны (на 11 працэнтаў).**

Без змяненняў застаюцца тарыфы на паслугі доступу да інтэрнэту (byfly), гарантаваную паласу прапускання, інтэрактыўнае тэлебачанне ZALA, тэлефонныя злучэнні з абанентамі сетак сотавай рухомай сувязі.

Месячная абаненцкая плата за ўключаны ў асобную абаненцкую лінію тэлефон індывідуальнага карыстання павялічыцца з 8 310 рублёў да 10 200 рублёў. Абанплата за асноўны тэлефон калектыўнага карыстання павялічыцца з 18 000 да 22 100 рублёў. Пагадзінная плата за кожную дадатковую ці няпоўную хвіліну злучэння павялічыцца з 22,7 да 27,4 рубля. Прадастаўленне міжгародняй сувязі без дапамогі тэлефаніста павялічыцца з 60,7 да 66 рублёў за хвіліну, з дапамогай тэлефаніста — з 91 да 99 рублёў за хвіліну.

Для юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў павелічэнне гранічных максімальных тарыфаў складзе: абанплата за асноўны тэлефон — з 11 250 да 13 200 рублёў; абанплата за асноўны тэлефон у арганізацыях сацыяльнай сферы, што фінансуюцца з бюджэту, — з 5 600 да 6 550 рублёў; абанплата за асноўны тэлефон, уключаны ва ўстаноўска-вытворчую АТС у якасці злучальнай лініі, — з 25 500 да 29 900 рублёў. Пагадзінная плата за хвіліну злучэння павялічыцца з 38 да 44 рублёў. Міжгароднія званкі без паслуг тэлефаніста падаражэюць з 69 да 75 рублёў за хвіліну, з дапамогай тэлефаніста — са 104 да 113 рублёў за хвіліну.

У «Белтэлекаме» павелічэнне тарыфаў на асобныя віды электрасувязі тлумачаць тым, што пастаяннае развіццё тэлекамунікацыйных тэхналогій і забеспячэнне гарантаванай высокай якасці паслуг немагчыма без мадэрнізацыі сеткі, набыцця сучаснага абсталявання, распрацоўкі найноўшых тэхнічных рашэнняў. Гэта вымушае кампанію ўнесці змяненні ў кошт некаторых паслуг электрасувязі, даводзячы яе да ўзроўню пакрыцця выдаткаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

■

# Фядорына шчасце,
## або Экзотыка для турыстаў

**Магілёўшчына славіцца гаючай вадой, а калодзежы Фядоры Конюхавай рэкламуе нават афіцыйны сайт Бялыніцкага райвыканкама**



Зямля продкаў дае мне сілу.

**Сёння аграэкатурызм — галоўная цікавінка беларускай глыбінкі. Гэта вельмі актуальна ў Год гасціннасці. Экзатычных сядзіб цяпер шмат, таму, каб зацікавіць кліента, трэба мець нейкую «разыначку». Здаецца, у Бялыніцкага раёна яна ёсць. Гэта знакамітая знахарка Фядора, да якой у 90-я гады мінулага стагоддзя стаялі вялікія чэргі.**

Цяпер яна, акрамя лячэбных паслуг, аказвае яшчэ і... турыстычныя. Іншымі словамі, Фядора для райцэнтра не толькі лекарка, да якой у пошуках цуду звяртаецца народ, але яшчэ і прадпрымальніца, якая робіць для роднай спадчыны карысную справу — плаціць у мясцовую казну падаткі. Яе сядзіба так і называецца «У Фядоры Данілаўны». На афіцыйным сайце райцэнтра нават ёсць спасылка на гэты «аб'ект адпачынку і вольнага часу». З невялікага каментарыя можна даведацца пра тое, што «гаспадыня мае значныя веды ў галіне народнай медыцыны». А аматараў цішыні і фотапалявання чакаюць прагулкі па лесе, дзе шмат грыбоў і ягад, а таксама багаты жывёльны і раслінны свет. Да паслуг адпачывальнікаў — дыхтоўны двухпавярховы дом, які знаходзіцца на ўскрайку лесу.

Ад Бялынічаў да вёскі Пільшычы, дзе жыве Фядора, каля 25 кіламетраў. Гэты куток нават не кранула радыяцыя. Мясціны тут і насамрэч маляўнічыя. Але з транспартам — праблемы. Дзякуй, выручыў выканаўца абавязкаў старшыні Цяхцінскага сельсавета Аляксандр Цыбульскі.

Пакуль едзем, ён распавядае пра зямлячку: «У яе — дар, моцная энергетыка. Яна лечыць бескантактавым масажам, вадой і глінай. Цяпер ажыятажу няма, але людзі звяртаюцца. Магчыма, ёсць і такія, хто вылечыўся, але яны не прызнаюцца. Казаць, што гэтае лячэнне — панацэя, нельга. Адны людзі вераць, што ім яно дапамагае, іншыя — не».

Машына ў апошні раз вынырвае з лесу, і перад вачыма паўстае вёска Пільшычы — каля дзясятка хат, раскіданых паабапал дарогі. Двухпавярховы катэдж — тая самая Фядорына гасцініца — адразу кідаецца ў вочы. На падворку шмат гаспадарчых пабудоў. «Прыехалі!» Навокал — цішыня і, на дзіва, ніякіх чэргаў. Гукаем гаспадыню. Аб візіце карэспандэнта ёй ужо загадзя паведамілі па тэлефоне. Вось і яна. Нягледзячы на свае амаль 88 гадоў, выглядае маладжава. І апранута, як гараджанка: у прыбраную сукенку па фігуры. Валасы акуратна пастрыжаны і завіты. Адчуваю на сабе ўважлівы позірк карых вачэй. «Толькі праўду напішыце, — патрабуе яна. — А то былі тут да вас... Усякае глупства напрыдумвалі».

### «МАЦІ МАЙГО БАЦЬКІ ВАЛОДАЛА ГІПНОЗАМ»

У чырвоным куце вялікага светлага пакоя, куды нас запрашае гаспадыня, — абразы ў некалькі ярусаў. Пасярэдзіне — вялікі абраз святой Матронушкі, Багародзіца, Ісус. Побач са святымі — партрэты сваякоў. Каля Мікалая Цудатворца — фотаздымак ваеннага ў кепцы. Пра яго Фядора кажа з павагай: «Гэта мой дзед Філіп — анёл-ахоўнік». Ён загінуў падчас рэвалюцыйных хваляванняў у пачатку XX стагоддзя ў Кіеве. Менавіта ён «наказаў» унучцы ў сне лячыць калодзежнай вадой. Яго «загады» Фядора выконвае, чаго б ёй гэта ні каштавала. Кажа, што можа праігнараваць прапанову жывога чалавека, а вось дзеду — ніколі. Нават яго партрэтаў зрабіла столькі, каб былі ў кожным пакоі. Паважаць продкаў — гэта святы абавязак кожнага, настаўляе яна. Як і зямлю, на якой яны жылі. Фядора адчувае моц зямлі сваіх продкаў і гэта натхняе яе.

— А яшчэ мы пакутуем ад таго, што шмат дрэнных слоў ведаем, — павучае Фядора. — Напрыклад, нельга казаць «спасибо», трэба — «Спасі Бог». Тады будзе дапамога. Я гэта бачыла ў сне. А яшчэ, калі просіш у Бога здароўя, трэба яшчэ і падзякаваць за дапамогу.

...Незвычайныя здольнасці Фядоры яе бацька заўважыў яшчэ тады, калі ёй было 3 гады. Аднойчы ён ляжаў у бальніцы, і, калі да яго прывялі дзяўчынку, адчуў, як раптам боль адступіў. Пакуль яна сядзела побач і гладзіла па руцэ, было добра, а калі выходзіла за дзверы, зноў пачынала ўсё балець. Мужчына быў упэўнены: гэтая гаючая сіла ў дачкі — ад яго маці. Яна валодала гіпнозам і працавала лекаркай у мясцовага памешчыка. Памерла ў 1914 годзе ад чумы. Здаецца, нейкім незразумелым чынам бабуля перадала дар унучцы, якая з'явілася на свет роўна праз 13 гадоў пасля яе смерці — у 1927 годзе. Фядора памятае, як бацька вадзіў яе ў цырк «развіваць талент». Дзе яшчэ можна было ўбачыць, як працуюць ілюзіяністы? А потым была вайна, з якой ён не вярнуўся...



Заключэнне навукоўцаў наконт лячэбных здольнасцяў Фядоры і яе вады.

### КАЛОДЗЕЖЫ ФЯДОРЫ

Сон, які, па сутнасці, вызначыў яе лёс, Фядора ўбачыла пад канец вайны, калі разам з роднымі была ў эвакуацыі. У ім дзед «патрабаваў», каб яна вярталася ў родную вёску і працавала з вадой. Яна так і зрабіла.

— Вёска была спалена, а на тым месцы, дзе стаяла хата, за 4 гады вырасла вярба, з-пад якой выцякаў ручай, — успамінае лекарка. — Гэтая вярба мне і прыснілася. Я нават чула голас: «Пад ёй і капай». Разам з маці ўзяліся за работу і на глыбіні амаль 3 метры наткнуліся на старадаўні зруб. Гэта быў першы наш калодзеж. Цяпер іх — шэсць.

Фядора кажа, што менавіта гэтая вада дапамагла ёй аднойчы вярнуцца з таго свету. Жыццё склалася такім чынам, што яна разам з мужам і дзецьмі доўгі час жыла ў Казахстане. Там яна трапіла ў цяжкую дарожную аварыю, пасля якой цудам засталася жыць. Урачы нават не спадзяваліся, што пацыентка ачуняе. Яна — таксама. Таму і вырашала ехаць паміраць на радзіму. Піла ваду і, на здзіўленне ўсім, выжыла.

— У мяне нават ёсць дакументы, што гэтай вадзе няма роўных у свеце, — кажа яна і працягвае пажоўклы фірменны бланк... Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў імя Патрыса Лумумбы з заключэннем «па даследаванні метаду біяэнергетычнай індукцыйнай актывацыі донара Фядоры Конюхавай для вывучэння магчымасці лячэння хворых хірургічнага профілю». У ім і сапраўды даецца навуковая адзнака і пільшыцкай вады, і лекавых здольнасцяў Фядоры. Бянтэжыць толькі... адсутнасць пячаткі на дакуменце і нумар яго рэгістрацыі.

Фядора, між тым, знаходзіць сярод сваіх паперак яшчэ адзін «доказ» — засвечаную фотакартку з адбіткамі сваіх пальцаў, ад якіх быццам зыходзіць ззянне. Яна ўдакладняе: «Гэта мае рукі. Энергія, якая з іх выходзіць, — жывое іголкаўколванне». Кажа, што здымак зроблены ў медінстытуце ў канцы 1970-х гадоў.

> **МЕРКАВАННЕ Ў ТЭМУ**
>
> **Аляксандр Плятнёў, настаўнік фізікі Магілёўскага ліцэя БРУ:**
>
> ***— Людзі, якія кажуць пра свае энергетычныя магчымасці, проста добрыя псіхолагі. У медыцыне такі феномен называецца «эфект плацэба». Увесь сакрэт у тым, што «пацыент» проста верыць у тое, што яму такое «лячэнне» дапаможа. Але пакуль навуковых доказаў гэтаму няма, гарантыі на станоўчы вынік ніхто даць не зможа.***

— Гэта тут для мяне няма гонару, а ў Маскве ўсе акадэмікі вакол мяне танцавалі, — абураецца яна. — Магла б нядрэнна ўладкавацца ў Расіі, але ж на радзіму пацягнула. 25 гадоў таму вярнулася дадому і лячу людзей. У тым ліку і безнадзейных. Калі не верыце, магу даць тэлефоны тых, каму дапамагла.

— А вы за лячэнне грошы бераце? — пытаюся я.

— А хто без грошай жыве? Вядома, бяру. Колькі даюць — столькі і бяру. Гасцініцу ж трэба неяк утрымліваць.

### ГАСЦІНІЦА ЧАКАЕ НАВЕДВАЛЬНІКАЎ

Яна знаходзіцца побач з домам, дзе жыве сама Фядора. Для турыстаў тут створаны ўсе ўмовы: ёсць душ, санвузел, пакой для ежы. Унутры ўсё аздоблена дрэвам. З мэблі — толькі неабходнае. Напрыклад, у двухмесным нумары 2 ложкі, стол,



У адным з нумароў.

тумбачка, шафа. І ў кожным пакоі — абразы святых і ... сваякоў Фядоры. Пакуль кліентаў няма, у адным з нумароў стаіць таз з перцамі. Фядора радуецца: расада добра ўзышла. Побач з гасцініцай — агарод, дзе Фядора з дапамогай дачкі вырошчвае бульбу і агародніну. Ураджаю хапае і сабе, і пастаяльцам. Фядора нават свой хлеб выпякае, а ў краме купляе толькі самае неабходнае.

— Шкадую аб адным, — кажа яна напаследак. — Памру — і гэтае месца без догляду застанецца. Вада тут вельмі каштоўная, такой нідзе не знойдзеш. Яна — жывая. Нездарма ў савецкія гады сам міністр аховы здароўя Яўген Чазаў рэкамендаваў тут санаторый пабудаваць. Добра яшчэ, што знайшліся памочнікі, якія дапамаглі мне гасцініцу ўзвесці. Усё ж такі людзям зручней.

Калі развіталіся з Фядорай, да сядзібы пад'ехалі некалькі машын. Пацыентаў у жанчыны ўсё яшчэ хапае.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**




**СТАНЬЦЕ БЛІЖЭЙ ДА РОДНАЙ ПРЫРОДЫ!**

**Падпісаўшыся на новы праект Выдавецкага дома «Звязда» — часопіс «Родная прырода», вы не толькі атрымаеце шыкоўнае ілюстраванае выданне з мноствам цікавых фотаздымкаў жывёльнага і раслінннага свету, непаўторных беларускіх пейзажаў, з займальнай і карыснай інфармацыяй аб навакольным асяроддзі, аб братах нашых меншых. Вы яшчэ можаце прыняць удзел у розыгрышы фотаапарата з аб'ектывам, які мае шматразовае павелічэнне і дазваляе здымаць дробныя аб'екты і дэталі, звяроў, птушак і нават насякомых з вялікай адлегласці.**

Для таго, каб стаць удзельнікам розыгрышу, трэба аформіць падпіску на часопіс «Родная прырода» на II квартал 2014 года, запоўніць картку ўдзельніка і даслаць яе на адрас «Звязды».

Адкрыйце для сябе родную прыроду ў новым ракурсе. Абяцаем, будзе цікава!

Правілы рэкламнай гульні «Падпішыся на «Родную прыроду» апублікаваны ў нумары «Звязды» за 6 сакавіка.

**Картка ўдзельніка-падпісчыка «Роднай прыроды»** на II квартал 2014 года

Прозвішча, ініцыялы_______________

Хатні адрас і тэлефон (індэкс)_______________

_______________

Падпіска аформлена і аплачана ў (аддзяленне сувязі)_______________

_______________

_______________ *Удачы ў розыгрышы!*

Сардэчна віншуем любімую ўнучку **Вольгу Вячаславаўну МАРКЕВІЧ** з г. Навагрудка з днём нараджэння. Жадаем шчасця, сямейнага дабрабыту, здароўя.

*Желаем здоровья, любви и тепла,*
*Чтоб жизнь интересной и долгой была,*
*Чтоб в доме уют был, любовь да совет,*
*Чтоб дом защищен был от горя и бед.*
*Пусть для тебя в любое время года*
*Сияет солнце и звезда горит.*
*Пусть ангелы тебя оберегают,*
*И пусть Господь тебя хранит.*



**З любоўю і павагай бабуля Каця, дзядуля Ваня.**

■ Сюрпрызы прыроды

## РЭКІ «Б'ЮЦЬ» РЭКОРДЫ. ПА СПАКОІ

**Сёлетняя паводкавая сітуацыя — пакуль што адна з самых спакойных за апошнія некалькі гадоў.**

— На гідралагічны ўзровень рэк вясной моцна ўплывае зімовае надвор'е. Сёлета зіма была адметнай сваімі павышанымі тэмпературамі і частымі адлігамі, — расказала журналістам падчас прэс-канферэнцыі **начальнік аддзела гідралагічных прагнозаў Рэспубліканскага гідраметэаралагічнага цэнтра Марына НАГІБІНА**.

Па яе словах, лютаўская адліга паспрыяла таму, што ўзровень вады ў рэках пачаў падымацца яшчэ напрыканцы зімы. Прычым паказальнікі пад'ёму былі аднымі з самых нізкіх за апошнія гады. Напрыклад, на Бярэзіне ў раёне Барысава максімальны ўзровень паводкі пабіў рэкорд гістарычнага мінімуму, зафіксаванага ў 2003 годзе. Марына Нагібіна адзначыла, што пакуль вялікага разліву рэк чакаць не даводзіцца.

Супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, тым не менш, да ліквідацыі паводкі падрыхтаваныя.

— Быў распрацаваны шэраг мерапрыемстваў па кантролі паводкавай сітуацыі. Так, напрыклад, ва ўсіх рэгіёнах Беларусі працуюць спецыялізаваныя аператыўныя штабы, вядзецца ўлік населеных пунктаў і дамоў, якія ў выпадку паводкі рызыкуюць быць падтопленымі, — распавёў **начальнік Рэспубліканскага цэнтра кіравання і рэагавання на надзвычайныя сітуацыі МНС Андрэй ЮРЖЫЦ**.

Таксама ён паведаміў пра стварэнне 15 атрадаў, якія ў стане весці ўсе неабходныя работы па ліквідацыі паводкі. Пакуль што такія захады не патрэбны.

Тым не менш, сіноптыкі раяць «не расслабляцца», бо ў хуткім часе на Беларусь адзін за адным прыйдуць тры магутныя цыклоны, якія прынясуць з сабой узмацненне ветру і ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу. Паляпшэння надвор'я варта чакаць не раней, чым напрыканцы наступнага тыдня.

**Ганна ГАРУСТОВІЧ**

## Дарогі пачынаюцца ў... Глушкавічах



**Гранітнае радовішча за вёскай Глушкавічы Лельчыцкага раёна лічыцца ўнікальным, бо вызначаецца высокай якасцю каменю. Паводле навуковых звестак, запасы граніту на гэтым участку памежжа Беларусі і Украіны перавышаюць 270 мільёнаў метраў кубічных. У наступным годзе споўніцца сорак гадоў з часу стварэння на радовішчы завода па вытворчасці шчэбеню для дарожнай будоўлі.**

З прадпрыемствам з часу яго заснавання звязалі свой лёс многія жыхары вёскі Глушкавічы. Майстар участка распрацоўкі кар'ера Ігнат Лозка *(на фотаздымку)* мае за плячыма ўжо тры дзясяткі гадоў. На яго вачах і пры яго ўдзеле прадпрыемства дасягнула вялікіх аб'ёмаў здабычы граніту. Не так даўно на шчэбеневым заводзе адбылася мадэрнізацыя трэцяй тэхналагічнай лініі пярвічнага драблення каменю. Гэтае абнаўленне дазволіць павялічыць аб'ёмы вытворчасці шчэбеню рознай фракцыі на 200 тысяч кубаметраў за год, а прадпрыемству «Глушкавічы» — выйсці на мільённыя штогадовыя аб'ёмы.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**



■ Ну і ну!

## У крамах падмяняла... мабільнікі

**Супрацоўнікі аддзела крымінальнага вышуку Партызанскага РУУС сталіцы вышукваюць жанчыну, якая шляхам махлярства змагла завалодаць прыкладна дзясяткам мабільных тэлефонаў.**

Перад паходам у краму зламысніца загадзя прадумвала план дзеянняў, таму на месцы ўжо дакладна ведала, што рабіць. Яна падыходзіла да прадаўца-кансультанта і прасіла паказаць ёй пэўную мадэль тэлефона. Затым, зрабіўшы выгляд, што вывучае мадэль, жанчына падмяняла фірменны апарат на копію. Знешне адрозненні заўважыць было складана. Між тым кошт арыгінала складаў каля 7 мільёнаў рублёў, а падробка каштавала ўсяго мільён. Такім чынам, за месяц зламысніца змагла наведаць каля дзясятка крам і падмяніць столькі ж тэлефонаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**




### ДЗЕ ЛЯЖАЦЬ СЯКЕРЫ

Гэтую праўдзівую гісторыю з задавальненнем і неаднойчы расказвала мая знаёмая настаўніца. Родам яна з Навагрудчыны, з вёскі, у ваколіцах якой у мінулым стагоддзі было некалькі хутароў.

Дык вось, у далёкія ўжо 70-я гады адзін з іх, наводшыбе, з нейкай прычыны апусцеў, сядзіба прадавалася, і купіў яе нестары заезджы расіянін.

Вёску гэта нікольki не здзівіла, тым больш што навасёл стаў пакрысе абжывацца: садзіць малады садок, разводзіць пчол, ствараць сям'ю... А працаваць ён уладкаваўся ў краму. Хоць гэта, апошняе, і не ўсім даспадобы прыйшлося — па той простай прычыне, што падобнага маруды ні ў вёсцы, ні ваколіцах спрадвеку не было! Уявіце: прыходзіць нехта ў краму, падае торбачку, просіць: «Мне пяць кіль цукру». Прадавец як быццам з дарагою душой (калі тавар у продажы ёсць) бярэцца ўзважваць (тады ж у мяхах усё ў крамы прывозілі)... Паварочваецца ў адзін бок (на нешта пазірае), потым — у другі, бярэ ўрэшце шуфлік, зачэрпвае таго цукру, па лыжцы, можна сказаць, падсыпае, важыць... Глядзіш — пакуль зробіць гэта, пакуль грошы возьме ды рэшту адлічыць, з паўгадзіны часу прайшло. А калі не толькі цукар трэба, ды яшчэ і чарга...

Што самае крыўднае, гандляра таго марна было падганяць (гэты чалавек ніколі нікуды не спяшаўся), яму марна было рабіць заўвагі. А жартаў ён наогул не разумеў...

Хоць героем іх аднойчы стаў.

Неяк на зыходзе лета сышліся вяскоўцы да калгаснага свірна: трэба было збожжа перасушваць. Работа гэта досыць гарачая, так што шчыруе грамада, лапаціць, часу не мае нават пот з твараў выцерці...

Але ж нехта разагнуўся-такі, згледзеў (і іншым паказаў): з-за кустоў знаёмая постаць «выплывае» — крамнік, уласнай персонай. Спакваля набліжаецца — да свірна, да калгаснікаў.

— Ідзі дамоў, — спакойна загадвае жонцы сваёй.

— З чаго б гэта? — здзіўляецца яна.

— Ды там парасё, — зноў жа спакойна прамаўляе муж, — галаву ў брамку ўсунула... Яшчэ з раніцы... Пішчыць, аж двор разносіцца... Задушыцца можа...

— Дык а ты што, — кідаючы працу, абурылася жонка, — вызваліць яго не мог?

— Не, — кажа ў адказ мужык. — Я ж не ведаю, дзе сякера ляжыць...

«От прыдурак!», «Во які гаспадар!», «Ну і «пашчасціла» бабе!», — здзівілася, загаманіла талака. Але ціхенька-ціха, не ўголас, бо гэта ж гаспадыні ўжо і след прастыў (да хутара, відаць, падбягала), а гаспадар зусім блізка быў — ён яшчэ толькі павярнуўся, каб дадому пайсці.

...Дык, можа, яно і нядрэнна было б, каб сякеры ўсюды ў адным месцы ляжалі? Напрыклад — пад лаўкамі?

**Ірына Ермаковіч,**
*в. Азяраўцы, Браслаўскі раён*

### КАБ ВОСЬ ГЭТАК НІХТО НЕ ХАДЗІЎ

Гісторыя, якую хачу расказаць, адбылася даўно, у тыя часы, калі ў вёсках амаль усё рабілі ўручную, калі бедныя калгасніцы, можна сказаць, не разгіналіся. Ну вось, напрыклад: справіліся яны з першай праполкай, следам падступала другая, за ёю — сенакос, потым лён, жніво. Думаю, што многія пенсіянеркі са стажам яшчэ і цяпер халадзеюць душой пры адным толькі слове дзялка... Бо ў іх жа тады аніхто не пытаўся, ці хочуць яны браць надзелы, ці могуць, ці здаровіцца ім, ці справяцца? Шчодрай рукой адмервалі, убівалі ў зямлю калок ці дошчачку з прозвішчам і ўсё: твая паласа — твой клопат. А значыць, хоць трупам там ляж, а прапалі, прарві, сажні.

І жалі...

Праўда, была ў нас адна кабета. Звалі яе Агатай. Як пачула яна, што збажына паспела, што трэба жаць — узяла свой сярпок і разам з іншымі вяскоўкамі рушыла глядзець. Бачыць — пашчасціла ёй: дзялка якраз каля дуба. «Так, — прыкінула, — заўтра сажну да дрэва, паслязаўтра — за ім, у сераду зайду з таго канца, а сёння...»

Можа, дзень дужа добры быў, можа, дуб той нейкі чароўны, ці жанчына дужа стамілася, але ж захацелася ёй трохі паляжаць, адпачыць гадзіну-другую.

Прылягла, бедная — добранька паспала... Потым разам з іншымі жнеямі з'ела падвячорак, трошкі папрацавала і пайшла дамоў.

На наступны дзень надвор'е, мусіць, таксама нядрэннае было. І дуб той нікуды не дзеўся — пад шаты яе заманіў. Жанчына зноўку прылягла...

І так дзень пры дні, аж пакуль мужык яе не задумаўся, што ж гэта за ліха такое: усе жанкі ў вёсцы свае дзялкі пажалі, на ўласныя соткі перайшлі, а яго «палавіна» аніяк ад дуба не адыдзе.

Карацей, неяк пасля абеду ён таксама ў поле пайшоў. Дрэва тое яшчэ здалёку ўбачыў, потым — нязжатую паласу. А нарэшце — і жнейку сваю: спіць пад дубам як пшаніцу прадаўшы!

Зазлаваў мужчына — з той роспачы абстрыг гультайцы валасы.

Яна і брывом не павяла, не прачнулася!

Яшчэ больш разышоўся мужык — сукенку ёй амаль да пояса адрэзаў і сам дахаты пайшоў...

А «жнейка» тая аж да вечара праспала! Потым прачнулася — цоп сябе за галаву: нешта незнаёмае... «Я не я, — кажа, — і каса не мая». Потым зірк на ногі: «Тая ж Агата, ды сукенка да пупа адцята...». А бялізну ж тады мала хто насіў.

Прыйшлося беднай упоцемках дадому ісці.

...Бачыла гэта вёска ці не, гісторыя замоўчвае. А вось імя гультайкі ў ёй засталося, бо пра ўсіх, хто як быццам бы нешта робіць (хоць вынікаў, можа, і нуль), у нас па-ранейшаму кажуць: «Ходзіць на працу, як Агата па дуб».

**Сяргей Ярмольчык,**
*в. Багданаўка, Лунінецкі раён*

### СМАК БЕЛАРУСКАЙ БУЛЬБЫ

...На пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя мой муж працаваў ляснічым. І, мусіць жа, нядрэнна, бо менавіта да яго неяк раз прыслалі ажно двух карэспандэнтаў: аднаго з Мінска, а другога — дык з самой Масквы! Не скажу — цікавыя былі мужчыны: распытвалі пра ўсё, знаёміліся з людзьмі, размаўлялі. Не без таго — потым пасядзелі ў садку (лясніцтва з усіх бакоў было акружана старым здзічэлым садам), не без таго — па парадзе ляснічага вечарам пад'ехалі да аднаго з лепшых леснікоў...

А начавалі потым у нас. З захапленнем расказвалі, як прыгожа жонка таго лесніка спявала беларускія народныя песні, як сам гаспадар па памяці чытаў вершы любімага Ясеніна...

Карацей, уражанняў у сталічных журналістаў было багата — і самых найлепшых! Назаўтра, каб, крый Бог, іх не сапсаваць, я стала шчыраваць на кухні: на сняданак гатавала ўсё самае-самае...

І, вядома ж, бульбу.

А кватэра ў нас была з так званай рускай печчу. Гэта пазней прыйшла мода «выкідваць» іх, будаваць асобныя кухні. А тады...

Быў увечары час — я расказала гасцям і нават паказала, якая гэта выгода! Ну сапраўды ж, ранкам паліш у печы, гатуеш снеданне і за адным скрыпам прыстаўляеш гаршчок-другі з варывам альбо тушэннем. У абед выцягваеш іх і адразу ж падаеш на стол — гарачае. Прычым не толькі сабе... Яшчэ ж і нейкаму цяляці-парасяці можна ежу зрабіць...

Госці ад такой рацыяналізацыі проста ў захапленні былі!

...І вось тая раніца ў дзень ад'езду. Мой сняданак ужо на стале. Вядома ж, з чарачкай, вядома ж, са скварачкай. І, вядома ж, з бульбай!..

Ядуць мае госцікі, аж за вушамі трашчыць! А ўжо хваляць...

— Вось гэта ежа — вясковая, сапраўдная! Аніякай хіміі, — прызнае госць з Мінска.

Маскоўскі таксама не маўчыць — ледзь не божыцца:

*— Никогда такой бульбы не ел! Да как приготовлена!.. В настоящей русской печи!.. Вкус — незабываемый!*

Што пасля гэтага заставалася мне? Толькі падстаўляць на стол, толькі падкладваць на талеркі ды ўсміхацца. Ну сапраўды, не казаць жа гасцям, што тую бульбу я гатавала... на газавай пліце. У печы — пабаялася: раптам дымком прыхопіць ці вугольчык які ў чыгун заляціць? У каструлі ж яно чысцей... Ды і надзейней — прынамсі, не пераварыцца.

...Артыкул, які маскоўскі госць надрукаваў потым у сваёй газеце, быў досыць вялікі і цікавы. Праўда, нашу вёску Хатынічы госць «пераняс» з Ганцавіцкага раёна ў іншы. Але ж гэта, можа, і не страшна? Гэта, можа, як мне тую бульбу — з печы на пліту?

**Ірына Руткоўская,**
*в. Хатынічы, Ганцавіцкі раён*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

■ Кватэрнае пытанне

# «ДЫК НЯЎЖО, УКЛАЎШЫ СТОЛЬКІ ГРОШАЙ, НАМ ЗНОЎКУ ПЛАЦІЦЬ?..»

## ЛІСТ...

*«Звязду» мы выпісваем і пастаянна чытаем ужо больш за 20 гадоў. А вось пішам — упершыню. Што прымусіла? Вестка пра тое, што ўсе заселеныя службовыя і спецыяльныя жылыя памяшканні, усе непрыватызаваныя кватэры будуць пераведзены ў фонд арэнднага жылля.*

*Атрымліваецца, што людзі як быццам не хочуць афармляць гэтую прыватызацыю. Але ці так гэта?*

*Наша сям'я жыве ў так званай калгаснай кватэры з 1991 года. За гэты час гаспадарка мяняла «званні» — то была адкрытым акцыянерным таварыствам (ААТ), то цяпер стала сельскагаспадарчым вытворчым кааператывам (СВК). Жыллё гэтых прадпрыемстваў можна было афармляць ва ўласнасць, але не заўсёды — у пэўныя перыяды. Мы іх прапусцілі па дзвюх, вельмі ўважлівых прычынах: спачатку, у 1990-х гадах, было проста не да таго. Мяркуйце самі: дзеці малыя, заробкі яшчэ меншыя, да таго ж мой муж працаваў адзін...*

*Потым прыватызацыю прыпынілі (таму, маўляў, што асобныя калгаснікі, выкупіўшы жыллё, звальняліся). А гадоў праз 20 зноў дазволілі: у нас тады на агульным сходзе членаў СВК было прынята рашэнне прадаваць кватэры па рынячнай цане, якую вызначалі незалежныя эксперты, з выплатай на працягу 10 гадоў і першапачатковым унёскам у памеры 10% ад агульнага кошту...*

*Наша кватэра ацэньвалася прыкладна ў 30 млн рублёў. Па тым часе — велізарныя грошы! Ды што там — для нашай сям'і невырашальнай праблемай сталі б нават 10% ад гэтай сумы, бо мы тады вучылі дваіх студэнтаў (каб дапамагчы дзецям, я, апроч асноўнай працы, яшчэ кароў даіць хадзіла)...*

*Цяпер ужо іншая рэч. І добра, што для ўсіх, хто, як мы, не здолеў, хто не паспеў, але хацеў бы прыватызаваць сваё жыллё, «адпушчаны» пэўны час. Ён пайшоў. І я са сваёй праблемай звярнулася ў дырэкцыю ААТ.*

*У адказ пачула, што ў гаспадарцы, маўляў, няма грошай на правядзенне ацэначнага кошту кватэры, на выраб тэхнічнага пашпарта...*

*Але ж гэтыя дакументы на наш дом ёсць, таму што тры кватэры з чатырох ва ўласнасць ужо афармлены. Да таго ж дзесяць гадоў таму ў так званыя калгасныя дамы мы, жыльцы, за свой кошт праводзілі прыродны газ. А значыць, былі зроблены і ўсе тэхнічныя пашпарты.*

*Акрамя таго, усе жыльцы (і мы таксама) у кватэрах за свой кошт рабілі не толькі касметычны рамонт, але і рамантавалі дах, мянялі дзверы, гнілыя вокны — на шклопакеты... Дык няўжо ж пасля гэтага, уклаўшы столькі сваіх грошай, мы павінны будзем плаціць арэндную плату?..*

*Нам кажуць, што калі дазволіць продаж кватэр, маладыя сем'і, выкупіўшы іх, могуць пакінуць сельгаспрадпрыемствы... Могуць, але ж не ўсе. Тыя, хто адпрацаваў там 20—30 гадоў, нікуды ўжо не пойдуць. Нават у пенсійным узросце яны будуць працаваць і дапамагаць роднаму прадпрыемству.*

*А яшчэ кажуць, каб прадаваць кватэры, было рашэнне агульнага сходу работнікаў СВК, каб прыпыніць продаж — рашэнне прыняў назіральны савет. Цяпер, каб вярнуць прыватызацыю, зноў трэба збіраць агульны сход, але рабіць гэта ніхто, падобна, і не думае.*

*Патлумачце, ці правільныя дзеянні кіраўніцтва ААТ? Ці будуць пераводзіцца ў фонд арэнднага жылля жылыя памяшканні сельскагаспадарчых арганізацый? Хто павінен прымаць рашэнні аб дазволе на продаж — сход ці назіральны савет?*

У.П., Мінская вобласць.

**P.S. Я наўмысна не пішу назву гаспадаркі, бо, па-першае, думаю, што не ў нас адных такое становішча. А па-другое, не хачу «разборак» з кіраўніцтвам. Наколькі ведаю, заяў на куплю кватэры ў нас больш за дзясятак.**

## ...І КАМЕНТАРЫЙ

Сапраўды, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 16 снежня 2013 г. № 563 «Аб некаторых пытаннях прававога рэгулявання жыллёвых адносін» (далей — Указ № 563) вызначана, што да 1 красавіка 2014 г. — службовыя жылыя памяшканні і да 1 ліпеня 2016 г. — непрыватызаваныя жылыя памяшканні, якія займаюцца грамадзянамі на ўмовах звычайнага дагавора найму жылых памяшканняў, павінны быць уключаны ў склад жылых памяшканняў камерцыйнага выкарыстання (так званае «арэнднае жыллё»). Гэтыя патрабаванні распаўсюджваюцца на названыя жылыя памяшканні, што знаходзяцца ў складзе дзяржаўнага жыллёвага фонду.

Разам з тым, паводле Указа № 563 жылыя памяшканні дзяржаўнага жыллёвага фонду могуць знаходзіцца і ў бязвыплатным карыстанні арганізацый недзяржаўнай формы ўласнасці, створаных падчас раздзяржаўлення і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці, пераўтварэння дзяржаўных унітарных прадпрыемстваў у адкрытыя акцыянерныя таварыствы, а таксама і ў іншых выпадках, вызначаных Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

У гэтым выпадку жылыя памяшканні былога калгаса, а потым ААТ і СВК, якія з'яўляюцца, па ўсім відаць, недзяржаўнай сельскагаспадарчай арганізацыяй, не будуць падлягаць пераводу ў «арэнднае жыллё», калі яны не адносяцца да дзяржаўнага жыллёвага фонду, а пабудаваны за кошт уласных сродкаў або з прыцягненнем дзяржаўнай падтрымкі (у прыватнасці, ільготнага крэдыту, атрыманага ў Белаграпрамбанку).

Такія жылыя памяшканні, у адпаведнасці з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 17 чэрвеня 2011 г. № 253 «Аб асобных пытаннях куплі-продажу жылых дамоў (кватэр) сельскагаспадарчых арганізацый» (далей — Указ № 253), могуць быць прададзены грамадзянам, якія пражываюць у іх, з улікам асаблівасцяў, вызначаных гэтым указам.

Што датычыцца рашэння аб дазволе продажу жылых памяшканняў недзяржаўнай сельскагаспадарчай арганізацыі грамадзянам, якія пражываюць у гэтых памяшканнях, то, згодна з п. 2 Указа № 253, продаж названых жылых памяшканняў ажыццяўляецца па рашэнні вышэйшага органа кіравання гаспадарчага таварыства, вытворчага кааператыва або ўласніка маёмасці прыватнага ўнітарнага прадпрыемства. *Вышэйшым органам кіравання гаспадарчага таварыства з'яўляецца агульны сход удзельнікаў гаспадарчага таварыства.*

Як вынікае з пісьма, рашэнне аб прыпыненні продажу жылых памяшканняў сельгасарганізацыі прынята назіральным саветам (трэба меркаваць, пры наяўнасці адпаведных паўнамоцтваў). Адпаведна (паколькі агульны сход не прымаў рашэнне аб спыненні продажу жылых памяшканняў) гэты савет можа прыняць і рашэнне аб адмене ранейшага свайго рашэння аб прыпыненні продажу жылых памяшканняў. Не выключаецца і варыянт прыняцця новага рашэння па гэтым пытанні агульным сходам.

**Віктар САВІЦКІ**

■

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЖИЛЫХ ПОМЕЩЕНИЙ ГОСУДАРСТВЕННОГО ЖИЛИЩНОГО ФОНДА в г. Бресте

| № лота | 1* | 2* | 3* | 4* | 5* | 6 |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Предмет аукциона | жилое помещение по ул. Короленко, д. 1, кв. 2 в г. Бресте, количество комнат – 1, общая площадь 29,3 кв.м | жилое помещение по ул. Железнодорожная, д. 17, кв. 7 в г. Бресте, количество комнат – 1, общая площадь 21,7 кв.м | жилое помещение по ул. Осипенко, д. 50/1, кв. 1 в г. Бресте, количество комнат – 2, общая площадь 22,1 кв.м | жилое помещение по ул. Пушкинская, д. 154, кв.1 в г. Бресте, количество комнат – 1, общая площадь 15,3 кв.м | жилое помещение по ул. Пушкинская, д. 75, кв. 5 в г. Бресте, количество комнат – 1, общая площадь 15,6 кв.м | жилое помещение по ул. Куйбышева, 38/1, кв. 26 в г. Бресте, количество комнат – 3, общая площадь 88,8 кв.м. |
| Начальная цена продажи предмета аукциона (руб.) | **130 214 000** | **126 546 000** | **154 056 000** | **127 463 000** | **98 119 000** | **774 516 000** |
| Сумма задатка (руб.) | 26 000 000 | 25 300 000 | 30 800 000 | 25 400 000 | 19 600 000 | 154 900 000 |
| Сумма штрафа (руб.) | 26 000 000 | 25 300 000 | 30 800 000 | 25 400 000 | 19 600 000 | 154 900 000 |
| Продавец | **КУП «ЖРЭУ г. Бреста», тел. (0162) 23-69-31** | | | | | |
| Организатор аукциона | **КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью»** | | | | | |

** – Повторные аукционные торги.*

**ПРИМЕЧАНИЕ:**

Лицо, желающее принять участие в аукционе, лично либо через своего представителя в установленный в извещении срок подает организатору аукциона заявление на участие в аукционе по форме, определенной Министерством жилищно-коммунального хозяйства, заверенную банком копию платежного поручения о перечислении денежных средств (задатка) на текущий (расчетный) счет организатора аукциона, а также заключает с организатором аукциона соглашение.

<u>К заявлению на участие в аукционе прилагаются:</u>

копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации юридического лица, их подлинники для последующего заверения копий организатором аукциона – для юридического лица, зарегистрированного в установленном порядке на территории Республики Беларусь;

легализованные в установленном порядке копии учредительных документов, выписка из торгового реестра страны происхождения (должна быть произведена не ранее чем за шесть месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский или русский язык – для юридического лица, не зарегистрированного в установленном порядке на территории Республики Беларусь.

<u>При подаче заявления на участие в аукционе и заключении соглашения организатору аукциона предъявляются:</u>

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность;

представителем физического лица – документ, удостоверяющий личность представителя, и нотариально заверенная доверенность;

представителем юридического лица (в том числе уполномоченным должностным лицом) – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица.

Сумма задатка перечисляется КУП «Брестский городской центр по управлению недвижимостью» на счет № 3012780360011 в филиале № 100 Брестское областное управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Брест, ул. Московская, 202, код банка 246, УНП 290433924.

Порядок оформления участия в аукционе и проведения торгов определяется Положением о порядке продажи жилых помещений государственного жилищного фонда на аукционе, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 17.11.2010 г. № 1695.

**Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона возместить организатору аукциона сумму, в счет возмещения фактических затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения, окончательный размер которых определяется до аукциона и фиксируется в соответствующих ведомостях ознакомления участников.**

Договор купли-продажи жилого помещения заключается в установленном порядке продавцом не позднее двух рабочих дней с момента внесения суммы затрат на организацию и проведение аукциона. Оплата стоимости приобретаемого жилого помещения производится в соответствии с заключаемым договором купли-продажи. Задаток, внесенный победителем аукциона, учитывается при окончательных расчетах за приобретаемое жилое помещение.

**Аукцион состоится 15 апреля 2014 года в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Энгельса, 3, каб. 607.**

**Заявки на участие в аукционе принимаются с 8.30 17.03.2014 г. до 17.30 9.04.2014 г. по адресу: г. Брест, ул. Ленина, 50. Контактные телефоны: 53-81-92, 53-45-65.**

**Сайт: bgcn.by, brest-region.gov.by**

# ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО УАКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ ДЛЯ СТРОИТЕЛЬСТВА И ОБСЛУЖИВАНИЯ ЖИЛЫХ ДОМОВ

## ОРГАНИЗАТОР: НОВОЗАРЯНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| № лота | Местоположение земельного участка, его площадь и кадастровый номер | Целевое назначение | Условия и ограничения | Расходы по подготовке и изготовлению документации, руб. | Начальная цена, руб. | Сумма залога, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | п. Набережный, ул. Набережная, 3У площадью 0,2120 га, кадастровый номер 225183308101000014 | Для строительства и обслуживания жилого дома | - Водоохранная зона и прибрежная полоса водного объекта (озеро Лукомльское); - охранная зона линии электропередачи напряжением до 1 000 В | 5 232 965 | 2 681 588 | 268 159 |
| 2 | д. Симновичи, ул. Озёрная, д. 8Б площадью 0,2476 га, кадастровый номер 225183310101000037 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона водного объекта (озеро Лукомльское) | 5 207 666 | 3 445 101 | 344 510 |
| 3 | д. Симновичи, ул. Озёрная, д. 22Б площадью 0,2499 га, кадастровый номер 225183310101000036 | Для строительства и обслуживания жилого дома | Водоохранная зона водного объекта (озеро Лукомльское) | 5 232 965 | 3 160 985 | 316 099 |

1. **Аукцион состоится 22 апреля 2014 года в $15^{00}$ по адресу: аг. Новая Заря, сельисполком.**

2. **Заявление от граждан Республики Беларусь на участие в торгах принимаются по рабочим дням с $8^{00}$ до $13^{00}$ и с $14^{00}$ до $17^{00}$ по адресу: аг. Новая Заря, сельисполком. Последний день приема заявлений – 17 апреля 2014 года до $17^{00}$.**

3. Для участия в аукционе необходимо предоставить копию паспорта гражданина (без нотариального засвидетельствования); представителем гражданина – нотариально удостоверенную доверенность, а также копию паспорта доверенного лица; копию платежного документа, подтверждающего уплату залога на расчетный счет 3641329060024 ОАО «Белагропромбанк» – Витебское областное управление РКЦ № 10, МФО 150801424, УНП 300986744, код платежа 04002, получатель – Новозарянский сельский исполнительный комитет.

4. Аукцион состоится при наличии не менее двух участников.

5. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с документами и земельными участками в натуре.

**Контактные телефоны: (8 02133) 2 64 45, 2 64 35.**

■ Ёсць меркаванне

# ДАЙЦЕ ШАНЦ МАЛАДЫМ

**...Памочнік Прэзідэнта Кірыл Руды слушна заўважыў, што зараз трэба рабіць «стаўку» на адукацыю, на прыцягненне на кіруючыя пасады маладых спецыялістаў з-за мяжы.**

А можна ж і не толькі... Праўда, пасады збольшага занятыя — кіраўнікамі пенсійнага ўзросту.

Па інфармацыі начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны насельніцтва Ларысы Яшковай, у Беларусі 23,4% пенсіянераў працягваюць працаваць. Колькі з іх займаюць кіруючыя пасады, на жаль, невядома. Затое інтэрнэт дае іншую лічбу: сярод беспрацоўных у 2012 годзе (за мінулы год звестак у сеціве няма) кожны трэці быў ва ўзросце ад 20 да 29 гадоў. І, напэўна ж, не таму, што не хацеў працаваць. Проста няма вакансій — добрыя пасады занятая, у тым ліку і пенсіянерамі.

Не падумайце дрэннага — да людзей сталага веку я стаўлюся добра і шчыра ім зычу здароўя. Але ж, пагадзіцеся, большасць з іх, тых, што, нягледзячы на ўзрост, працягваюць кіраваць прадпрыемствамі, арганізацыямі, установамі — людзі іншай эпохі і светаўспрымання. Ведаю, прынамсі, кіраўніка-пенсіянера, які ў кабінеце прынцыпова не ставіць камп'ютар. Кажа: «Навошта?»

Рытарычнае пытанне: ці шмат пажылых кіраўнікоў хочуць ускладняць сабе жыццё, мяняць старыя падыходы на новыя?

Зноў жа навошта, калі адбыў дзень да вечара, а там хоць патоп. Падпішуць кантракт — папрацую яшчэ, не падпішуць — выйду на пенсію...

Два варыянты. А чаму б не скарыстацца трэцім, чаму б аксакалам, людзям пенсійнага ўзросту з багатым працоўным досведам, не перасесці з крэслаў кіраўнікоў у крэслы намеснікаў, памочнікаў, кансультантаў? І пры гэтым даць шанц маладым, каб заявіць пра сябе, каб праверыць сілы, каб адбыцца?

Дык чаму б не зрабіць эксперымент? Чаму б не замяніць (ну хоць бы ў адным невялікім гарадку) пенсіянераў, вынікі работы якіх выклікаюць пытанні, на моладзь, якая мае адукацыю, якая можа па-сучаснаму думаць і дзейнічаць. Іх што, у Беларусі бракуе? Я думаю, што гэта не так.

**Аляксандр СЕНЮЦЬ.**

*(Дарэчы, працай сваёй я вельмі задаволены. Можа, таму, што кіраўніцтва якраз маладое? Але ж так шанцуе не ўсім.)*


*Уважаемые акционеры ОАСО «БАГАЧ»!*

**Открытое акционерное страховое общество «БАГАЧ»**

(г. Минск, ул. Лынькова, 19, корп. 1)

**СООБЩАЕТ, что 27 марта 2014 года**
**ПРОВОДИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

**1.** Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2013 год и задачах на 2014 год.
**2.** О заключении Ревизионной комиссии Общества по годовому отчету за 2013 год.
**3.** Об утверждении годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2013 год.
**4.** Об избрании членов Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
**5.** Об избрании генерального директора.
**6.** Об утверждении Положения об использовании прибыли.
**7.** О выплате дивидендов.
**8.** О выплате вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.

Начало работы собрания 27 марта 2014 года в 12.00.

Место проведения собрания: г. Минск, ул. Лынькова, 19, корп. 1.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании акционеров, составлен на основании реестра владельцев акций, сформированного по состоянию на 15 марта 2014 года.

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Лынькова, 19, корп. 1, начиная с 17 марта 2014 года с 11.00 до 16.00 либо 27 марта 2014 года с 9.00.

Регистрация участников собрания с 10.00 до 11.30 по месту проведения собрания.

<u>Для регистрации при себе иметь следующие документы:</u>

- акционеру Общества — паспорт;
- представителю акционера — паспорт и доверенность, оформленную в установленном порядке.

УНП 100687009



# ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ

**ПО ОБЪЕКТУ**

**«Строительство двух 19-этажных многоквартирных жилых домов со встроенными объектами торгово-общественного назначения в квартале улиц Ржавецкая – ул. Проектируемая № 1 – Проектируемая № 2 в жилом районе Лебяжий»,**
*опубликованную в газете «Звязда» 13.02.2013 года.*

**Застройщик**: Общество с дополнительной ответственностью «Айрон», зарегистрировано Минским горисполкомом решением от 30 ноября 2000 г. № 1397 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 100070331.

Юридический и почтовый адрес: Республика Беларусь, 220020, г. Минск, проспект Победителей, дом 89, корпус 2, помещение 10, каб. 18, 41.

**Тел. 8 (017) 216 00 09.**

**Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства предлагаются для граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, юридических лиц помещения торгово-общественного назначения в жилом доме № 2 по генплану:**

При 100% оплате стоимости помещения в течение 5 календарных дней с даты подписания договора долевого строительства стоимость **1 м² 2000 долларов США.**

При оплате в рассрочку стоимость **1 м² 2150 долларов США.**

По соглашению сторон оплата за объект долевого строительства производится дольщиком поэтапно в соответствии с графиком платежей. По соглашению сторон дольщику может быть предоставлена скидка. УНП 100070331



Приорбанк RZB Group

**«ПРИОРБАНК» Открытое акционерное общество, 220002, г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А, извещает своих акционеров, что 26 марта 2014 года в 10.00 состоится очередное Общее Собрание акционеров банка**

Собрание состоится в г. Минске по адресу: пр. Победителей, 59, бизнес-центр гостиницы «Виктория».

Орган, созывающий собрание акционеров – Наблюдательный совет «Приорбанк» ОАО.

Лица, имеющие право на участие в Собрании, имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, за 5 дней до начала Собрания в Центральном офисе «Приорбанк» ОАО, по адресу г. Минск, ул. В. Хоружей, 31А.

Регистрация участников будет осуществляться с 8.45 до 9.45.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Собрании, осуществляется при предъявлении ими документов, подтверждающих их личность и полномочия, путем внесения сведений об участнике в автоматизированную информационную систему регистрации участников Собрания и составления списка лиц, зарегистрировавшихся для участия в Собрании, содержащего подписи этих лиц.

При регистрации акционеры предъявляют документ, удостоверяющий личность; представители акционеров предъявляют документ, удостоверяющий личность, и подтверждают свои полномочия надлежащим образом оформленной доверенностью (руководители юридических лиц – акционеров – документом, подтверждающим служебное положение).

**Повестка дня Собрания:**

1. Отчет Наблюдательного Совета банка за 2013 год
2. Отчет Правления о работе банка за 2013 год
3. Рассмотрение заключения Ревизионной комиссии по результатам проведения ревизии за 2013 год. Утверждение годового отчета за 2013 год: баланс банка, отчет о прибыли и убытках, отчет об изменении капитала и отчет о движении денежных средств; распределение прибыли за 2013 год с учетом заключения Ревизионной комиссии и аудиторского заключения
4. Перенос сумм фонда переоценки
5. Установление размера дивидендов и срока их выплаты
6. Внесение изменений в Устав «Приорбанк» ОАО
7. Определение размера вознаграждений и компенсации расходов членам Наблюдательного Совета, Ревизионной комиссии за исполнение ими своих обязанностей
8. Избрание членов Ревизионной комиссии «Приорбанк» ОАО
9. Избрание членов Наблюдательного Совета «Приорбанк» ОАО

Наблюдательный Совет, Правление «Приорбанк» ОАО.

*Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 12 от 06.05.2013 года. УНП 100220190.*


# ЧПТУП «Пчелаут и М» ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже недвижимого имущества, принадлежащего ЧПТУП «Пчелаут и М» со снижением цены на 85%

| № лота | Наименование имущества | Начальная цена лота, без НДС, руб. | Задаток в размере 10%, без НДС, руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| 1 | **Здание детского сада с инв. № 310/С-22236 общей площадью 1059,0 кв.м, расположенного по адресу: Гомельская область, Гомельский р-н, Долголесский с/с, д. Долголесье, ул. Центральная, 58 а, расположенное на земельном участке, площадью 0,6486 га** | 103 455 900 | 10 345 590 |

Организатор торгов: управляющий в деле о банкротстве ООО «Диспонент»: г. Гомель, ул. Молодости, 5.

Продавец: ЧПТУП «Пчелаут и М», 246050, г. Гомель, ул. 2-я Революционная, 8.

*Задаток перечисляется до 28.03.2014 г. (включительно) на р/с № 3012540284017 в ЦКО № 2 дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, г. Гомель, МФО 153001739, УНП 490556767.*

Условия продажи – без условий.

Шаг аукциона в размере 5% (5 172 795 рублей) от начальной цены.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление установленной формы (подробности по тел.) с приложением: копии платежного поручения о внесении суммы задатка, для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лиц – копия паспорта либо иного документа, удостоверяющего личность.

Срок подачи заявления: с момента выхода настоящего объявления **до 16.00 28.03.2014 года по адресу: г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

Дата, время, место проведения открытого аукциона: **31.03.2014 года в 10.00, г. Гомель, ул. Молодости, 5.**

**По вопросам участия в аукционе и приобретения имущества должника обращаться по телефонам: 8-044-767-88-05, тел.факс 8-0232-68-25-50.**

**Дополнительная информация содержится на сайте www.disponent.by**

# ОБЪЯВЛЕНИЕ О ТОРГАХ

**Наименование (описание) имущества и его стоимость**

Лот № 1. Колонна 2КН 04.28-1,8*-13, в кол-ве 1 шт, стоимостью 13 791 000 бел. рублей;
Лот № 2. Колонна 2КН 04.28-2,8*-7, в кол-ве 1 шт, стоимостью 13 921 550 бел. рублей;
Лот № 3. Колонна 2КНД 4.28-1,8*-16А, в кол-ве 2 шт, стоимостью 11 276 800 бел. рублей;
Лот № 4. Колонна 2КНО 4.28-2,8*-11А, в кол-ве 1 шт, стоимостью 6 315 050 бел. рублей;
Лот № 5. Колонна 2КНО 4.28-1,8*-11, в кол-ве 1 шт, стоимостью 9 283 100 бел. рублей;
Лот № 6. Колонна 3КСД 4.28-2,4*-28Б, в кол-ве 2 шт, стоимостью 31 065 200 бел. рублей;
Лот № 7. 3КСО 4.28-1,4-45А, в кол-ве 3 шт, стоимостью 23 217 000 бел. рублей;
Лот № 8. Колонна 2КНО 4.28-2.8*-15, в кол-ве 1 шт, стоимостью 12 211 250 бел. рублей;
Лот № 9. Колонна 3КСО 4.28-2,4*-29Б, в кол-ве 2 шт, стоимостью 33 433 350 бел. рублей;
Лот № 10. Колонна 3КСД 4.28-1,4-42Г, в кол-ве 1 шт, стоимостью 6 210 900 бел. рублей;
Лот № 11. Колонна 2КНО 4.28-1,8*-15, в кол-ве 1 шт, стоимостью 8 748 850 бел. рублей;
Лот № 12. Колонна 2КНД 4.28-2,8*-12, в кол-ве 1 шт, стоимостью 6 764 200 бел. рублей;
Лот № 13. Колонна 2КНД 4.28.5*14, в кол-ве 1 шт, стоимостью 9 318 300 бел. рублей;
Лот № 14. Колонна 2 КНО 4.28-1,2-21, в кол-ве 5 шт, стоимостью 17 304 900 бел. рублей;
Лот № 15. Колонна 2КНО 4.28-1,5*-3, в кол-ве 1 шт, стоимостью 9 494 750 бел. рублей;
Лот № 16. Колонна 2 КНД 4,28-2,8*-6, в кол-ве 1 шт, стоимостью 6 995 250 бел. рублей;
Лот № 17. Колонна К16А (2 КНД 4,28-1,8*-16А), в кол-ве 1 шт, стоимостью 5 638 400 бел. рублей;
Лот № 18. Колонна 2 КНД 4.28-1,8*-86, в кол-ве 2 шт, стоимостью 17 670 100 бел. рублей;
Лот № 19. Колонна 2КНД 4,28-1,8*-16, в кол-ве 1 шт, стоимостью 7 450 050 бел. рублей;
Лот № 20. Колонна 2КНО 4.28-1,5-5, в кол-ве 2 шт, стоимостью 9 962 100 бел. рублей;
Лот № 21. Колонна 2КНО 4,28-1,2-1А, в кол-ве 1 шт, стоимостью 4 252 600 бел. рублей;
Лот № 22. Колонна 2КНО 4,28-1,8-22, в кол-ве 2 шт, стоимостью 13 173 650 бел. рублей;
Лот № 23. Колонна 2КН 4,28-2-10, в кол-ве 1 шт, стоимостью 4 473 850 бел. рублей;
Лот № 24. Колонна 2КНД 4,28-1,4-16Б, в кол-ве 1 шт, стоимостью 4 475 350 бел. рублей;
Лот № 25. Колонна 2КНД 4,28-1,4*86А, в кол-ве 1 шт, стоимостью 5 825 600 бел. рублей;
Лот № 26. Колонна 2КНО 4,28-1,5*-5А, в кол-ве 1 шт, стоимостью 4 745 900 бел. рублей;
Лот № 27. Колонна 2КН 4,28-2-4, в кол-ве 1 шт, стоимостью 3 142 650 бел. рублей;
Лот № 28. Колонна 2КНД 4,28-1,8-2А, в кол-ве 1 шт, стоимостью 6 761 450 бел. рублей;
Лот № 29. Колонна 2КНД 4,28-2,8*12-1, в кол-ве 1 шт, стоимостью 6 764 200 бел. рублей;
Лот № 30. Колонна К11 Б-3 (2КНО 4,28-1,8*-11), в кол-ве 1 шт, стоимостью 9 283 100 бел. рублей;
Лот № 31. Колонна 2КНО 4,28-1,8*-8, в кол-ве 1 шт, стоимостью14 669 700 бел. рублей;
Лот № 32. Колонна 3 КС 4.28-1-26, в кол-ве 1 шт, стоимостью 6 883 900 бел. рублей;
Лот № 33. Колонна 3КСО 4.28-1.4*-38Б, в кол-ве 2 шт, стоимостью 25 233 600 бел. рублей;
Лот № 34. Колонна 3КСО 4.28-1,1-44, в кол-ве 4 шт, стоимостью 25 438 250 бел. рублей;
Лот № 35. Колонна 3КС 4.28-1-32, в кол-ве 2 шт, стоимостью 14 822 800 бел. рублей;
Лот № 36. Колонна 3КСО 4.28-1,4*30Б, в кол-ве 2 шт, стоимостью 24 637 200 бел. рублей;
Лот № 37. Колонна 3КС 4.28-2*-39А, в кол-ве 2 шт, стоимостью 14 867 050 бел. рублей;
Лот № 38. Колонна 3КСО 4.28-1,4*-35Б, в кол-ве 2 шт, стоимостью 22 682 250 бел. рублей;
Лот № 39. Колонна 3КСД 4.28-1,4*-37В, в кол-ве 2 шт, стоимостью 22 697 600 бел. рублей;
Лот № 40. Колонна 3КСД 4.28-1,4-37Г, в кол-ве 1 шт, стоимостью 11 348 800 бел. рублей;
Лот № 41. Колонна 3КСД 4.28-1,4*-42Б, в кол-ве 2 шт, стоимостью 12 421 850 бел. рублей;
Лот № 42. Колонна 3КСД 4.28-1.4*-37Б, в кол-ве 2 шт, стоимостью 22 697 600 бел. рублей;
Лот № 43. Колонна 3КСД 4,28-2,4*-34Б, в кол-ве 2 шт, стоимостью 29 741 800 бел. рублей;
Лот № 44. Колонна 3КСД 4.28-2.4*-28Б, в кол-ве 1 шт, стоимостью 15 532 600 бел. рублей;
Лот № 45. Колонна 3КСО 4.28-2,4*-33А, в кол-ве 2 шт, стоимостью 29 741 800 бел. рублей;
Лот № 46. Колонна 3КСО 4.28-1,3-41Б, в кол-ве 2 шт, стоимостью 15 372 900 бел. рублей;
Лот № 47. Колонна 3КСО 4.28-1,4*33Б, в кол-ве 1 шт, стоимостью 7 269 750 бел. рублей;
Лот № 48. Колонна 3КСО 4.28-1,1-23, в кол-ве 2 шт, стоимостью13 897 600 бел. рублей;
Лот № 49. Колонна 3КСО 4.28-1,3-23Б, в кол-ве 1 шт, стоимостью 6 948 800 бел. рублей;
Лот № 50. Колонна 3КСО 4.28-1,3-25Б, в кол-ве 1 шт, стоимостью 8 270 050 бел. рублей;
Лот № 51. Колонна 3КСД 4.28-1,4*-24Б, в кол-ве 1 шт, стоимостью7 026 600 бел. рублей;
Лот № 52. Колонна 3КСО 4.28-1,3-27Б, в кол-ве 2 шт, стоимостью 14 556 350 бел. рублей;
Лот № 53. Колонна 2КНО 4,28-1,5-18, в кол-ве 1 шт, стоимостью 3 468 050 бел. рублей;
Лот № 54. Колонна 2КН 4,28-5*-14, в кол-ве 1 шт, стоимостью 5 242 800 бел. рублей;
Лот № 55. Колонна 2КНО 4,28-1,8-22 в кол-ве 1 шт, стоимостью 6 586 850 бел. рублей;
Лот № 56. Колонна К21 2 КНО 4.28-1.2-21, в кол-ве 1 шт, стоимостью 3 508 500 бел. рублей;
Лот № 57. Колонна ПАГ 14-1 плита дорожная, в кол-ве 4 шт, стоимостью 12 892 550 бел. рублей;
Лот № 58. Ригель Р-5 РДП 4.56-70 А 111, в кол-ве 3 шт, стоимостью 11 490 750 бел. рублей;
Лот № 59. Ригель Р-1 РОП 4.56-60, в кол-ве 3 шт, стоимостью 10 307 800 бел. рублей;
Лот № 60. Ригель РДП 4.56.70, в кол-ве 8 шт, стоимостью 30 642 000 бел. рублей;
Лот № 61. Ригель РОП 4.56.60, в кол-ве 3 шт, стоимостью 10 307 800 бел. рублей;
Лот № 62. Ригель Р4 РОП 4.68-30, в кол-ве 4 шт, стоимостью 17 609 150 бел. рублей;
Лот № 63. Ригель Р3 РДП 4.56-110 А 111, в кол-ве 2 шт, стоимостью 9 839 500 бел. рублей;
Лот № 64. Ригель Р13 РОП 4.26-60, в кол-ве 4 шт, стоимостью 6 721 800 бел. рублей;
Лот № 65. Ригель РДП 4.56.90, в кол-ве 5 шт, стоимостью 22 555 550 бел. рублей;
Лот № 66. Ригель РДП4.56-90, в кол-ве 1 шт, стоимостью 4 511 100 бел. рублей;
Лот № 67. Ригель РОП 4.56.60 Р-1, в кол-ве 2 шт, стоимостью 6 871 850 бел. рублей;
Лот № 68. Ригель РОП 4.56.60, в кол-ве 1 шт, стоимостью 3 435 950 бел. рублей;
Лот № 69. Ригель РДП 4.56-110, в кол-ве 1 шт, стоимостью 4 919 750 бел. рублей;
Лот № 70. Ригель Р2 РДП 4.56-60 А 111, в кол-ве 1 шт, стоимостью 3 767 750 бел. рублей;
Лот № 71. Ригель Р9 РОП 4.56-40 в кол-ве 5 шт, стоимостью16 207 300 бел. рублей;
Лот № 72. Ригель Р8 РДП 4.26-110-8 в кол-ве 2 шт, стоимостью 3 279 000 бел. рублей;
Лот № 73. Ригель РОП 4.56.60 Р1 в кол-ве 1 шт, стоимостью 3 435 950 бел. рублей;
Лот № 74. Ригель РДП 4.56.60 Р2 в кол-ве 1 шт, стоимостью 3 767 750 бел. рублей;
Лот № 75. Ригель РДП 4.56.90, в кол-ве 3 шт, стоимостью13 533 350 бел. рублей;
Лот № 76. Ригель РДП 4.56.60, в кол-ве 2 шт, стоимостью 7 535 450 бел. рублей;
Лот № 77. Стакан Ф1 2Ф12.9-2, в кол-ве 3 шт, стоимостью 5 628 650 бел. рублей;
Лот № 78. Балка фундаментная 4 БФ 40.2, в кол-ве шт, стоимостью 8 154 400 бел. рублей;
Лот № 79. Балка фундаментная БФ 45.2, в кол-ве 1 шт, стоимостью 1 536 250 бел. рублей;
Лот № 80. Блок фундаментный ФБС 24.4.6, в кол-ве 31 шт, стоимостью 14 844 900 бел. рублей;
Лот № 81. Блок фундаментный ФБС 24.5.6, в кол-ве 20 шт, стоимостью 11 976 100 бел. рублей;
Лот № 82. Блок фундаментный ФБС 9.3.6, в кол-ве 32 шт, стоимостью 4 120 200 бел. рублей;
Лот № 83. Блок фундаментный ФБС 12.5.6, в кол-ве 1 шт, стоимостью 291 900 бел. рублей;
Лот № 84. Блок фундаментный ФБС 24.5.6, в кол-ве шт, стоимостью 3 592 850 бел. рублей;
Лот № 85. Блок фундаментный ФБС 12.6.6, в кол-ве 1 шт, стоимостью 351 000 бел. рублей;
Лот № 86. Блок фундаментный ФБС 24.6.6, в кол-ве 16 шт, стоимостью 11 499 900 бел. рублей;
Лот № 87. Блок фундаментный ФБС 9.6.6, в кол-ве шт, стоимостью 1 550 350 бел. рублей;
Лот № 88. Блок фундаментный ФБС 12.5.6, в кол-ве 1 шт, стоимостью 291 900 бел. рублей;
Лот № 89. Блок фундаментный ФБС 12.4.6, в кол-ве 41 шт, стоимостью 9 581 800 бел. рублей;
Лот № 90. Блок фундаментный ФБС 9.4.6, в кол-ве 2 шт, стоимостью 343 950 бел. рублей;
Лот № 91. Блок фундаментный ФБС 12.5.3, в кол-ве шт, стоимостью 841 350 бел. рублей;
Лот № 92. Блок фундаментный ФБС 12.5.6, в кол-ве 7 шт, стоимостью 2 043 350 бел. рублей;
Лот № 93. Блок фундаментный ФБС 12.4.3, в кол-ве 81 шт, стоимостью 9 072 000 бел. рублей;
Лот № 94. Блок фундаментный ФБС 24.4.6, в кол-ве 36 шт, стоимостью 17 239 250 бел. рублей;
Лот № 95. Блок фундаментный Ф.Л 12.24.3, в кол-ве 1 шт, стоимостью 709 850 бел. рублей;
Лот № 96. Блок фундаментный Ф.Л 16.12.4, в кол-ве 2 шт, стоимостью 1 065 150 бел. рублей;
Лот № 97. Блок фундаментный Ф.Л 16.12.3, в кол-ве 1 шт, стоимостью 490 850 бел. рублей;
Лот № 98. Блок фундаментный Ф.Л 20.12.4, в кол-ве 2 шт, стоимостью 1 843 200 бел. рублей;
Лот № 99. Блок фундаментный Ф.Л 22.24.3, в кол-ве 1 шт, стоимостью 207 600 бел. рублей;
Лот № 100. Блок фундаментный ФБС 24.5.6, в кол-ве 15 шт, стоимостью 8 982 050 бел. рублей;
Лот № 101. Блок фундаментный 2D 30.28 диафрагма, в кол-ве 1 шт, стоимостью 5 949 850 бел. рублей;
Лот № 102. Блок фундаментный ФБС 9.3.6, в кол-ве 17 шт, стоимостью 2 188 850 бел. рублей;
Лот № 103. Блок фундаментный ФБС 12.3.6, в кол-ве 23 шт, стоимостью 4 117 550 бел. рублей;
Лот № 104. Блок фундаментный ФБС 9.4.6, в кол-ве 44 шт, стоимостью 7 566 650 бел. рублей;
Лот № 105. Блок фундаментный ФБС 12.4.6, в кол-ве 2 шт, стоимостью 467 400 бел. рублей;
Лот № 106. Блок фундаментный ФБС 12.6.6, в кол-ве 16 шт, стоимостью 5 615 900 бел. рублей;
Лот № 107. Блок фундаментный ФБС 9.6.6, в кол-ве 3 шт, стоимостью 775 200 бел. рублей;
Лот № 108. Блок фундаментный 1D26.42 диафрагма, в кол-ве 2 шт, стоимостью 9 935 050 бел. рублей;
Лот № 109. Блок фундаментный 1 D 30-2,8 диафрагма, в кол-ве 2 шт, стоимостью 10 633 300 бел. рублей;
Лот № 110. Блок фундаментный 2 D 26-28 диафрагма, в кол-ве 1 шт, стоимостью 3 772 050 бел. рублей;
Лот № 111. Лестничный марш ЛМП- 57 11.14.5 марш, в кол-ве 9 шт, стоимостью 23 976 800 бел. рублей;
Лот № 112. Лестничный марш ЛПП- 57 14.15. В площадка, в кол-ве 3 шт, стоимостью 1 550 000 бел. рублей;
Лот № 113. Вентблок ВБ 1-28 Лев., в кол-ве 21 шт, стоимостью 13 057 100 бел. рублей;
Лот № 114. Вентблок ВБ 1-28 Прав., в кол-ве 20 шт, стоимостью 12 435 300 бел. рублей;
Лот № 115. Вентблок ВБ 2-28 Прав., в кол-ве 5 шт, стоимостью 2 769 000 бел. рублей;
Лот № 116. Плита перекрытия ПК 27.12.12АIII-1, в кол-ве 5 шт, стоимостью 2 485 700 бел. рублей;
Лот № 117. Плита перекрытия ПКМ 24.15.22.10.S500, в кол-ве 9 шт, стоимостью 8 337 150 бел. рублей;
Лот № 118. Плита перекрытия ПК 27.15.10А III-2, в кол-ве 1 шт, стоимостью 627 600 бел. рублей;
Лот № 119. Плита перекрытия ПК 27.12.13А III-1, в кол-ве 1 шт, стоимостью 497 150 бел. рублей;
Лот № 120. Плита перекрытия ПК 56.15.10АТ 800-2, в кол-ве 2 шт, стоимостью 3 225 900 бел. рублей;
Лот № 121. Плита перекрытия ПК 68-15, в кол-ве 1 шт, стоимостью 1 857 800 бел. рублей;
Лот № 122. Плита перекрытия ПК 56-12.9, в кол-ве шт, стоимостью 6 637 000 бел. рублей;
Лот № 123. Плита перекрытия ПК 27.12.12, в кол-ве 9 шт, стоимостью 3 887 350 бел. рублей;
Лот № 124. Плита перекрытия ПК 56.15.13, в кол-ве 4 шт, стоимостью 5 886 900 бел. рублей;
Лот № 125. Плита перекрытия ПК 68.12.12.АТ-8, в кол-ве 4 шт, стоимостью 6 254 450 бел. рублей;
Лот № 126. Плита перекрытия ПК 56 15.12, в кол-ве 3 шт, стоимостью 4 415 150 бел. рублей;
Лот № 127. Плита перекрытия ПК-27.15.6 А III, в кол-ве 10 шт, стоимостью 5 322 750 бел. рублей;
Лот № 128. Плита перекрытия ПК-27.15.10 А III, в кол-ве 3 шт, стоимостью 1 704 050 бел. рублей;
Лот № 129. Плита перекрытия ПК 56-12.9, в кол-ве 2 шт, стоимостью 2 212 350 бел. рублей;
Лот № 130. Плита перекрытия 2 ДП 26 28 диафрагма, в кол-ве 3 шт, стоимостью 10 881 300 бел. рублей;
Лот № 131. Плита перекрытия 1Д 26.28, в кол-ве 2 шт, стоимостью 6 802 000 бел. рублей;
Лот № 132. Плита перекрытия 2 Д 26-28, в кол-ве 1 шт, стоимостью 3 772 050 бел. рублей;
Лот № 133. Плита перекрытия 1 Д-30.28, в кол-ве 4 шт, стоимостью 21 266 600 бел. рублей;
Лот № 134. Плита перекрытия 1Д 26-28, в кол-ве 1 шт, стоимостью 3 627 100 бел. рублей;
Лот № 135. Плита перекрытия 2 Д-30.28, в кол-ве 1 шт, стоимостью 5 949 850 бел. рублей;
Лот № 136. Плита перекрытия 1 ДП 26.28, в кол-ве 3 шт, стоимостью 9 801 150 бел. рублей;
Лот № 137. Плита перекрытия 1Д 26.28, в кол-ве 1 шт, стоимостью 3 627 100 бел. рублей;
Лот № 138. Плита перекрытия 1Д 12.28, в кол-ве 1 шт, стоимостью 1 916 150 бел. рублей;
Лот № 139. Плита перекрытия 1Д-30.28, в кол-ве 3 шт, стоимостью 15 949 950 бел. рублей;
Лот № 140. Перемычка 2 ПБ 13 1П, в кол-ве 12 шт, стоимостью 467 750 бел. рублей;
Лот № 141. Перемычка 2 ПБ 10 1 П, в кол-ве 9 шт, стоимостью 317 500 бел. рублей;
Лот № 142. Перемычка 3 ПБ 13-37, в кол-ве 20 шт, стоимостью 1 364 300 бел. рублей.

| | |
|---|---|
| **Собственник (владелец) имущества** | **ЧТПУП «Комплектмонтажпроект» (УНП 191297826)** |
| **Местонахождение (адрес) имущества** | **г. Орша, микрорайон «Заднепровье-3», строительная площадка объекта «Жилой дом №9»** |
| **Наличие обременений** | **нет** |
| **Место (адрес), дата и время проведения торгов** | **02.04.2014 в 11.30, г. Витебск, ул. Правды, 32, каб. 320** |
| **Справочная информация об организаторе торгов** | **Управление принудительного исполнения главного управления юстиции Витебского облисполкома, 210029, г. Витебск, ул. Правды, д. 34. Судебный исполнитель Ильющенков Алексей Александрович, тел./факс (80212) 607106, начальник отдела Бураков Игорь Вячеславович, тел. (80212)600975** |
| **Условия и порядок проведения торгов** | Лицо, желающее принять участие в торгах, до начала торгов обязано: 1. Подать письменную заявку на участие в торгах и дать подписку об отсутствии препятствий для приобретения имущества, предусмотренных законодательством. 2. Внести задаток в размере 10 процентов от стоимости имущества (по каждому лоту) на депозитный счет Главного управления юстиции Витебского облисполкома № 3642903001037 в 200 филиале ОАО «СБ Беларусбанк», МФО 635, УНП 300002505, **не позднее 11.00 01.04.2014 г.** Минимальная величина первого шага – 5% от первоначальной стоимости лота. В соответствии с частью 3 статьи 401 Хозяйственного процессуального кодекса Республики Беларусь возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется покупателем имущества. |

# Усё пра Еву

■ Паміж намі

# УЗРОСТ — НЕ ПЕРАШКОДА



**Жанчына і ўзрост — вечныя антаганісты: толькі перастанеш перажываць, што ты недастаткова дарослая, як ужо пачынаеш пакутаваць, што недастаткова маладая. Тайну свайго сапраўднага ўзросту некаторыя з нас ахоўваюць не горш, чым урад — дзяржаўныя сакрэты. Можна, вядома, дзесяць гадоў запар урачыста задзімаць трыццаць свечак на святочным торце, замкнуць свой пашпарт у сейфе самага надзейнага швейцарскага банка або зрабіць сабе такую кардынальную падцяжку твару, што ён назаўсёды застыне з выразам нямога здзіўлення. Але навошта?**

## 20 ГАДОЎ

**Што з асабістым?** О, шмат чаго. Або зусім нічога. Усё залежыць ад характару. Магчыма, ты адна з лепшых студэнтак, чытаеш Шэкспіра ў арыгінале, цікавішся філасофіяй, наведваеш фітнес-залу. Твой дзень распісаны па хвілінах, і часу на асабістае жыццё не застаецца. Ты занята важнай справай — закладваеш падмурак будучай бліскучай кар'еры.

А можа, наадварот? Ты імкнешся ўзяць ад жыцця ўсё. Ты — душа любой кампаніі, у начных клубах ты смела праходзіш фэйс-кантроль, а заўзятыя модніцы раяцца з табой адносна тэндэнцый новага сезона. Твой мабільны распірае ад SMS-паведамленняў накшталт «давай сябраваць» або «калі не адкажаш, выкінуся з 5-га паверха». Вучоба? Ты там таксама з'яўляешся, але выключна для таго, каб прадэманстраваць чарговую абноўку або калі на гарызонце замаячыў сімпатычны і халасты выкладчык.

**Падводныя камяні.** Калі ў першым выпадку ты пазнала сябе — пахвальна. Твая стараннасць у вучобе радуе, захапляе і крыху… палохае! Так, кар'ера — гэта, безумоўна, цудоўна. Але ж ёсць і іншыя, не менш займальныя бакі жыцця. Падумай, ці не ўпускаеш ты штосьці вельмі важнае?..

Другі выпадак таксама насцярожвае. Здарава жыць па прынцыпе «жыццё адно», але мода на начное жыццё мінае, ад яе, у лепшым выпадку, у цябе застануцца прыемныя ўспаміны і парачка знаёмых. А пасля 5 гадоў руплівай вучобы ва ўніверсітэце застанецца дыплом, які прыадчыніць перад табой многія дзверы.

**Прыгажосць і здароўе.** Тыповая праблема ў юнацкія гады — гэта, вядома ж, запаленая скура і вугры. Але вось няўдача: як толькі твой арганізм справіўся з залішнім выдзяленнем скурнага тлушчу, пачынаецца другі, больш няўхільны працэс — працэс старэння. Не палохайся, першыя сур'ёзныя маршчыны табе не пагражаюць яшчэ гадоў 10. Зразумела, пры выкананні элементарных правілаў догляду. Неабходна ачышчаць скуру раніцай і ўвечары, нават калі ты не наносіла макіяж. Не забывай пра ўвільгатненне — без яго скура страціць сваю эластычнасць і сляды старэння праявяцца значна раней.

Фігура пакуль не прычыняе клопатаў. Гэта пакуль. Бо, хутчэй за ўсё, твой лад жыцця далёкі ад ідэальнага (бяссонныя ночы, перакусы замест паўнавартаснага абеду і г. д.). Паспрабуй уключаць у свой рацыён пабольш свежай агародніны і садавіны. Можна зрэдку ласавацца горкім шакаладам. І не варта на дыскатэках расседжвацца каля барнай стойкі з кактэйлем у руках — больш руху!

## 30 ГАДОЎ

**Што з асабістым?** Да 30 гадоў, паводле статыстыкі, прыкладна 60% жанчын бяруцца шлюбам. Часта ты думаеш пра сваю калегу: вы аднаго ўзросту, але яна ўжо вядомы спецыяліст, мае добрую пасаду і цяпер можа смела заняцца асабістым жыццём. Ты ж рана выскачыла замуж, паспела абзавесціся дзецьмі, а твая навуковая работа пыліцца на верхняй паліцы шафы. Затое нядаўна, сустракаючы дачку са школы, ты пачула ад уражанай новай настаўніцы: «Вы яшчэ такая маладая, а дзеці ўжо такія вялікія. Як вам пашанцавала!». Так, сапраўды, пашанцавала. Цікава, ці пачуе калі-небудзь калега такія словы?..

**Падводныя камяні.** Цалкам магчыма, што тваё асабістае жыццё не паспела скласціся да 30 гадоў. Хаця, гледзячы што пад гэтым разумець… Выратавальныя, з твайго пункту гледжання, і бесперспектыўныя, з пункту гледжання тваіх блізкіх, адносіны з жанатым мужчынам наўрад ці даюць табе пачуццё поўнага душэўнага камфорту. Калі твой каханы не разарваў адносіны з жонкай на працягу першага года, то чакаць далей няма сэнсу. І не варта апраўдваць сябе і яго тым, што з жонкай у яго поўная адсутнасць блізкасці, як душэўнай, так і фізічнай. Калі б яму насамрэч было дрэнна, ён даўно б сышоў туды, дзе яму лепш.

**Прыгажосць і здароўе.** Першая маршчына — як прадвеснік надыходзячай старасці! Супакойся, усё не так страшна. Да старасці яшчэ далёка, але гэта не прычына расслабляцца. Паводле апошніх даследаванняў, першая маршчынка можа яшчэ доўгі час заставацца адзінай, калі трохі пастарацца. Таму звярні ўвагу на своечасовае ачышчэнне і сілкаванне скуры, а таксама на састаў тваёй касметыкі. У ёй абавязкова павінны быць кампаненты, якія абараняюць скуру ад уздзеяння знешняга асяроддзя, такія як антыаксіданты (вітаміны C і E) і SPF-фільтры.

Калі за плячыма цяжарнасць і роды, прытым неаднаразовыя, то гаварыць пра дзявочую стройнасць цяжка. Цяпер пахудзенне, скажам, на 5 кг цягне за сабой імклівы набор вагі ў 8 кг. Перад тым, як адважыцца на дыету, неабходна пракансультавацца з урачом-эндакрынолагам. У гэтым узросце не выключаны розныя парушэнні гарманальнага фону, што і можа стаць прычынай залішняй вагі.

## 40 ГАДОЎ

**Што з асабістым?** Праглядваючы сямейны альбом, ты была ў шоку. Твая мама ў гэтым узросце выглядала значна старэй, чым ты цяпер! Ну, яшчэ б — у цябе ж модная стрыжка, стыльнае адзенне, дарагая парфума. Тваiму ўменню наносіць макіяж пазайздросціць самы масціты візажыст! Кар'ера адбылася, дзеці падраслі, адносіны з мужам выйшлі на якасна новы ўзровень. Мужчынская ўвага да тваёй персоны не змяншае тэмпы, а наадварот, набірае.

Хоць… Можа быць, ты дагэтуль адзінокая… Але не страчваеш надзеі наладзіць асабістае жыццё. Што ж, усё ў тваіх руках. Ты можаш папросту згадзіцца на няроўны шлюб. Толькі пастарайся, каб у такіх адносінах ты была прадметам кахання і пакланення, а не наадварот, як гэта часта бывае.

**Падводныя камяні.**

Варыянт першы. Прыгожая жанчына, вопытная палюбоўніца, цудоўная гаспадыня. У цябе ёсць усё: кватэра, машына, грошы. Няма толькі каханага мужа, які б ацаніў усё гэта па заслугах. Асцярожна, ты — ідэальная знаходка для альфонса!

Варыянт другі. Паспеўшы не раз пабываць замужам і канчаткова расчараваўшыся ў супрацьлеглым поле, ты зусім забываеш пра сваю знешнасць і прывабнасць у вачах мужчын. А дарэмна!

**Прыгажосць і здароўе.** Міжволі ўспамінаецца фраза: «45 гадоў — баба ягадка ізноў». Ці ўсё так проста, што для набыцця «ягаднай» прывабнасці жанчыне неабходна толькі пераадолець 45-гадовую мяжу? На жаль, касметолагі сцвярджаюць: расслабляцца нельга! На твары ўжо здрадліва абазначыліся сляды шалёнага рытму жыцця. Як вынік — сухасць, патанчэнне і павышаная адчувальнасць скуры.

Можаш карыстацца амаладжвальнымі крэмамі; прымяняць стымулюючыя сродкі, якія актывізуюць абменныя працэсы. Карыстайся любой магчымасцю папесціць сваю скуру. Не варта скупляць усе навамодныя сродкі адразу. Дастаткова набыць адзін якасны прэпарат і прымяняць яго на працягу некалькіх месяцаў. Затым параўнаць вынік з папярэднім і паспрабаваць новы.

Май на ўвазе, што кожныя дзесяць гадоў інтэнсіўнасць метабалізму (абмену рэчываў) падае на 5–10%. Пры гэтым каларыйнасць рацыёну многіх жанчын твайго ўзросту, як правіла, застаецца на ўзроўні 20-гадовых. Гэта адбываецца на фоне агульнага зніжэння рухальнай актыўнасці. Калі ты хочаш кантраляваць сваю вагу, задумайся пра зніжэнне каларыйнасці рацыёну ў сярэднім на 5–7%.

## ТЫМ, КАМУ ЗА…

**Што з асабістым?** Старасць?! Якія нашы гады! Вы не адчуваеце сябе старой. Старыя — гэта тыя, хто злуецца на «цяперашняе пакаленне» або ходзіць з валяр'янкай, прыгаворваючы, што «свет звар'яцеў». А вы — сучасная бабуля, цудоўная цешча, мудры і цярплівы настаўнік. Што да адносін з супрацьлеглым полам, то слова «сяброўства» будзе тут больш да месца. Лысіна і выпіраючы жывоцік ужо не так абражаюць ваш позірк. Што і казаць, адбылося сур'ёзнае пераацэньванне жыццёвых каштоўнасцяў. Цяпер вы аддаяце перавагу прыгажосці ўнутранай. І што тут дрэннага?!

**Падводныя камяні.** Вучыцеся старэць прыгожа. Жанчыны, прывабныя ў старасці, выглядаюць не так, як у маладосці, а лепш. Яны не апранаюцца па модзе тых гадоў, прычэсваюцца не так, як 30 гадоў таму, наносяць іншы макіяж. Ва ўсім — пачуццё меры, «пасталелага» густу. Не трэба заплюшчваць вочы на свой узрост ці з жахам глядзець на гэтыя лічбы. Умейце цвяроза ацэньваць свае недахопы, маскіраваць іх і падкрэсліваць добрыя якасці — макіяжам, прычоскай, адзеннем.

**Прыгажосць і здароўе.** Наступствы ўзроставай гарманальнай перабудовы, такія, як «прылівы», перапады настрою, галаўны боль, могуць прынесці мноства турбот. Але вы можаце іх папярэдзіць, прайшоўшы адпаведнае лячэнне. Яно не з'яўляецца абавязковым, проста гэта цудоўны спосаб зняць усе негатыўныя праявы клімаксу.

З надыходам менапаўзы ў арганізме рэзка змяншаецца колькасць кальцыю. Каб запаволіць гэты працэс, прымайце прэпараты кальцыю, уключыце ў рацыён тварог, малако, кефір. Утрымаць кальцый у касцях дапамагаюць і фізічныя практыкаванні. Праўда, цяпер аэробіка, бег трушком для вас могуць быць цяжкаватымі, аднак гэта не значыць, што спорт вам супрацьпаказаны. Падыдуць аквааэробіка, плаванне. Асноўнае правіла — падчас заняткаў вы павінны прытрымлівацца ўласнага рытму.

Маршчыны! Мы свядома паставілі гэтую з'яву на апошняе месца, паколькі на здароўе жанчыны пасля 50-ці яны ніяк не ўплываюць. Толькі жанчыны з комплексамі змагаюцца з імі ўсялякімі спосабамі. Таму не звяртайце на іх увагі, вам жа не 18. Жыццёвы вопыт — вось ваша перавага ў 50 і, тым больш, у 60 гадоў. І перадаць яго дзецям і ўнукам — ваша галоўная задача на наступныя гады. А маршчынкі — гэта прыкмета таго, што вы пражылі жыццё, поўнае эмоцый і ўражанняў.

**Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ**

■

■ Нататнік Яго жонкі

Святлана ДЗЯНІСАВА,
галоўны рэдактар часопіса «Маладосць»

# ШТО І ТРЭБА БЫЛО ДАКАЗАЦЬ



Мужчыны пачынаюць гаварыць выключна дзеля таго, каб пачаць гаварыць,— во як. Да такой высновы прыйшлі навукоўцы, не абцяжараныя, відаць, больш сур'ёзнымі задачамі. З гэтай іх думкай я, між іншым, цалкам згодная. Мужчынам патрэбна ўвесь час нечым сябе займаць — не справай, дык хаця б яе абмеркаваннем. А вось аб тым, што за дзень сярэднестатыстычны мужчына (дзе, цікава, такія сустракаюцца?) прамаўляе столькі ж слоў, колькі і жанчына (таксама, відаць, міфічная сярэднестатыстычная), я з навукоўцамі ўсё ж паспрачаюся. Шаснаццаць тысяч слоў штодзённа прамаўляюць, маўляў, і тыя, і тыя! Абое рабое, як казала мая бабуля. Ну ці вы гэта чулі?! Добра, удакладню: пятнаццаць тысяч шэсцьсот шэсцьдзясят дзевяць слоў з вуснаў мужчыны супраць шаснаццаці тысяч двухсот пятнаццаці слоў, прамоўленых за суткі жанчынай, але розніцу ў пяцьсот сорак шэсць (ці колькі там?) слоў тыя навукоўцы палічылі настолькі статыстычна не істотнай, што адразу ж на яе, малайчынкі, забыліся. Што да мяне, то я і з такім падыходам не згодна!

Штовечар (за выключэннем хіба толькі нейкіх «няправільных» дзён) у нашай кватэры звініць вішнёвы лупаценькі тэлефон, на лбе якога не сказаць, каб дужа весела, адбіваюцца адны і тыя ж сем лічбаў. Гэта Яму, майму мужу, тэлефануе сябар — па-першае, сусед; па-другое, калега па рыбнай лоўлі; па-трэцяе, апанент у пытаннях тэорыі і практыкі эканамічнай эфектыўнасці выкарыстання фактараў спажывання і вытворчасці ў межах бюджэту сям'і; па-чацвёртае, да таго ж цёзка. За той час, на працягу якога яны яшчэ толькі дзеляцца ўражаннямі аб недарэмна пражытым дні, я паспяваю: а) праверыць урокі ў малодшага сына, б) паспрабаваць праверыць іх у сярэдняга, в) патэлефанаваць (па мабільніку) старэйшаму. Тут справа не ў канструктыўнасці выкарыстання часу, не. Проста далей я ўжо маю магчымасць слухаць яго размову. Ну і вось. Спачатку яны апантана вырашаюць набалелыя пытанні, потым спрачаюцца па якой-небудзь аддаленай тэме, знешне нейтральнай і быццам бяскрыўднай, але не без элементу праблемы, пасля дамаўляюцца аб нечым, што можа, на іх думку, паўплываць на лёс і падзеі бліжэйшага часу ў межах калі не касмічных, дык хаця б планетарных. Учора яны спачатку высвятлялі акалічнасці зімоўкі пчол ва ўмовах нашай найноўшай зімы, потым абмяркоўвалі, даволі эмацыйна, эфектыўнасць выкарыстання энергазберагальных лямпачак, пасля ўзяліся за асаблівасці фідарных вудзільнаў і прагноз на тое, як будзе брацца рыба ў вадаёмах Міншчыны. За гэты час я: а) даведалася ад Яго, як дакладна ўплывае атмасферны ціск на адценне сонечнага дыска ў момант яго захаду за гарызонт; б) паўтарыла невядома для чаго закон Ома; в) зразумела, як маглі выглядаць колішнія «салоны» і якімі дакладна размовамі запаўняліся раўты. І гэта пры тым, што мае ўлюбёныя навукоўцы, ацэньваючы тэлефонныя размовы, мала што падзялілі іх на «сур'ёзныя гутаркі» і «побытавыя зносіны», дык яшчэ і абвясцілі размовы мужчынскай паловы паддоследных эмацыйна няяркімі, інфармацыйна беднымі, пазбаўленымі моўнай разнастайнасці і забруджанымі неапраўданымі паўторамі. Ха! Менавіта апошняе і трэба было даказаць! Усё астатняе… Ведаеце, што насамрэч адрознівае тэлефонную размову мужчын ад жаночай? Тут і да навукоўцаў не хадзі: падчас тэлефоннай размовы жанчына можа фарбаваць пазногці (самы распаўсюджаны сюжэт), абіраць бульбу (калі перад гэтым не пафарбавала пазногці), круціць фарш (калі шнур доўгі), смажыць аладкі, мыць посуд (я так і раблю, бо мне на тэлефонныя размовы ўвогуле шкада часу) і нават прасаваць. Жаночая тэлефонная размова, такім чынам (звярніце ўвагу, спадары навукоўцы),— гэта сродак рабіць патрэбнае праз прыемнае, гэткая, так бы мовіць, хітрасць супраць сябе самой сабе ж на карысць. А мужчынская? Мужчына — вернемся да першага радка — пачынае гаварыць выключна дзеля таго, каб пачаць гаварыць

■

■ Пра гэта

# ПОЛЕ БІТВЫ, ПОЛЕ ПРЫЦЯГНЕННЯ…

**Якія міфы перашкаджаюць нам разумець адно аднаго, каб стаць сексуальна шчаслівымі?**

— Наогул пад сексуальнасцю маюць на ўвазе прыроджаную патрэбу арганізма ў захаванні віду,— расказвае **ўрач-сексолаг Мінскага гарадскога псіхіятрычнага дыспансера Мікалай ХВАШЧЫНСКІ.** — Для фізічнага жыцця канкрэтнага чалавека сексуальнасць не такая ўжо і важная. Гэта не такая жыццёвая патрэба, як харчаванне, дыханне, адпачынак і г. д. Незадаволеныя сексуальныя патрэбы не прыводзяць да гібелі індывіда. Аднак сексуальнасць мяняе якасць жыцця, робіць яе больш яркай і насычанай радасцю ад знаходжання побач з іншым чалавекам.

Сексуальныя адносіны — гэта не толькі працяг роду, але і развітанне з адзінотай, магчымасць зліцца з партнёрам у адзінае цэлае. Гэта асаблівая форма стасункаў, наймацнейшая прывязанасць, калі можна сказаць не «Я хачу жыць з ім», а «Я не магу жыць без яго!». Ці гэта не каханне?

Яшчэ сексуальнасць дазваляе перажыць ні з чым не параўнальную пачуццёвую асалоду ад блізкасці. Яе недарма называюць інтымнай (глыбока асабістай, задушэўнай). У сексуальных стасунках мы самасцвярджаемся ў вачах партнёра, выказваючы яму сваё каханне. У інтымнай блізкасці чалавек адкрываецца поўнасцю, дазваляе пазнаць сябе такім, які ён ёсць, адкідвае страх быць непрынятым.

Не варта забывацца аб значэнні сексуальнасці як сродку пераадолення стрэсаў, дасягнення стану фізічнага і псіхічнага камфорту. Інтымная блізкасць — гэта адносіны не толькі цел, але і асоб.

Ёсць людзі, якія аб'яўляюць сябе асексуаламі — а значыць, абыходзяцца без сексу. Гэта свядомы выбар ці вымушаны стан «утаймавання плоці» пад уздзеяннем нейкіх абставін? Ці збядняюць такія людзі сваё жыццё? Па-першае, нельга назваць абсалютна асексуальным жыццё людзей, якія адмаўляюцца толькі ад палавых кантактаў, але пры гэтым могуць падтрымліваць рамантызм і эротыку ў адносінах з процілеглым полам. Часткова можна задаволіць сваю сексуальнасць і такім чынам, без фізічнага кантакту. Вось калі нехта любыя стасункі абмяжоўвае выключна фармальнымі або дзелавымі рамкамі, то іх хочацца пашкадаваць. Бо нешта вельмі… чалавечае пройдзе міма.

Сексуальнасць — гэта дар, якім кожны можа скарыстацца, каб напоўніць сваё жыццё. Хоць яна ўласцівая ўсім людзям, яе праяўленне звязана не толькі з



асаблівасцямі асобы, але і з палавымі адрозненнямі. Калі не ўлічыць адрозненні паміж мужчынскай і жаночай сексуальнасцю, гэта можа стаць прычынай сексуальнай дысгармоніі ў пары.

Для мужчын характэрна больш выражанае сексуальнае жаданне. Мужчыны часцей выступаюць ініцыятарамі сексуальнай блізкасці, праяўляюць сексуальную напорыстасць і нястрыманасць. Па выніках даследаванняў, маладыя людзі ва ўзросце 12–19 гадоў практычна пастаянна думаюць пра секс, а мужчыны ад 40 да 49 гадоў — раз у паўгадзіны.

Мужчынам традыцыйна чамусьці прыпісваюць універсальнае жаданне сексуальнай разнастайнасці і кароткатэрміновых сувязяў, меншае эмацыянальнае ўцягванне ў інтымныя адносіны. Аднак тут ёсць з чым паспрачацца. Падобнае «прыпісванне» грунтуецца на некалькіх **міфічных пастулатах:**

- ✓ Сапраўдны мужчына правяраецца найперш у сексе.
- ✓ Мужчына заўсёды жадае сексу і заўсёды гатовы да яго.
- ✓ У сапраўднага мужчыны няма сексуальных праблем.
- ✓ Добры секс адбываецца сам сабой, без падрыхтоўкі і лішніх размоў.
- ✓ Секс і палавы акт — адно і тое ж.
- ✓ У сексе мужчына не павінен слухацца жанчыну.
- ✓ Адмовіцца ад сексу — распісацца ў няздольнасці як мужчыны.
- ✓ Секс — гэта работа.
- ✓ Добры секс абавязкова завяршаецца аргазмам.
- ✓ Мужчына павінен «давесці» партнёрку да аргазму.
- ✓ Чым больш жанчын і палавых актаў, тым лепш.
- ✓ Інтымная блізкасць — працяглы палавы акт, пяшчоты і ласкі другасныя.

Мужчыны, якія становяцца заложнікамі падобных міфаў, губляюць сваю індывідуальнасць і расплачваюцца страхам перад магчымай сексуальнай няўдачай. Так званая «выканаўчая трывожнасць» — яшчэ адна асаблівасць мужчынскай сексуальнасці. Мужчынам уласціва зацыклівацца на тэхнічным баку сексу і ператвараць кожны палавы акт у экзамен сваёй «баяздольнасці».

З іншых адрозненняў трэба прыгадаць адставанне палавога выспявання ў мужчын ад жанчын на 1–2 гады, але больш ранні пачатак палавога жыцця.

Пік сексуальнай актыўнасці ў мужчын прыпадае на 20–25 гадоў. У гэтым узросце яны з гатоўнасцю аддадуць перавагу сексу перад іншымі заняткамі і ахвяруюць любымі рэсурсамі дзеля яго.

Сексуальнасці жанчыны ўласцівая большая псіхалагічнасць. У гэтым выпадку сексуальная задаволенасць залежыць у асноўным ад узроўню стасункаў з партнёрам і ў меншай ступені звязана з аргазмам. Вядучую ролю ў палавых паводзінах жанчын адыгрывае не імкненне да палавога акту, а ацэнка асобы мужчыны. Асноўны матыў палавой блізкасці для жанчыны — любоў да партнёра. Прыярытэт для жанчыны мае мацярынскі інстынкт.

Росквіт жаночай сексуальнасці надыходзіць не адразу пасля пачатку палавога жыцця. Вось вынікі даследаванняў: у першыя 3 месяцы пасля замужжа аргазм перажылі каля 20 працэнтаў жанчын, праз 1 год — каля 40 працэнтаў, праз 5 гадоў — каля 70, пасля 10 гадоў — каля 90.

Пік сексуальнай актыўнасці назіраецца пасля 30 гадоў.

Для ілюстрацыі жаночай і мужчынскай сексуальнасці можна прыгадаць такія радкі: «Яны закаханыя і шчаслівыя. Ён: «Калі цябе няма, мне здаецца, што ты проста выйшла ў суседні пакой». Яна: «Калі ты выходзіш у суседні пакой, мне здаецца, што цябе больш няма».

Адрозненні ў сексуальнасці мужчын і жанчын нічога не кажуць пра іх маральнасць або інтэлект. Кідацца прымітыўнымі фразамі кшталту «Усе мужчыны жадаюць толькі аднаго» або «Жанчынам патрэбны толькі кашалёк» — па меншай меры, несур'ёзна. На тое нам і дадзены розум і пачуцці, каб кожны мог пракладваць сваю дарогу.

Аднак сексуальнасць сама па сабе не з'яўляецца нечым статычным. Яна паддаецца ўплыву сацыяльных працэсаў. У сучасным грамадстве — свае тэндэнцыі развіцця сексуальнасці.

**Па-першае,** адбываецца ломка традыцыйных стэрэатыпаў размеркавання мужчынскіх і жаночых сацыяльных роляў. Сыходзіць у мінулае падзел прафесій на мужчынскія і жаночыя. Правіла «трох К» (з нямецкай — «дзіця», «царква», «кухня») ужо не актуальнае. Умацоўваецца матэрыяльная незалежнасць жанчын. Нават пытанне зачацця жанчыны могуць вырашаць без мужчынскага ўдзелу.

**Па-другое,** кардынальныя змены адбыліся ў інстытуце сям'і і шлюбу. Патрыярхальны ўклад не ў модзе. Больш сем'яў арыентуецца на роўнасць партнёраў. Змяншаецца памер сям'і. З'яўляецца ўсё больш няпоўных сем'яў. Распаўсюджанне атрымалі альтэрнатыўныя формы шлюбу (сужыцельства, пробны шлюб, серыйная манагамія, сексуальна адкрытыя шлюбы).

**Па-трэцяе,** назіраецца крах многіх антысексуальных установак. Грамадства стала больш талерантным да дашлюбнай і пазашлюбнай сексуальнай актыўнасці. Аслабеў «двайны стандарт», калі мужчынам у сексуальным сэнсе дазвалялася намнога больш, чым жанчынам. Звузілася сфера забароненага ў культуры, назіраецца цярпімасць да адхіленняў у праяве сексуальнасці.

Тым не менш, мы па-ранейшаму застаёмся мужчынамі і жанчынамі і па-ранейшаму адчуваем патрэбу ў блізкасці. Мы жадаем поўнасцю даверыцца іншаму чалавеку, набыць узаемаразуменне і ўзаемную павагу. Мы жадаем поўнасцю пагрузіцца ў стан кахання, пры якім шчасце партнёра становіцца абсалютна неабходным для нашага існавання. І ўсяму гэтаму дапамагае наша сексуальнасць!

**Святлана БАРЫСЕНКА**

■

■ Матуліны занатоўкі

# НА СЯМІ ВЯТРАХ

— Мама, я ператварыўся ў агурок. Роціка ў мяне няма, вочак няма. Ручак і ножак таксама няма… Я магу толькі ляжаць і думаць.

Захварэў… Маральна я была да гэтага гатова. Вунь калі нават доктар Камароўскі, мой асабісты гуру ў медыцыне, папярэджвае, што ў першы час наведвання дзіцячага садка малое пачне хварэць з верагоднасцю 100 працэнтаў. Незалежна ад стану здароўя і ўмоў у садку. Хаця…

Памятаю, калі дзеці майго брата пачалі наведваць садок і, натуральна, хварэць, тэма скразнякоў стала ў нашай сям'і ледзь ці не галоўнай. Не адзін год брата раздражняла, што ў садку занадта часта, на яго погляд, адчыняюць форткі. А вось там, куды ходзіць мой сын, форткі амаль заўсёды зачынены. І мяне гэта таксама не радуе.

У пакоі, дзе спіць Антон, тэмпература паветра рэдка перавышае 18 градусаў. Фортка там усю ноч — насцеж. І ніякія скразнякі не бянтэжаць ні мяне, ні яго.

Калі мы з сынам вярнуліся з радзільнага дома, спякота стаяла проста нечалавечая — самі ведаеце, што кожнае лета ў нас бывае некалькі дзен ці нават тыдняў неміласэрнай гарачыні. Толькі пераступіўшы парог кватэры, я імгненна захацела вярнуцца назад, не зважаючы на тое, што ў радзільні на той час не было нават гарачай вады. Бо ўсе вокны нашай кватэры выходзяць на сонечны бок, і застацца дома нават на паўгадзіны падалося мне сапраўдным выпрабаваннем. Але мы засталіся… Гуляць з Антошкам у першыя два тыдні яго жыцця я не адважылася: муж ішоў на працу рана, фактычна ўначы, уначы ж вяртаўся, а я была надта слабая, каб спусціцца ўдваіх з сынам з чацвёртага паверха ў нашым доме без ліфта. Ратаваліся так: адчынялі ўсе вокны, уваходныя дзверы і заадно — дзверцы халадзільніка. Уключалі пару вентылятараў — і вельмі няблага пачувалі сябе ў сваёй кватэры на сямі вятрах. Застудзіць сына я не баялася, хаця да Камароўскага, які раіў прывучаць дзіця да скразнякоў з нараджэння, ставілася тады скептычна. Але пакуль маё дзіця яшчэ не з'явілася на свет, я запісалася на курсы для цяжарных, якія вяла маці васьмі дзяцей.

Туды, дзе чыталіся тыя лекцыі, яны зрэдчас прыбягалі — на выгляд нейкія вельмі ўжо здаровыя, вясёлыя і адначасова добра выхаваныя. Гледзячы на іх, проста немагчыма было не пранікнуцца даверам да парад іх маці. «Менш за ўсё дзіця чакае ад вас, што вы будзеце ставіцца да яго як да хрустальнай вазы»,— казала яна нам. І першае, што раіла зрабіць,— навучыцца не баяцца ўсё тых жа скразнякоў. Бо ў першыя тры месяцы жыцця малое хварэе надзвычай рэдка (прырода паклапацілася), а менавіта той клімат, які мы яму створым у гэты час, будзе для яго камфортным на ўсё жыццё…

І ўсё ж, скажу па шчырасці, калі б не тая жахлівая спякота, я наўрад ці адважылася б распачаць загартоўванне сына так хутка і экстрэмальна. Затое цяпер большасць дзіцячых хвароб мяне не палохае, бо вельмі многае хутка і эфектыўна вылечваецца пераважна ўсё тым жа свежым паветрам.

Памятаю, як Антошка захварэў першы раз. З высачэзнай тэмпературай, мокрым носам і горлам, якое выклікала ў мяне хвілінную паніку… На трэці дзень да нас завітаў мой бацька. Першае, што ён зрабіў,— пазачыняў усе форткі, уключыў ацяпленне (была позняя восень) і назваў мяне вар'яткай «разам з тваім вар'ятам Камароўскім». Маўляў, на сабе я магу ставіць якія заўгодна эксперыменты, а ўнука, якому не споўнілася і паўтара года, ён абароніць… Недзе праз пару гадзін пасля гэтага да нас заехала медсястра з дзіцячай паліклінікі, якая агледзела Антона і прызнала, што ён абсалютна здаровы. Яшчэ праз пару гадзін бацька падышоў з мірам: «Ну дай паглядзець, што там твой Камароўскі піша»…

Пазней ён з уздыхам канстатаваў: «Трапілася б мне гэтая кніжка раней, не прагульвалі б вы школу тыднямі». Сапраўды, нашы з братам зацяжныя прастуды лячыліся па класічных схемах: маліна-малако, банькі-гарчычнікі, мазаць ёдам — дыхаць парай, кроплі-таблеткі-антыбіётыкі… І, натуральна, шчыльна зачыненыя форткі і ніякіх прагулак. У выніку адэноіды нам абодвум выдалялі двойчы — у дзяцінстве і значна пазней. А той клімат, да якога я прывучыла свайго Антона, для мяне самой дагэтуль надзвычай нязручны. Мяне ж усё дзяцінства хуталі, як аранжарэйную кветку…

Менавіта таму такім карысным халаднаватым паветрам сын дыхае пераважна ўначы. Раніцою я адкручваю вентыль на батарэі назад. І насамрэч я далёка не такая разумная і паслядоўная маці, якой хацела б выглядаць. Вось і цяпер…

Гэтая Антонава хвароба пачыналася даволі бяскрыўдна: крыху горла, крыху кашаль… У паліклініцы мне параілі даць яму амбраксол: маўляў, каб раптам не дайшло да бранхіту і каб хутчэй мог зноў пайсці ў садок. Я пачала ўжо вяртацца да працы, да людзей, натуральна, мне вельмі захацелася гэтага «каб хутчэй». І я дала сыну таблетку… Раней на абсалютную большасць медыкаментаў у яго выяўлялася алергія. Але апошні раз Антон хварэў яшчэ пазамінулай восенню, і мне падумалася, што сваю ўспрымальнасць да лекаў ён мог, у прынцыпе, «перарасці». Як «грызла» я сябе за тыя думкі потым! Праз паўгадзіны ў сына пачаўся ацёк лёгкіх, узнікла падазрэнне на пнеўманію…

Яму выпісалі цэлы стосік рэцэптаў, але цяпер я вырашыла не мітусіцца. Адключыла ацяпленне на ўвесь дзень і пайшла заварваць траўкі — балазе, ні на якія з іх алергіі ў Антошкі ніколі не было. Праз два дні ён ужо скакаў па кватэры, «ператвараючыся» ў агурок на дыванку перад самым акном — які там «пасцельны рэжым»! Яшчэ праз тры дні паліклініка дала нам дазвол вяртацца ў садок… Дарэчы, Міжнародная асамблея ўрачоў не так даўно падцвердзіла, што ў шматдзетных сем'ях дзеці хварэюць значна радзей. І афіцыйна патлумачыла гэты агульнавядомы факт тым, што ў шматдзетных маці не надта шмат часу, каб трэсціся над кожным і занадта доўга трымаць дзяцей дома. Ну дык хто ж не ведае пра карысць гульняў у двары…

**Марына БЕРАЗЕНСКАЯ**

■

Наш культурны асяродак

Жырандоля

Выпуск № 6 (223)

■ Асоба

# ДРАМА НА ЎСЕ ЧАСЫ

## Міхась Краснабаеў пра тое, што забываць не варта



**Ідэю стварыць пастаноўку паводле рамана Уладзіміра Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» рэжысёр-пастаноўшчык Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатр імя Якуба Коласа Міхась Краснабаеў выношваў на працягу дзесяцігоддзя.**

Нарэшце віцебскі глядач можа паглядзець гэты яркі, кранальны па сваёй драматургіі спектакль, і гэта добры знак у сучасным нацыянальным мастацтве.

Пасля спектакля мы сустрэліся з рэжысёрам, каб пагаварыць пра тое, як ішла работа над пастаноўкай і чаму менавіта гэты спектакль з'явіўся на коласаўскай сцэне.

**— Ваш творчы шлях на гэтай сцэне пачынаўся менавіта з нацыянальнай драматургіі, першай роляй быў Сымон-музыка ў аднайменнай пастаноўцы па паэме Якуба Коласа. Коласаўскі тэатр заўсёды вылучаўся сваім падыходам да нацыянальнай драматургіі. Як доўга вы ішлі да сцэнічнага ўвасаблення рамана Караткевіча?**

— Гэта мая чацвёртая пастаноўка паводле творчасці Караткевіча. Пісьменнік прываблівае мяне тым, што яго Беларусь — не край мужыкоў у лапцях, а краіна замкаў, з глыбокімі каранямі. У яго вельмі інтэлігентная мова. Першы спектакль — «Вераб'іная ноч», пралог да рамана «Нельга забыць», выйшаў у 1997 годзе. Затым — «Ладдзя роспачы», якая атрымала трэцюю прэмію ў рэспубліканскім конкурсе п'ес для тэатра ў намінацыі «Інсцэніроўка па творах беларускай літаратуры». Гэта быў музычны спектакль, які доўгі час ішоў на нашай сцэне. За спектакль «Леаніды не вернуцца на Зямлю» атрымаў падзяку міністра культуры Рэспублікі Беларусь.

У працы над інсцэніроўкай «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» разумеў, што гэты раман — энцыклапедыя беларускага жыцця. У ім столькі цудоўных дыялогаў, гумару. Але трэба было адсякаць лішні матэрыял, які можа перашкаджаць цэласнасці спектакля.

**— Як вы наладзілі супрацоўніцтва з вядомым беларускім кампазітарам Сяргеем Картэсам?**

— З Сяргеем Альбертавічам мяне пазнаёміў наш дырэктар — мастацкі кіраўнік тэатра Валерый Данілавіч Анісенка. Картэс прачытаў раман і пазваніў мне: вязі інсцэніроўку. Яму спадабалася. У адносінах да Караткевіча мы сталі аднадумцамі, нашы стасункі аказаліся даволі плённымі. Кампазітар нават прызнаўся, што ні ў адным спектаклі яго музыку так дакладна не выкарыстоўвалі, як у нашай пастаноўцы.

**— Наколькі вам удалося дасягнуць узаемапаразумення з акцёрамі?**

— Акцёр заўсёды адчувае, калі мае справу з добрым літаратурным матэрыялам. Мы разам ставілі спектакль пра сваю краіну. Адчуваецца, калі акцёру ёсць што дадаць ад сябе для паўнаты ролі. Галоўную ролю Юрася Братчыка, учарашняга школяра, сыграў малады акцёр Дзіма Каваленка. І гэта стала добрым адкрыццём і для мяне, і для тэатра. Чаму ў яго атрымалася? Для выканання гэтай ролі важна было ўмець адчуць чужы боль, каб свядома пайсці на смерць. Час сярэднявечча, пра які распавядае спектакль, звяртае нас да вечнай тэмы: хто мы, адкуль, чаму і навошта. Дарэчы, мне падабаецца тое маладое папаўненне, што прыйшло да нас з Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў: акрамя Дзмітрыя назаву яшчэ Рамана Салаўёва, Арцёма Герака, Антона Мінчыка. Пасля акадэміі да нас далучыўся акцёр Арцём Блахін. Змена расце. Але, як казала славутая Стэфанія Станюта, нам, выпускнікам тэатральнага інстытута, сваю галоўную адзнаку адпаведнасці майстэрству ставіць жыццё. На самой справе, мастак ніколі не можа быць задаволены сваёй працай.

**— Што трэба сёння рабіць, каб вярнуць гледача да нацыянальнай класікі?**

— Чалавек разумее любы твор мастацтва на ўзроўні свайго развіцця. Пакуль мы з гледачом размаўляем на розных мовах. Гэта нонсэнс, калі мова тытульнай нацыі адштурхоўвае чалавека ад паходу ў тэатр, ад размовы пра адвечнае. Са старажытнасці інтарэсы чалавека мала змяніліся. Барацьба за сферу інтарэсаў толькі ўзмацняецца, а чалавек удасканальвае сваю «пячору» і зброю забойства...

Мы наўмысна мінімізавалі расходы на дэкарацыі ў спектаклі, бо разумелі: калі палезеш у побыт, не вылезеш з яго. Варта абазначыць тэатральны працэс і захапіць гледача жывой ігрой і жыватворнай ідэяй.

❍❍❍

Прыгадваюцца словы са спектакля: «Добра, людзі! Будзе вам цуд і хлеб». Юрась Братчык з тых, пра каго слушна кажа пісьменнік: «Нараджаецца на гэтай цвердзі новая парода людзей. З веданнем і чысцінёй думак».

Увасабленне гістарычнага рамана Караткевіча на сцэне Беларускага нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа дае шанц нашым сучаснікам задумацца пра тое, наколькі багатая гісторыя Беларусі — краіны замкаў і палацаў, блакітных азёр і суровых пушчаў. Таму верыцца, што спектакль «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» чакае доўгае жыццё на сцэне.

**Святлана ДЗЯДЗІНКІНА,**
**Фота з архіва тэатра.**

*г. Віцебск*



■ Кінакрокі

# РОЛЯ «НІКІ» Ў БЕЛАРУСКІМ КІНО

## Стужка 2013 года, створаная пры ўдзеле «Беларусьфільма», вылучана на нацыянальную расійскую кінапрэмію

**Фільм «Роля» рэжысёра Канстанціна Лапушанскага створаны ў супрацоўніцтве некалькіх вытворцаў: Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм», «Ленфільма», расійскага ЗАТ «Пралайн», BUFO STUDIO з Фінляндыі і SIGMA H.V.eK (Германія).**

Намінацый усяго 5: лепшая праца сцэнарыста, лепшая музыка да фільма, лепшая праца гукарэжысёра, мастака, лепшая мужчынская роля. Сам факт намінацый — гэта быццам бы ўжо нагода радавацца і ганарыцца сучасным айчынным кіно.

Насамрэч гэта яшчэ адна нагода паразважаць пра ролю сумеснай вытворчасці ў сучасным кінапрацэсе Беларусі. Працэс ідзе — што яшчэ скажаш, калі з'яўляецца такая навіна? Значыць, студыя працуе, відаць, працуе добра, калі заўважаюць і вылучаюць. Магчыма, гэта яшчэ адзін крок да вялікага прарыву ў кіно, якога мы ўсе чакаем ад такой вялікай студыі, як «Беларусьфільм». Прарыў — гэта і колькасць стужак, якія выходзяць на айчынны (і не толькі) кінаэкран, і якасць іх, пра што, у сваю чаргу, сведчаць касавыя зборы альбо адзнакі прэстыжнымі прэміямі.

Што тычыцца фільма «Роля», то беларускі глядач мог яго пабачыць у рамках кінафестывалю «Лістапад», дзе ён быў у праграме асноўнага конкурсу і адзначаны спецыяльнымі прызамі: Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы і Выканаўчага камітэта СНД. Былі важкія ўзнагароды на іншых міжнародных фестывалях, у прыватнасці, прыз Федэрацыі кінаклубаў Расіі на Маскоўскім кінафестывалі. Акцёр Максім Суханаў таксама атрымліваў прэміі «За лепшую мужчынскую ролю», напрыклад, на фестывалі «Цёмныя ночы» ў Эстоніі. Можна радавацца за добрага расійскага артыста, які цяпер прэтэндуе і на «Ніку». І застаецца чакаць, калі ж з'явіцца такі праект, калі мы з гонарам будзем вымаўляць імёны беларускіх артыстаў у якасці выканаўцаў галоўных роляў у фільмах айчыннай вытворчасці.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Паглядзім?

# Футуралогія праз анімацыю

## ЛЕПШЫ АНІМАЦЫЙНЫ ФІЛЬМ ГОДА ПА ВЕРСІІ ЕЎРАПЕЙСКАЙ КІНААКАДЭМІІ ПАКАЖУЦЬ У БЕЛАРУСІ

**Гаворка пра фільм рэжысёра Ары Фольмана «Кангрэс» (паводле рамана польскага пісьменніка Станіслава Лема). Яго прагляды адбудуцца ў сталічным кінатэатры «Перамога» з 13 па 26 сакавіка. Але толькі сеансамі не абмяжуюцца: ў Мінску арганізаваны розыгрышы падарункаў і кніжная выстава, прысвечаная Станіславу Лему.**

Асоба пісьменніка вельмі важная, асабліва калі размова пра экранізацыю рамана, вырашаную своеасаблівым чынам: ігравое кіно спалучаецца з анімацыяй. Фактычна гэта паўнавартасная стужка, якая доўжыцца 122 хвіліны. Ізраільскі рэжысёр Фольман канцэптуальна падышоў да вырашэння дзеяння ў рэальным свеце і віртуальным — у залежнасці ад таго, што адбываецца з асобай адной не вельмі паспяховай актрысы. Насамрэч яна пагаджаецца на кантракт, паводле якога яе цела скануецца і ствараецца камп'ютарны вобраз гераіні. Гэтая актрыса Робін Райт, у прыватнасці, вядомая беларускім гледачам па фільмах «Форэст Гамп», «Белы Алеандр», серыяле «Санта-Барбара» і іншых. Але цяпер актрыса дапамагае ўявіць жыццё ў будучыні: яно падмяняецца віртуальнай рэчаіснасцю, якую схільныя выбіраць людзі, выхаваныя ў грамадстве спажывання...

У любой казцы, як той казаў, ёсць доля казкі. А творцы, якія імкнуцца зазірнуць у будучыню, могуць яе прадбачыць. Як Станіслаў Лем, які ў сваіх кнігах апісаў стварэнне штучнага інтэлекту і віртуальнай рэчаіснасці. Для нас гэта ўжо не навіна, але менавіта таму і цікава паразважаць разам з аўтарамі фільма: што будзе адбывацца з чалавекам пры далейшым развіцці тэхналогій.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Прэм'ера

# ДВОЕ

## ЯК СТАЦЬ І ЗАСТАЦЦА АДЗІНЫМ ЦЭЛЫМ?



**Ён і яна. Маладыя. Абое трошкі сарамлівыя. Глядзяць адзін на аднаго, усміхаюцца, апускаюць вочы. Зноў уздымаюць і глядзяць, і не бачаць нікога іншага: толькі яна — яго, ён — яе. І нікуды не падзецца ад гэтага. І пачынаецца жыццё разам... Завядзёнка.**

Менавіта пра гэта спектакль ад NiMutheater, які так і называецца «Einleben/Завядзёнка». Назва на дзвюх мовах — нямецкай і беларускай. Таму што насамрэч праект інтэрнацыянальны: у NiMutheatr удзельнічаюць нямецкі акцёр Ёганэс Штубенфоль, іспанская актрыса Ірэна Фас Фіта, беларускія — рэжысёрка Кацярына Аверкава і музыкант Мацей Сабураў. Гэтая незалежная тэатральная група склалася ў 2013 годзе. А ўжо сёлета прадставіла ў Мінску на сцэне Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі спектакль, створаны пры падтрымцы Інстытута Гётэ. Зноў-такі цікавае міжкультурнае спалучэнне. Спектакль з шэрагу тых, дзе нібыта драматургіі і няма, у ім няма тэксту, які прамаўляецца. Але насамрэч спектакль вельмі драматычны — гэта дасягаецца за кошт рэжысуры, якая робіць стаўку на пластыку.

Бываюць спектаклі, дзе словы сапраўды не патрэбны. Тое, што адбываецца на сцэне, зразумела ў любым кутку зямнога шара: хоць людзі і жывуць у розных краінах, але яны аднолькава падуладныя такому пачуццю, як каханне; аднолькава адчуваюць радасць, боль, перажываюць за блізкіх, крыўдзяцца, пакутуюць і спадзяюцца. І якія ўсё ж аднолькавыя чалавечыя істоты па сваіх эмоцыях. Таму такім спектаклям наканаваны поспех, дзе б іх ні паказалі — ці то ў Берліне, ці то ў Мінску.

Але для беларускага гледача ўсё ж патрэбна тлумачэнне: у нас вялікая частка нашай тэатральнай глядацкай аўдыторыі залічвае падобныя спектаклі да ліку эксперыментальных. І гэта пры тым, што ў нас ужо былі вельмі паспяховыя пастаноўкі без слоў, нават паводле класічнай драматургіі. Але ж і сучасныя ёсць: свае думкі і перажыванні беларускія рэжысёры ўсё часцей даносяць праз пластыку: без слоў можна распавесці шмат чаго і вельмі глыбока, а нейкія з'явы жыцця цалкам упісваюцца ў формулу «няма слоў». І тады рэжысёр шукае іншыя сродкі выяўлення ідэй — праз форму.

Тое, што ў «Завядзёнцы» будзеш глядзець нешта асаблівае, разумееш яшчэ да пачатку. На сцэне створаны сапраўдны бар. На стойцы напоі — на выбар. Малады чалавек налівае кілішкі, падыходзяць людзі, частуюцца. Іграе музыка. Ідзе сваё разняволенае жыццё. Адчуванне сапраўднасці наўмысна створана дзеля таго, каб падкрэсліць рэальнасць усіх іншых падзей на сцэне.

...Яны пазнаёміліся ў бары. Прыглушанае святло, рамантычная музыка. Ён і яна. Апынуўшыся за адным сталом, засланым белым абрусам, яны адчуваюць узаемнае прыцягненне. І тут усё зразумела: гэта наканаванасць. Цяпер яны разам. Абрус ператвараецца ў фату, стол становіцца ўвасабленнем агульнага жытла, дзе ўсё робіцца разам. Разам — сняданак ці вячэра. Разам шчабятанне на канапе, разам — разняволенне ў ванне. І ўсё гэта ўвасабляецца выключна з дапамогай адзінай рэчы на сцэне — стала. Таксама як і абрус мяняе сваё прызначэнне: вось гэта прасціна, на якой ім утульна ўдваіх, вось пакрывала ці ручнік... Зноў абрус, пакрывала, прасціна. Так штодня. І неяк непрыкметна белая тканіна, якая яднала, становіцца сімвалам раз'яднанасці. На канапе, засланай пакрывалам, ужо мала месца дваім, на прасціне яны ўжо далёка адно ад аднаго, ручнік хтосьці хоча перацягнуць сабе... Кожны паасобку, хоць усё яшчэ яны існуюць у адной прасторы. І ад гэтага нікуды не падзецца. У гэты момант зусім не думаеш пра тое, што перад табой акцёры: шкадуеш людзей, якія пад прэсам штодзённасці забыліся на свае пачуцці. Ці ўсё ж згубілі іх?

Прыемны вечар у бары. Ён і яна. Глядзяць адно на аднаго — нібыта нічога і не было. А можа сапраўды нічога і не было? А ўсё гэта — толькі гульня ўяўлення, уласная перасцярога, каб не трапіць у кола вось такой завядзёнкі, у якім забываеш пра тое, што ёсць каханне?.. Гэта яна. І гэта ён. Яны побач. І шкада, калі не пазнаёмяцца. Бо яно вартае таго, каб паспрабаваць. Паспрабаваць быць разам і паспрабаваць не страчваць.

Гэты спектакль створаны дзеля пытанняў, а не дзеля адказаў — іх кожны знойдзе сам з улікам уласнага жыццёвага досведу. З пункту гледжання свайго жадання жыць напоўніцу — а гэта значыць, не хавацца ад пачуццяў і не баяцца іх.

Выбар сродкаў у сучаснай тэатральнай практыцы разнастайны. Але тэатр «NiMu» нібыта дэкларуе свой кірунак у працы: «Нас цікавяць эксперыменты з рознымі формамі тэатра, міжкультурная камунікацыя, пошук сваёй унікальнай тэатральнай мовы, аўтарскі погляд на актуальныя тэмы». Тое, што Кацярына Аверкава — рэжысёрка, скіраваная на пошук, было зразумела па яе папярэдніх працах, у тым ліку і ў рэпертуарных дзяржаўных тэатрах, сярод якіх былі пастаноўкі з прызнаннем на міжнародных фестывалях (напрыклад, «Офіс» Купалаўскага тэатра). Але добра, калі творчыя людзі шукаюць сябе — і знаходзяць магчымасць працаваць так, як душа падказвае. Значыць, шчыра, значыць, з пачуццём. І гэта цікава глядзець.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

■ Выставы

# НАТХНЯЛЬНІЦЫ, альбо Мастацкае асэнсаванне постацяў Розы і Клары

**Не, калі вясна, то пра іх усё ж даводзіцца ўзгадваць. Прынамсі, у нашай прасторы, дзе дзякуючы легендарным жанчынам-змагаркам звычайныя працаўніцы атрымалі свята, якое, насуперак савецкай логіцы, стала сімвалам жаноцкасці. І жаночы месяц сакавік успрымаецца як час росквіту, прыгажосці, пяшчоты, выхаду на новы, больш дасканалы віток па спіралі жыцця... Якое дае жанчына. Паглядзіце, што пра гэта думаюць сучасныя беларускія мастачкі, якіх аб'яднаў канцэптуальны праект «Штучнае асвятленне. Клара і Роза.» Ён прадстаўлены ў вялікай зале Музея сучаснага выяўленчага мастацтва.**




Цяпер пра Клару Цэткін і Розу Люксембург згадваюць усё радзей, нават у феміністычным кантэксце: былі ў гісторыі асобы больш аўтарытэтныя, такія, як Сімона дэ Бавуар і Эма Голдмэн. Але «раскручанасць» у свой час Клары і Розы стварыла своеасаблівае разуменне тэмы фемінізму і наогул жаноцкай роўнасці ў савецкай рэчаіснасці. Тая ідэалогія пакрысе адыходзіць, але яна спарадзіла міфы, у сутнасці якіх хочацца разабрацца. Як і хочацца спасцігнуць, чаму гендарная тэма атрымала сваё развіццё ў XXI стагоддзі на новым узроўні. Што робіць яе такой папулярнай і запатрабаванай? І хто пра гэта скажа лепш, чым самі жанчыны?

Калектыўная выстава, створаная высілкамі Таццяны Кандраценкі, Ілоны Касабукі, Зоі Луцэвіч, Таццяны Радзівілкі, Кацярыны Сумаравай, Алены Шлегель, Марты Шматавай. Іх



праца адцяняе погляд аднаго мужчыны. У дадатак да выставы жанчын Мікалай Батвіннік стварыў фотапраект «Rosenhaus», каб засведчыць непаўторнасць таленавітых мастачак. Жаночы след у айчынным мастацтве даволі выразны — нават без штучнага асвятлення (паводле канцэпцыі, гэтую функцыю выконваюць масмедыя). Але што можа зрабіць гэтае «штучнае асвятленне» для беларускага мастацтва — дык прыцягнуць публіку на выставу, якая доўжыцца да 29 сакавіка. І ў дачыненні да гэтых жанчын справа зусім не штучная. Яны вартыя таго, каб іх творы глядзелі — як у Беларусі, так і за яе межамі. Яны вартыя таго, каб іх імёны гучалі, асабліва на радзіме.

**Ларыса ЦІМОШЫК**

# Кірыл Мельнік. Ілюстрацыі жыцця



Менавіта такім Кірыл МЕЛЬНІК бачыў народнага мастака Беларусі і СССР Міхаіла САВІЦКАГА.

**Адзін з нешматлікіх партрэтаў, на якім адлюстраваны вялікі майстар эпохі Міхаіл Савіцкі, належыць пэндзлю маладога жывапісца. Кірыл Мельнік пісаў яго з натуры — у тыя вечары, якія праводзіў у майстэрні народнага мастака. І хоць Герой Беларусі пазіраваць не любіў, часу на асабістыя сустрэчы не шкадаваў — у працэсе шматлікіх гутарак, успамінаў і разваг ён уводзіў суразмоўцу ў асобны закрыты свет, вельмі далёкі ад рэальнасці. У свет Савіцкага.**

Туды траплялі выключныя людзі. Кірылу Мельніку пашчасціла быць сярод іх. Нягледзячы на тое, што Міхаіла Андрэевіча ўжо няма, малады мастак працягвае існаваць у гэтым незвычайным свеце і сёння: ён працуе ў галерэі, названай у гонар творцы. Тут, сярод шматлікіх палотнаў і асабістых рэчаў Савіцкага, знаходзіцца і гэты, бадай што апошні партрэт народнага мастака Беларусі.

— Якой была ацэнка майстра? — не магла не пацікавіцца я.

— Міхаіл Савіцкі быў з тых людзей, хто скупіўся на пахвалу, — прызнаецца Кірыл Мельнік. — Вось што ён сказаў: «Нягледзячы на тое, што партрэт вельмі змрочны, ён на мяне падобны». І стала зразумела — застаўся задаволеным. Карціну я падарыў Міхаілу Андрэевічу. Пасля яго смерці яна «пераехала» ў галерэю.

Сапраўды, твор «невясёлы». Чорны, чырвоны і белы колеры, якія дамінуюць на палатне, асацыююцца ў мастака з жыццём Савіцкага. «Шмат цёмнага было ў яго лёсе. Як і чырвонага, — перакананы ён. — У першую чаргу, Савіцкі асацыюецца з савецкай уладай, з вайной. Белы колер адлюстроўвае нематэрыяльны бок творцы: яго як пакутніка. Менавіта ў такіх адценнях я ўспрымаў Міхаіла Андрэевіча».

У жыцці самога Кірыла Мельніка ўсё ж такі пераважаюць светлыя фарбы. Нарадзіўся мастак у Мінску, у сям'і выкладчыка ВНУ, цяпер прафесара Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, і настаўніцы пачатковых класаў. Скончыўшы 9 класаў сярэдняй школы, паступіў у Мінскае мастацкае вучылішча імя Глебава. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў стаў мастацтвазнаўцам.

У творчай сферы Кірыл Мельнік апынуўся васьмігадовым хлопчыкам. У студыю, дзе працавалі беларускія мастакі Віктар Варанкевіч і Валерый Гардзіенка, прывяла старэйшая сястра, якая цікавілася жывапісам. Яе захапленне перадалося брату, а пазней мастакі сталі яго настаўнікамі. Праўда, першыя карціны былі напісаны ім толькі ў 15-гадовым узросце. Гэта былі копіі, якія ён ствараў пад наглядам сваіх педагогаў, што неўзабаве сталі яму сябрамі.

Сёння ў творчай скарбонцы жывапісца — каля 300 твораў за 16 гадоў штодзённай працы!

— Такі хуткі тэмп працы характэрны для маладосці? — пытаюся ў мастака.

— Гэта далёка не рэкордная колькасць твораў для чалавека, які ўвесь час працуе. Як паказвае гісторыя, тэмп стварэння твораў у кожнага розны. Напрыклад, вялікі аўстрыйскі кампазітар Антон Брукнер напісаў усе свае геніяльныя 9 сімфоній, калі яму было 40 і больш. Іншыя ствараюць у юнацтве, астатнія — у больш сталым узросце. Савіцкі, між іншым, у плане прадуктыўнасці ішоў дастаткова роўна. Вядома, калі яму было за 80, працаваць складана было фізічна, не зусім дазваляла здароўе, а палёт думкі — у поўным парадку.

Акрамя працы ў галерэі Савіцкага, Кірыл Мельнік піша дысертацыю па беларускім жывапісе XX стагоддзя. Прызнаецца, што яму, як творчаму чалавеку, даецца гэта нялёгка. Але любоў да мастацтва дапамагае і тут.

— Адзін з буйнейшых кампазітараў-сімфаністаў і дырыжораў канца XIX — XX стст. Густаў Малер, калі яму задалі пытанне, навошта ён дырыжыруе, сказаў: «Я дырыжырую, каб жыць. А жыву, каб пісаць музыку», — гаворыць мастак. — Вядома, творчасць — галоўнае. Толькі паралельная навуковая і літаратурная дзейнасць ніяк не перашкаджае гэтаму працэсу. Адзінае, што займае шмат часу. Толькі і гэта на карысць: па-першае, я знаёмлюся з дасягненнямі айчыннага жывапісу, па-другое, навука — дадатковы штуршок у творчым развіцці.

Майстэрняй маладога мастака стаў звычайны пакой у бацькоўскай кватэры. Тут жа — і міні-галерэя. У творчай скарбонцы — партрэты, пейзажы, нацюрморты, шматфігурныя кампазіцыі... Маладога чалавека, у адрозненне ад мяне, гэта не здзіўляе.

— Паглядзіце хаця б спіс твораў любога выдатнага кампазітара, — кажа ён. — Гэта сотні найменняў розных жанраў. І тут нічога дзіўнага. Тым больш, калі жанравая разнастайнасць аб'ядноўваецца пэўным стылем ці зместам.

Тэматыка твораў Кірыла Мельніка, у сваю чаргу, даволі разнастайная. Знакамітыя асобы, міфалагічныя постаці, біблейскія вобразы, карціны з гарадскога і сельскага жыцця, марская стыхія, беларускія і замежныя краявіды... Сярод іх і мініяцюры, і вялікія кампазіцыі — як, напрыклад, двухметровая карціна «Хрыстос і Марыя Магдалена». Такія работы найбольш карыстаюцца попытам у пакупнікоў. Цяпер, напрыклад, мастак заканчвае шматфігурную кампазіцыю на тэму Масленіцы канца XIX стагоддзя ў Расіі па заказе калекцыянера з Санкт-Пецярбурга.

Толькі галоўнымі заказчыкамі для Кірыла Мельніка з'яўляюцца яго бацькі. Вельмі не хапае ў іх хатняй міні-галерэі сямейнага партрэта. Задача для мастака, як ён прызнаецца, не з лёгкіх — адзін з самых складаных жанраў. Сапраўды, у сусветным мастацтве падобных твораў няшмат. У памяці бадай што толькі сямейныя партрэты Рэмбранта і Кустодзіева. Як успамінае Мельнік, нават Савіцкі казаў, што, каб напісаць такі твор, патрэбна зрабіць вялікі ўнутраны крок. Малады мастак спрабуе. Трэба зрабіць адзінства, пры гэтым захаваўшы індывідуальнасць кожнага, хто будзе намаляваны — а гэта не менш за восем чалавек!

Спадзяёмся, што гэты твор масавы глядач зможа пабачыць падчас персанальнай выставы Кірыла Мельніка, якая плануецца адбыцца ў наступным годзе. Магчыма, нават у галерэі Савіцкага.

... Дарэчы, на днях Міхаілу Савіцкаму споўнілася б 92 гады. Прайшло ўжо больш за тры гады, як яго не стала. А помніка на яго магіле на Усходніх могілках няма і да гэтага часу. А, між іншым, ён ужо зроблены — пастараўся беларускі скульптар Андрэй Заспіцкі. Справа толькі за тым, каб яго ўсталяваць. Як паведамілі ў Міністэрстве культуры, адбудзецца гэта, тады як толькі дазволяць умовы надвор'я.



Позняе сярэднявечча. Вандроўная трупа.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ і з архіва Кірыла МЕЛЬНІКА.**

ИЗВЕЩЕНИЕ
О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

# РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

## 24 апреля 2014 года проводит 7-ой открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 80 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 141505 дв. 564799 1990 г. 3 кат. 75147 км | г. Минск, в/ч 04147 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 81 | Грузовой Урал-4320-0010 ш. 064776 дв. 505576 1986 г. 3 кат. 100766 км | г. Минск, в/ч 04147 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 82 | Грузовой Урал-4320-0710-01 ш. 168964 дв. 349606 1991 г. 3 кат. 124400 км | г. Минск, в/ч 04147 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 83 | Седельный тягач КамАЗ-54112 ш. 024048 дв. 519487 1989 г. 3 кат. 150913 км | д. Красное в/ч 52242 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 84 | Грузовой Урал-43202 ш. 076764 дв. 082972 1987 г. 4 кат. 24125 км | г. Борисов, в/ч 20193 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 85 | Мастерская МТО-В № С35113 на ЗИЛ-131 ш. 622930 дв. 313892 1985 г. 3 кат. 1312 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 121 000 000 | 12 100 000 |
| 86 | Мастерская МТО-В № С35112 на ЗИЛ-131 ш. 623716 дв. 319307 1985 г. 3 кат. 1358 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 114 000 000 | 11 400 000 |
| 87 | Мастерская МТО-В № С35114 на ЗИЛ-131 ш. 622003 дв. 311101 1985 г. 3 кат. 1193 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 117 000 000 | 11 700 000 |
| 88 | Мастерская МТО-В № С35121 на ЗИЛ-131 ш. 628366 дв. 339892 1985 г. 3 кат. 1120 км | г. Гомель, в /ч 63604 | 121 000 000 | 12 100 000 |
| 89 | Автоцистерна АЦ-5,5-4320М с/о2743 на УрАЛ-4320М ш. 057282 дв. 920865 1986 г. 4 кат. 40525 км | н.п. Подсвилье в/ч 52188/2Ф | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 90 | Кузов-фургон КБ1.375 № 08220 1985 г. 4 кат., Автошасси УРАЛ-375АМ ш. 439702 дв. 186421 1985 г. 4 кат. 3597 км | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 91 | Кузов-фургон КБ1.375 № 07185 1985 г. 4 кат., Автошасси УРАЛ-375АМ ш. 439380 дв. 445548 1985 г. 4 кат. 642 км | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 92 | Кузов-фургон КБ1.375 № 06134 1985 г. 4 кат. , Автошасси УРАЛ-375АМ ш. 438211 дв. 395967 1985 г. 4 кат. 9083 км | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 93 | Кузов-фургон К-375 № 08039 1977 г. 4 кат. , Автошасси УРАЛ-375 ш. 249076 дв. 465121 1977 г. 4 кат. 1205 км | г. Кричев-2, в/ч 33190 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 94 | Грузовой КамАЗ-43105 ш. 003046 дв. 734435 1985 г. 4 кат. 159073 км | н.п. Лесная, в/ч 52215 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 95 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. LO146485 дв. 595562 1990 г. 3 кат. 105033 км | г. Гродно в/ч 05733 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 96 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. МО169059 дв. 749086 1991 г. 3 кат. 93182 км | г. Гродно в/ч 05733 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 97 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. МО168771 дв. 346530 1991 г. 3 кат. 97520 км | г. Гродно в/ч 05733 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 98 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 034024 дв. 710033 1985 г. 4 кат. 22017 км | г. Гродно в/ч 05733 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 99 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 027921 дв. 639345 1984 г. 4 кат. 14709 км | г. Гродно в/ч 05733 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 100 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 025632 дв. 613142 1984 г. 4 кат. 60057 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 101 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. LO154451 дв. 568115 1990 г. 3 кат. 131228 км | г. Гродно, в/ч 05733 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 102 | Грузовой Урал-4320-0010 ш. 053513 дв. 884982 1986 г. 4 кат. 29408 км | г. Гродно, в/ч 41780 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 103 | Грузовой Урал-4320-0011-01 ш. 143258 дв. 563542 1990 г. 3 кат. 85619 км | г. Гродно, в/ч 41780 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 104 | Грузовой КамАЗ-4310 ш. 015750 дв. 021953 1985 г. 3 кат. 92839 км | г. Фаниполь, в/ч 30151 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 105 | Седельный тягач КамАЗ-54112 ш. 0024023 дв. 012727 1989 г. 3 кат. 156655 км | г. Борисов, в/ч 59884 | 55 000 000 | 5 500 000 |
| 106 | Грузовой Урал-4320-0710-01 ш. 143976 дв. 645727 1990 г. 3 кат. 98546 км | г. Гродно, в/ч 97097 | 50 000 000 | 5 000 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **24 апреля 2014 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 21 апреля 2014 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.
2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.
**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

# БЕЛИНВЕСТБАНК

ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
«БЕЛОРУССКИЙ БАНК РАЗВИТИЯ И РЕКОНСТРУКЦИИ
«БЕЛИНВЕСТБАНК»
(Республика Беларусь, 220002, г. Минск, пр-т Машерова, 29)

## ИЗВЕЩЕНИЕ
**о проведении очередного (годового) общего Собрания акционеров ОАО «Белинвестбанк»**

Очередное (годовое) общее Собрание акционеров ОАО «Белинвестбанк» (далее – Собрание) проводится в очной форме 28 марта 2014 года в 11.00 в помещении государственного учреждения «Национальная библиотека Беларуси» по адресу: г. Минск, проспект Независимости, 116.

**Повестка дня Собрания:**

1. О процедурных вопросах
2. Об отчете Наблюдательного совета банка
3. Об отчете Правления банка о результатах финансово-хозяйственной деятельности за 2013 год
4. О заключении Ревизионной комиссии банка по итогам работы ОАО «Белинвестбанк» за 2013 год
5. Об утверждении годового отчета банка за 2013 год в составе бухгалтерского баланса, отчета о прибыли и убытках, отчета об изменении капитала, отчета о движении денежных средств, об аудиторском заключении по годовой отчетности банка за 2013 год
6. Об утверждении распределения прибыли банка и выплате дивидендов за 2013 год, об утверждении нормативов распределения прибыли на 2014 год
7. Об избрании членов Наблюдательного совета банка
8. Об избрании членов Ревизионной комиссии банка
9. О счетной комиссии банка

Дата формирования реестра владельцев ценных бумаг для составления списка лиц, имеющих право на участие в Собрании, и списка акционеров, имеющих право на получение дивидендов за 2013 год, – 26 февраля 2014 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в Собрании, будет производиться с 9.30 по 10.45 по месту проведения Собрания при предъявлении ими документов, удостоверяющих личность (представителями акционеров – также документов, подтверждающих полномочия на участие в Собрании).

Лица, имеющие право на участие в Собрании, могут ознакомиться с проектами решений по вопросам повестки дня Собрания, формой, текстом бюллетеней для голосования по адресу: г. Минск, пр-т Машерова, 29, комн. 705, а также в дирекциях банка по месту учета акций со дня извещения о проведении Собрания в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 16.00.

**Дополнительная информация по телефонам: (8-017) 239-02-88, 239-01-42.**

**www.belinvestbank.by**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 3
выдана Национальным банком Республики Беларусь 3 июня 2013 г.

# ИЗВЕЩЕНИЕ
## О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА по продаже имущества ЧСТУП «Цемекс» со снижением цены на 70%, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Барыкина, д. 309б:

| № лота | Наименование имущества | Стоимость имущества, выставленного на торги, рублей РБ | Начальная цена продажи лота, рублей (без учета НДС) | Задаток 5%, рублей (без учета НДС) | Сумма шага аукциона в размере 5% |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Генератор теплового воздуха «Тепловей Т-100N» | 5906880 | 5906880 | 295344 | 295344 |
| 2 | Генератор теплового воздуха «Тепловей Т-100» | 5752320 | 5752320 | 287616 | 287616 |
| 3 | Установка для разгрузки сыпучих материалов | 11078697 | 11078697 | 553935 | 553935 |

Организатор торгов – управляющий в деле о банкротстве ЧСТУП «Цемекс» Борейко Д.И.

С имуществом (лотом) можно ознакомиться по месту его расположения в рабочие дни с 9.00 до 17.30.

*Задаток перечисляется до 28.03.2014 г. (включительно), по реквизитам для оплаты задатка: р/с № 3012800000579-текущий в белорусских рублях в ОАО «Белгазпромбанк» Гомельская областная дирекция, МФО 153001742, УНП 490000841.*

Условия продажи – без условий.

После окончания торгов с победителем подписывается протокол и в течение 20 календарных дней заключается договор. Победитель торгов обязан оплатить стоимость покупки в течение 30 календарных дней после подписания протокола. Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену покупки.

В случае признания торгов несостоявшимися, в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, возможна продажа лота этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%.

Затраты на организацию и проведение торгов, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам торгов документации, необходимой для их проведения, возмещаются победителем торгов.

Для участия в аукционе необходимо подать письменное заявление с приложением: для юридических лиц – заверенные копии свидетельства о гос. регистрации, устав; для индивидуального предпринимателя – заверенная копия свидетельства о гос. регистрации; для физ. лица – копия паспорта.

Срок подачи заявления с момента выхода настоящего объявления **до 16.00 28.03.2014 года** по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20 (холл второго этажа Экономического суда Гомельской области по предварительному согласованию по тел. 80296542561, 80447678805).

Дата, время, место проведения открытого аукциона **31.03.2014 года в 11.00**, г. Гомель, ул. Ирининская, д. 20 (холл второго этажа Экономического суда Гомельской области).

**По вопросам ознакомления с имуществом (лотом) и участия в аукционе, приобретения имущества должника обращаться по телефонам: (8029) 654-25-61; (8044) 767-88-05.**

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

# РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ»

## 27 марта 2014 года проводит 17-й от 12.09.13 г., 20-й от 03.10.13 г., 1-й от 13.02.14 г., 2-ой от 27.02.14 г. и 3-й от 13.03.14 г. повторные открытые аукционы по продаже имущества республиканской собственности на 4-ом открытом аукционе.

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 390/13 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 68711022Б дв. 064827 1987 г. 4 кат. 4 348 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 436/13 | Гусеничный тягач МТ-ЛБ ш. 110127181 дв. 494791 1985 г. 3 кат. 3 074 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 3 | Машина РХМ (без съемного спец. оборудования) 1977 г. 4 кат. 2543 км/80м/ч в составе: Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 17703001 дв. 440018 корп. 7702Ф101 1977 г. 4 кат. 2543 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1977 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1977 г. 4 кат. | г. Ст. Дороги, в/ч 42747 | 90 000 000 | 9 000 000 |
| 5 | Машина РХМ (без съемного спец. оборудования) 1977 г. 4 кат. 2081 км/618ч в составе: Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 17710003 дв. 472462 корп. 17710003 1977 г. 4 кат. 2081 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1977 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № б/н 1977 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1977 г. 4 кат. | г. Ст. Дороги, в/ч 42747 | 90 000 000 | 9 000 000 |
| 6 | Машина РХМ (без съемного спец. оборудования) 1978 г. 5 кат. 2586 км/134ч в составе: Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 17712002 дв. 481253 корп. 17712002 1978 г. 4 кат. 2586 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1978 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № 92п29 1978 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1978 г. 4 кат. | г. Ст. Дороги, в/ч 42747 | 90 000 000 | 9 000 000 |
| 8 | Машина РХМ (без съемного спец. оборудования) зав. № 27ЗС-2027 1983 г. 4 кат. 2307 км в составе: Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18305001 дв. 806633 корп. 8304Ф102 1983 г. 4 кат. 2307 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1983 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № 41п48 1983 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1983 г. 4 кат. | г. Ст. Дороги, в/ч 42747 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 9 | Машина РХМ (без съемного спец. оборудования) зав. № 27СС-1009 1985 г. 4 кат. 4870 км/177ч в составе: Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18412003 дв. 900803 корп. 8411Ф104 1985 г. 4 кат. 4870 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1985 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № 49п198 1985 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1985 г. 4 кат. | г. Ст. Дороги, в/ч 42747 | 90 000 000 | 9 000 000 |
| 10 | Машина РХМ (без съемного спец. оборудования) зав. № 27СЗ-3006 1986 г. 4 кат. 1668 км/109ч в составе: Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18606002 дв. 965867 корп. 18606002 1986 г. 4 кат. 1668 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1986 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № б/н 1986 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1986 г. 4 кат. | г. Ст. Дороги, в/ч 42747 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 11 | Машина РХМ (без съемного спец. оборудования) зав. № 27СС-1012 1985 г. 4 кат. 3068 км в составе: Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18501001 дв. 904320 корп. 8411Ф102 1985 г. 4 кат. 3068 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1985 г. 4 кат. , Фильтр ФПТ-200М № 67п171 1985 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1985 г. 4 кат. | г. Ст. Дороги, в/ч 42747 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 12 | Машина РХМ (без съемного спец. оборудования) зав. № 27СЗ-3027 1986 г. 4 кат. 2534 км/1094м/ч в составе: Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18606004 дв. 002175 корп. 18606004 1986 г. 4 кат. 2534 км, Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1986 г. 4 кат., Фильтр ФПТ-200М № 32п71 1986 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1986 г. 4 кат. | г. Ст. Дороги, в/ч 42747 | 90 000 000 | 9 000 000 |
| 13 | Машина РХМ (без съемного спец. оборудования) зав.№ 27ЗС-2016 1983 г. 4 кат. 1312 км в составе: Гусеничное шасси МТ-ЛБ ш. 18302003 дв. 800970 корп. 18302003 1983 г. 4 кат. 1312 км , Установка ФВУА-100-Н 12Ф № б/н 1983 г. 4 кат. , Фильтр ФПТ-200М № б/н 1983 г. 4 кат., Комплект ИДК-1 № б/н 1983 г. 4 кат. | г. Ст. Дороги, в/ч 42747 | 100 000 000 | 10 000 000 |
| 19 | Грузовой Урал-43202 ш. 027989 дв. 985721 1984 г. 4 кат. 49170 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 20 | Грузовой Урал-43202 ш. 104992 дв. 768490 1988 г. 4 кат. 34246 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 21 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. LO105035 дв. 309210 1988 г. 4 кат. 53005 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 22 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 100286 дв. 273637 1988 г. 3 кат. 78906 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 40 000 000 | 4 000 000 |
| 23 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. LO105040 дв. 283535 1988 г. 4 кат. 45632 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 24 | Грузовой Урал-43202-0011-01 ш. 133276 дв. 505058 1989 г. 4 кат. 47902 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 25 | Грузовой Урал-4320 ш. 065459 дв. 991829 1982 г. 4 кат. 33112 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 30 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 456186 дв. 787469 1982 г. 4 кат. 1285 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 31 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 456175 дв. 787187 1982 г. 4 кат. 1523 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 32 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 456502 дв. 789929 1982 г. 4 кат. 15144 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 48 000 000 | 4 800 000 |
| 33 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 456569 дв. 789757 1982 г. 4 кат. 2841 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 34 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 456235 дв. 788447 1982 г. 4 кат. 1653 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 35 | Грузовой КрАЗ-255Б1 ш. 481087 дв. 838369 1983 г. 4 кат. 1755 км | г. Старые Дороги, в/ч 48668 | 50 000 000 | 5 000 000 |
| 37 | Грузовой КамАЗ-43106 ш. 0006091 дв. 0716664 1990 г. 3 кат. 132620 км | г. Фаниполь, в/ч 30151 | 45 000 000 | 4 500 000 |
| 38 | Мастерская МТО-В № С35113 на ЗИЛ-131 ш. 622930 дв. 313892 1985 г. 3 кат. 1312 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 117 000 000 | 11 700 000 |
| 39 | Мастерская МТО-В № С35112 на ЗИЛ-131 ш. 623716 дв. 319307 1985 г. 3 кат. 1358 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 117 000 000 | 11 700 000 |
| 40 | Мастерская МТО-В № С35114 на ЗИЛ-131 ш. 622003 дв. 311101 1985 г. 3 кат. 1193 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 117 000 000 | 11 700 000 |
| 41 | Мастерская МТО-В № С35121 на ЗИЛ-131 ш. 628366 дв. 339892 1985 г. 3 кат. 1120 км | г. Гомель, в/ч 63604 | 117 000 000 | 11 700 000 |

Условия и порядок проведения аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 14.02.14 № 28.
Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в интернете: **www.bsk.by, mail@bsk.by.**

УНП 101099370

# Открытое акционерное общество «Белбакалея»

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2013 год

млн руб.

| АКТИВ | Код строки | На начало отчетного года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **1. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 91 338 | 106 232 |
| Нематериальные активы | 120 | 88 | 20 |
| Доходные вложения в материальные ценности | 130 | 3 | 350 |
| Вложения в долгосрочные активы | 140 | - | 7 |
| Долгосрочные финансовые вложения | 150 | 92 | 92 |
| Отложенные налоговые активы | 160 | 198 | - |
| Долгосрочная дебиторская задолженность | 170 | 231 | 210 |
| **ИТОГО по разделу I** | **190** | **91 950** | **106 911** |
| **2. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 86 891 | 114 723 |
| в том числе: материалы | 211 | 2 945 | 3 096 |
| готовая продукция и товары | 214 | 83 946 | 111 627 |
| Расходы будущих периодов | 230 | 1 126 | 6 973 |
| Налоги на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам | 240 | 142 | 1 063 |
